Новы Час | 30 мая 2014 | № 21 (390) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 5 (93)

Літаратурная Беларусь

Выпуск №5 (93)
(травень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas. info

Змест

Прайсці праз рыфы, або Жыццё працягваецца

Леанід ГАЛУБОВІЧ

«Большасць вершаў і цяпер проста дрэнныя, гэтаксама як заўсёды былі дрэннымі большасць вершаў. Дрэнныя вершы маюць сваю пераемнасць, — калі хочаце, яны ўдасканальваюцца, імкнучыся за добрымі, своеасабліва пераапрацоўваючы і перакручваючы іх. Цяпер пішуць дрэнна па-новаму — вось і ўся розніца!»

Восіп Мандэльштам



Калі я натрапіў на гэтую кніжку («Параходзік сучаснасці», зборнік твораў выпускнікоў Школы маладога літаратара Саюза беларускіх пісьменнікаў, «Кнігазбор», 2013), то адразу прыгадаў калектыўныя зборнікі свайго часу, якія тады з трапнай падказкі класікаў (ці не Барадуліна?) называлі «братнімі магіламі».

Доля праўды ў такім суровым вердыкце была, але трэба прызнаць, што там зрэдку пракідалася і здаровае зерне, якое па часе давала добрыя творчыя ўсходы. Дарэчы, сам я не прыхільнік калектыўнага ў творчасці, асабліва ў літаратурнай. Аднак іншым разам сітуацыя вымагае задзейнічання і такіх праектаў, каб хоць такім чынам канструктыўна зберагаць здольнасці і таленты і без таго нешматлікіх ратаяў нацыянальнага краснага пісьменства. А тут заявіла пра сябе цэлая гулліва пісьменніцкая Школа!..

Зазначу, што і мне самому давялося па запрашэнні «правесці майстар-клас» сярод яе «вучняў». І хоць тое мне падалося патрэбным, аднак хаатычным і выпадковым. А ў такім разе патрэбна адладжаная праца. Зрэшты, у маладых творцаў сёння значна шырэйшы абсяг практычнага і тэарэтычнага доведу, які яны могуць набываць і пераймаць за межамі Айчыны, ці спажываць з інтэрнэту, чаго бракавала майму пакаленню. Затое ў нас былі немалыя ўнутраныя дзяржаўныя магчымасці, няхай і абнесеная ідэалагізаванымі перашкодамі. Цяпер, калі я ўспамінаю сваё літаратурнае пачаткоўства (ад 1980-х гадоў), наноў патрапляю ў тую захмелена-мройную краіну няспраўджаных надзей.

Тады, за савецкі часам, літаратура, найперш паэзія, была своеасаблівай метафарычнай «шэнгенскай візай» — ты мог «лётаць» куды хочаш, і пры гэтым заставацца там, дзе змушаны… Незвычайны час, калі дух і цела павінны былі знаходзіць прыдатную форму гармоніі дзеля творчага і фізічнага выжывання. Я і сёння перакананы, што тады таленавітыя аўтары стваралі паэзію, а не пісалі вершы, як пераважна тое робяць цяпер. Можна прывесці досыць прыкладаў, пачынаючы ад Барадуліна, Вярцінскага, Бічэль, Някляева, Баравіковай, Янішчыц, Разанава, Мінкіна, Сыса… Але каб не займаць месца цытацыяй (пры цікавасці вы можаце зрабіць такія параўнанні самі, парыўшыся ў бібліятэках), проста выкажу напавер сваю суб'ектыўную думку: выбітныя вершы гэтых жа паэтаў, напісаныя ўжо ў суверэнны беларускі час, саступаць у мастацкім плане іх лепшым творам часу савецкага. Я таксама тамварыўся, таму дэкларую гэта «з глыбокім веданнем прадмета». Было ўражанне неабходнасці і сапраўднасці літаратурнай творчасці. Не пакідала адчуванне, што і сам ты ёсць вартаснай адзінкай мастацкага працэсу. Што дзякуючы літаратуры і, мажліва, табе асабіста свет не абрынаецца ў прорву чыста матэрыяльнай заклапочанасці і вульгарнага бытавання… Выдаваліся кніжкі і ганарары, праводзіся з'езды, пленумы, пасяджэнні секцый, семінары для маладых, збіраліся літаб'яднанні пры газетах, быў свой Дом літаратараў з усім, што літаратару трэба, нават багемнаму, Літфонд са сваімі падачкамі, паліклініка, бюро прапаганды з платнымі выступленнямі і сустрэчамі з чытачамі ў вузкім ды шырокім маштабах, Дом творчасці, камандзіроўкі, кватэры, — словам быў наладжаны літаратурны працэс ад пачатку да канца…

Нават для тых, хто нейкім чынам дысідэнстваваў, была магчымасць працісацца ў вузкія шчыліны і нішы таго камуністычнага «літаратурна-ідэалагічнага раю», і, здаецца, ніхто асабліва ў «пекла» і не патрапляў, калі не лічыць адкрыта заяўленай апазіцыйнасці (несавецкасці) Л. Геніюш, асобных праяў упартай беларускасці А. Разанава ды лавіравання сярод ідэалагічных нормаў У. Караткевіча, В. Быкава і А. Адамовіча… Вартае ўвагі, найперш для правінцыйных аўтараў, ліставанне з літкансультантамі рэдакцый, якія абавязаны былі адказваць на дасланыя літаратурныя тэксты. Уласна я маю ў сваім архіве як кароткія, так і даволі аб'ёмныя лісты з рэдакцый ад У. Някляева, Я. Янішчыц, В. Тараса, Л. Філімонавай, М. Федзюковіча, Ю. Свіркі, К. Цвіркі, М. Аўрамчыка, П. Макаля, А. Вярцінскага…

Аднак Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве пры Літінстытуце імя Горкага сталіся для мяне, бадай, найярчэйшай літаратурна-асветніцкай школай (мова, літаратура: сучасная і старажытная, савецкая і сусветная, гісторыя, філасофія, эстэтыка-мастацтвазнаўства-культуралогія, семінары паэзіі, прозы і драматургіі). Вось каб у сучаснай Беларусі была магчымасць стварыць падобны творча-адукацыйны цэнтр навучання — было б проста цудоўна. Але для таго трэба воля грамадства, разуменне ўлады, фонды-гранты і г.д…

Калі да ўсяго вышэй мной згаданага дадаць прагу пастаяннай самаадукацыі, бязмернае чытанне і самакрытычнае стаўленне як да сваёй асобы, так і да сваёй літаратурнай працы, і ўсё гэта — заўважце! — у непарыўным звязку з хмельнай багемнасцю, у выніку прывяло да з'яўлення такой, як мне здаецца, даволі самадастатковай вольна-акадэмічнай творчай натуры, якой я і ёсць сёння.

Гэта я прывёў прыклад уласнай літаратурнай арганізацыі, каб цяперашнія маладыя творцы параўналі яе са сваёй…

Я даўно сачу за іх творчасцю… Ёсць таленавітыя аўтары. Аднак пераважна — гэта своеасаблівае літаратурнае караоке… На жаль, неўпрыкмет страчваецца школа (фундаментальная літаратурная пераемнасць). Зашмат знешняга самавыстаўлення і непрыкрытага перайманння. Вобмаль душэўнай суперажывальнай працы і жыццёвага вопыту не спрыяе фармаванню яркіх выбітных асобаў (ні табе караткевічаў, ні быкавых, ні стральцовых, ні купрэевых, ні янішчыц, ні сысоў ці хоць бы адамовічаў). Пры гэтым згадваюцца радкі цудоўнага рускага лірыка У. Сакалова:

Нет школ никаких. Только совесть,
Да кем-то завещанный дар,
Да жизнь, как любимая повесть,
В которой и холод и жар.

Пачынаючы гаворку канкрэтна пра заяўлены зборнік, трэба, мабыць, патлумачыць яго правакацыйную назву. Напэўна, знаёмыя з літаратурным працэсам людзі памятаюць маніфест футурыстаў больш як стагодовай даўнасці, які мяў назву «Аплявуха грамадскаму густу» і пачынаўся так: «Чытаючым наша Новае Першае Нечаканае. Толькі мы — твар нашага часу. Рог часу трубіць нам у славесным мастацтве. У мінулым цесна. Акадэмія і Пушкін незразумелыя іярогліфы. Кінуць Пушкіна, Дастаеўскага, Талстога і інш. і інш. з Парахода Сучаснасці. Хто не забудзе свайго першага кахання, не ўведае апошняга».

І г.д, і да т.п. Мабыць, адсюль і выцякае, няхай і прыхаваны за іроніяй, пасыл да назвы гэтай кніжкі. Мауляў, аўтары зборніка і ёсць патэнцыйнымі пасажырамі таго «парахода сучаснасці», з якога скінуты ўсе гэтыя купалы-коласы-мележы-танкі-куляшовы… І, трэба сказаць, у тэкстах некаторых аўтараў гэта адчуваецца — нястача нацыянальнай літаратурнай культуры.


Перад тым, як прыступіць да разгляду тэкстаў, хацелася б згадаць, што заняткі ў штудыях Школы праводзілі адметныя творцы. Адзначу, што і сярод «школьнікаў» фігуруюць аўтары, якія ўжо маюць уласныя кніжкі: Н. Манцэвіч, А. Казлова (Анка Упала), К. Дубоўскі, В. Чайкоўская… Агулам 18 паэтаў і празаікаў. Сярод іх ёсць і не такія ўжо маладыя, як па гадах, так і па творчай выяўленасці ў перыядычным друку.

Працяг на стр. 22 (14)

«Межавыя знакі» Алеся Каско

У Берасці прайшла прэзентацыя зборніка Алеся Каско «Межавыя знакі» (серыя «Кнігарня пісьменніка» Саюза беларускіх пісьменнікаў).

Аўтар многіх вершаваных выданняў апублікаваў кнігу, якая змяшчае выбраныя творы з ранейшага перыяду, новыя паэтычныя тэксты і таксама невялікія празаічныя аповеды, якія сам паэт ахарактарызоўвае як навелы.



Імпрэза адбылася ў Берасцейскай абласной бібліятэцы імя Максіма Горкага, супрацоўнікі якой гасцінна падрыхтавалі тэматычную кніжную выставу земляка.

На прэзентацыі сабраліся прадстаўнікі Берасцейскага аддзялення СБП на чале са старшынём Іванам Мельнічуком, сябры паэта, госці з Мінска і іншых рэгіёнаў. Вёў вечарыну Генадзь Праневіч.

Прэс-служба СБП

«Халоднае крыло Радзімы»

«Халоднае крыло Радзімы» — так будзе называцца новая кніга зняволенага літаратара Алеся Бяляцкага, якая рыхтуецца да выдання. У кнігу ўвойдуць занатоўкі, эсэ, інтэрв'ю, успаміны.

Назву сам аўтар тлумачыць у лісце так: «Яна шматзначная. Чаму крыло «халоднае» – зразумела. І Радзіма тут выглядае птушкай – зязюляй? чайкай? І зязюляй, бо не глядзіць сваіх дзяцей, і чайкай, бо ў іх, калі яны ляцяць, крылы срэбныя з-падысподу... і адліваюць на сонцы холадам. І такое крыло пакуль не грэе сваіх птушанятаў, пад якімі можна разумець усіх, хто ходзіць і жыве пад яе крылом».

«Халоднае крыло Радзімы» – чацвёртая кніга Алеся Бяляцкага, своесаблівы працяг «Асвечаных беларушчынай», выдання, якое выйшла таксама падчас зняволення аўтара.

Паліна Сцепаненка

In memoriam

Уладзімір Дамашэвіч

30 красавіка на 87-м годзе жыцця не стала Уладзіміра Максімавіча Дамашэвіча — празаіка, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.



Пайшоў з жыцця Уладзімір Максімавіч Дамашэвіч. Вясною, калі самае жыццё, кветкі і лісце. Лёгкая смерць, у сне. Людзі кажуць – «пацалунак Бога». У часопісе «Дзеяслоў» неўзабаве павінна выйсці яго новае апавяданне...

Беларуская літаратура страціла яшчэ аднаго свайго адданага сына (ён, дарэчы, любіў «высокія» словы, не саромеўся іх — наадварот, лічыў, што мы задужа зацiснутыя: «Напісаў жа Бачыла, казаў Уладзімір Максімавіч: «Радзіма, мая дарагая!» — амаль гімн»).

Упэўнены, У. М. Дамашэвіч не забудзецца. Пра яго як пісьменніка, палітыка, патрыёта, чалавека — яшчэ напішуць. Мне хацелася б хоць крышку здагаць Дамашэвіча як рэдактара. Ён практычна ўсё жыццё прысвяціў гэтаму няўдзячнаму занятку.

Прыгадваецца выпадак у «Ісілачы», калі Васіль Быкаў адказваў на пытанні маладых літаратараў. Тут прагучаў голас Дамашэвіча з дальняга кутка:

— Васіль Уладзіміравіч, калі Вам лягчэй пісалася: цяпер, калі Вы ўжо ў зеніце славы, ці ў пачатку творчай дарогі?

Адказ атрымаўся цікавы. Але не менш цікавымі былі і паводзіны Быкава. Ён хутка падняўся і зашпіліў пінжак.

— Уладзімір Максімавіч — рэдактар маёй першай кнігі, — патлумачыў ён. — Без яго я наўрад ці зрабіўся б пісьменнікам.

Андрэй Федарэнка

Анатоль Кудравец

8 мая спачыў у вечнасці празаік, сябра Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў Анатоль Паўлавіч Кудравец.



Анатоль Кудравец нарадзіўся ў 1936 годзе ў вёсцы Акоаліца Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў Слуцкую педагагічную вучэльню (1955). Вучыўся на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў рэдактарам на Беларускім радыё, літсупрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва», рэдактарам выдавецтва «Беларусь», доўгі час узначальваў часопіс «Нёман».

Анатоль Паўлавіч быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, з'яўляўся лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа (за раман «Сачыненне на вольную тэму» (1986)) і прэміі часопіса «Дзеяслоў» «Залаты апостраф» (2012).

Развітанне з Анатолем Кудраўцом адбылося 11 мая. Пахавалі творцу на могілках у Калодзішчах.



Давід Сімановіч

9 мая пасля цяжкай хваробы памёр Давід Рыгоравіч Сімановіч — беларускі паэт, празаік, перакладчык.

Давід Сімановіч нарадзіўся ў 1932 годзе ў Нароўлі на Гомельшчыне. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Працаваў літсупрацоўнікам рэдакцыі абласной газеты «Віцебскі рабочы». З 1961-га — рэдактар, старэйшы рэдактар, загадчык аддзела камітэта па тэлебачанні і радыёвяшчанні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта. З 1980 года знаходзіўся на творчай рабоце. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1960 года. Жыў у Віцебску.

Пісаў на расійскай мове. Асобныя яго творы пакладзены на музыку І. Лучанком, Б. Насоўскім, А. Гоманам.

Незабыўны паэт Віталь Гарановіч

Спаўнілася два гады, як не стала паэта Віталя Гарановіча. Ён быў сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў. Пра яго мала пісалі, толькі ў раённай газеце...



Здаецца, ён кажа мне:
Дажджы палеткі прамыюць
І шыбы ў родным акне.
Глядзі ў прастору, Марыя,
Звіні на думнай струне.
Звіні, паэтка, у неба —
Пачуе, мабыць, хто-небудзь.
На белым свеце няма мяне.
Там ці сумуюць, ці не?
Калі б я жыў — закружыў
Вырай у небе веснім
Песняй...
Пра Саракі.

Сумуем, помнім. Памяць чуе голас брата. І таксама чуе голас Віталя Гарановіча. Я з ім гаварыла пра тугу, пра свой стан душы, пра што не магла пагаварыць з іншымі. Ён слухаў і разумеў. У віры рознага смутку, які выпаў на маю душу, не паспела забраць з рук Віталя кнігу «Нараджэнне вады» і сказаць яму, ад сябе, свайго зроку, успрымання, захаплення, пра ягоны метафарычны талент. Чалавеку трэба гаварыць хвалу, прызнанне жывому. І стварыць удзячнасць Богу за нас на белым свеце. Бо белы свет — нам падарунак, і мы нешта значым для Творцы і з'яўляемся падарункам сваёй чалавечай грамадзе. Калі жывём зацікаўлена, удзячна, шчодра і светлазычліва.

Віталь Гарановіч меў захапляльную душу. Быў чалавекам працы, шанавання, узіральнасці, слова. Быў гаспадар свайго дому. Ён — працаўнік на ніве беларускай асветы, асветы родным словам. Паэт, які рос, дакранаючыся да ўсіх граняў працоўнага чалавечага жыцця. І душой рос, дакранаючыся да неба зямнога. Ён назіральны. Яго іскрынка, дадзеная звыш, заўсёды разгаралася ад старання душы, праз думку выяўлення. І праз разумны давер таксама.

З рукапісам «Саракі» Віталь звярнуўся да мяне як да стылёвага рэдактара. І што цікава? Прыняў усе мае праўкі, скарачэнні (у мяне верш, звычайна, кароткі). Не згадзіўся толькі з адной заўвагай, дзе, відаць, хацеў даць вобраз раздолля. У гэтым яго даверы хавалася відушчая згода. Бо заўсёды майстру трэба нехта другі. Каб пачытаў і заўважыў.

Працаўнік Гарановіч, знаходнік, закаханы ў Божыя цуды белага свету, ствараў такія простыя і нечаканыя вобразы. Ён быў каштоўным настаўнікам для вучняў. І для паэтычнага чытача скарбам для захаплення.

Сёння я чытаю «Нараджэнне вады». У гэтай апошняй кнізе паэт застаецца нашай любоўю ў пейзажнай лірыцы. Надзвычайны метафарыст, трапны параўнальнік, думнік, вынаходнік радкоў. Ягоныя субяседнікі — неба, зямля, вецер, трава-раса, туман, сонца, поўня, пчала, птушка, конь, радзіма, гарады і таварыш палкоўнік Тамара Пятроўна з «Незабыўнага»...

Ёсць вершы — суцэльныя, цудоўныя метафары, у якіх адлюстроўваецца здзіўленне светам прыроды. Ачалавечаныя вобразы лагодзяць чытача, які адчувае ягонае «сонца, як гаючы крэмень», хоць і «ступіць восень у прыроду з маладзікам на галаве». Паэт ведае, што конь «на расу ўпадзе світаннем, каб прызабыцца моцным сном», што пчала «да крыльцаў немачных... працуе без аглядкі», дуб, «самотны прыгажун, за лета восень прымае... Над ім запознена пярун маланкай неба расшывае». А «ручай, як яйка птушаня, праклюнуў шкарлупу-ільдзінку». І што «туманы, як слімакі, да ўзгорка шчыльна прыліпаюць». І пры ўсім лірызме паэт Гарановіч хвалебна, ганарова пяе славу Радзіме («Дзве Радзімы»). Размашысты ў радках, шчодры ў фарбах хвалы (услаўленне беларускіх гарадоў, роднага Маладзечна і Глыбокага). Пра Нясвіж кажа:

Ты на зямлі спусціўшымся анёлам
Здаешся вечна вернікам, Нясвіж.

Замілавана гіпербалізуе, узвышае ўсё, што ў воку. Яно становіцца аб'ёмным, буйным ад захаплення душы.

Напоўнены думкай увесь лірычна-філасофскі верш «Па формуле вечнасці», дзе «крынічка, нібы сэрца, пад дажджом халодным б'ецца».

Віталь Гарановіч у вершах рамантычна-ўзнёслы, аб'ёмны, маляўнічы і жыццярадасны.

Душа ягоная, здаецца мне, у высі,
Дзе прамянёў святла не затушыць.
Падняў сыноў. І вершы засталіся
Для новай захапляльніцы-душы.

Марыя Баравік

ЧЭРВЕНЬСКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:


Бабкоў Ігар Міхайлавіч (нар. 02.06.1964)
Галаскок Аляксей Пятровіч (нар. 06.06.1949)
Антонаў Андрэй (Андранік Антанян) (нар. 08.06.1974)
Варонік Святлана Аркадзьеўна (нар. 12.06.1969)
Яскевіч Аляксандр Сямёнавіч (нар. 12.06.1934)
Чапега Уладзімір Пятровіч (нар. 18.06.1939)
Марціновіч Павел Аркадзьевіч (нар. 27.06.1954)
Карамазаў Віктар Філімонавіч (нар. 27.06.1934)

Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

Фільм пра Конана і яго партрэт

Да 80-годдзя з дня нараджэння

На развітанні каля яго дамавіны 6 чэрвеня 2011 года я сказаў, што для мяне Уладзімір Міхайлавіч быццам і не адыйшоў у іншы свет.



Уладзімір Конан. Графічны партрэт Марыны Мароз

Ён для мяне заўсёды жывы. Не толькі таму, што ў памяці духоўнай і зрокавай яго постаць, суседства па Серабранцы, нашыя сустрэчы, размовы, супраца над фільмам аб ім, але і ў найпростым значэнні, бо дастаткова толькі ўставіць дыск са стужкай «Згадкі страчанага раю» ў прайгравальнік – і на экране бачыш жывога героя.

Пазнаёміліся мы з Уладзімірам Конанам дваццаць гадоў таму, у красавіку 1994-га. Па друку ведаў слова літаратара, філосафа, культуролага. Яно грэла сунастроенасцю беларускую душу. Прыйшла думка зняць сюжэт для кіначасопіса «Беларусь», які тады мы яшчэ выпускалі на нашай студыі «Летапіс». Не выключаю, што падштурхнула і юбілейная дата: тады яму споўнілася 60 гадоў. Уводным дыктарскім сказам для сюжэта ў кіначасопісе стаўся такі: «У віры мітуслівага жыцця бракуе часу згадаць беларускі шлях. Між тым ён і ў нягучных канкрэтных справах, і ў ціхіх развагах філосафа. Руплівец беларушчыны, супрацоўнік Скарынаўскага цэнтра, доктар філасофскіх навук Уладзімір Конан». Цяпер думаю, што словы «ў ціхіх развагах» узніклі мо і падсвядома, але невыпадкова. Нягучнасць — адна з рысаў Уладзіміра Міхайлавіча. Якая аніяк не выключае магутнай сілы яго слова і моцы ўнутранай перакананасці. Проста чалавек такі, з якім адразу было лёгка гаварыць, быццам былі знаёмыя здавён...

Пакрысе выспельвалася думка зняць дакументальны фільм пра Уладзіміра Конана. Мастацкі кіраўнік і галоўны рэдактар «Летапісу» паставіліся да ідэі скептычна: пра філосафа зняць фільм вельмі складана, практычна немагчыма. Але я быў настойлівы, і ў 1998 годзе нематэрыяльнае (думка) увасобілася ў рэальнасць. Фінансаванне прыйшлося на пачатак года, а зіма тады была студзёнай. Потым мы былі ўдзячныя лёсу за такі збег абставінаў, бо марозы і завеі прыўнеслі ў карціну сваю адметнасць, кантраснасць, паспрыялі стварэнню вобраза героя. Мы — гэта здымачная група: аўтар сцэнарыя Уладзімір Мароз, рэжысёр Мікалай Князеў, аператар Віктар Бандаровіч. Мае таварышы, з якімі здымалі не першы фільм, выклікалі давер у героя, атрымаўся кантакт, без якога шанцаў стварыць сапраўдную дакументальную стужку практычна не бывае. Бо фільм — гэта найперш лёс чалавека, гранічная адкрытасць і шчырасць героя. Аб сваім асабістым жыцці, драматычных выгінах лёсу Уладзімір Міхайлавіч нідзе не пісаў, а тут яму давялося, няхай і няшмат, але гаварыць аб гэтым. Быццам спавядацца.

З іншага боку, як чалавек высокай культуры і творчы, ён разумеў, што кіно таксама ёсць творчасцю. Таму адгукаўся на ўсе просьбы рэжысёра. Да прыкладу: Наваградчына, радзіма Конана, мяце завіруха. Мы спыняем машыну пасярод дарогі і прапануем герою прайсціся па полі. І вось пад сіберным ветрам праз завею ідзе па полі адзінокая постаць. Спецыяльна такі кадр не прыдумаеш. Адно хочацца дадаць — у паліто, падбітым ветрыкам, бо сапраўднай зімовай апраткі Уладзімір Міхайлавіч не меў...

Калегі-скептыкі, калі ўбачылі гатовы фільм, свае папярэднія словы аб складанасці стварыць вобраз філосафа ўзялі назад. Без падманнай сціпласці сустваральніка скажу, што гэта атрымаўся маленькі (працягласць стужкі 20 хвілін) шэдэўр Мікалая Князева. Як цяпер бачыцца, непадуладны часу. Канчатковая назва — «Згадкі страчанага раю» — прыйшла ў канцы працы. Сутнасная і мне блізкая, бо мой дзедаўскі хутар у Мікалаеўшчыне, абгароджаны з усіх бакоў плотам, і ёсць тым кавалачкам раю, аб якім згадвае ў сваіх развагах Конан. Самому герою фільм таксама спадабаўся. Яго паказвалі раз ці два па тэлебачанні, потым ужо толькі на саракавіны Конана ў Коласаўскім музеі. А зусім нядаўна ў канцы красавіка я паказаў яго ў Маскве на вечарыне памяці Конана, арганізаванай Лолай Званаровай і прысвечанай 80-годдзю філосафа...

На той вечарыне стаяў і графічны партрэт Конана, які намалявала мая дачка мастачка Марына Мароз. Яна некалькі разоў прыязджала да Уладзіміра Міхайлавіча. Вясною 2011 года мы з Марынай трапілі да Конана ўжо з гатовым партрэтам (выкананы ён у тэхніцы літаграфіі). Герою твора праца спадабалася (адзначыў, што павесіць на сцяну).

У момант развітання думалася, як заўсёды: і тэлефанаваць мог бы часцей, і заязджаць... Але жыццё не пераробіш. Затое са мною фільм пра Уладзіміра Конана — і словы: літаратурны тэкст пісьменніка, філосафа і чалавека.

Уладзімір Мароз

«Сімфонія культуры»

Сінхронны тэкст з фільма «Згадкі страчанага раю»

Уладзімір КОНАН

Маё дзяцінства звязанае з бамбёжкай Любчы і Навагрудка.

Я ў гэты час пасвіў кароў на высокай гары, адкуль відзён Наваградскі замак. І калі нямецкія самалёты бамбілі Любчу, то мне здавалася, што бомбы падаюць на мяне. Цяперашні мой страх больш абстрактны. Ён звязаны з маім страхам няўстойлівасці быцця. Мне здаецца, што Беларусь калі-небудзь можа выпасці ў Бярмудскі трохвугольнік. Вось гэтая няўстойлівасць быцця і ёсць мой экзістэнцыяльны страх...

Гэты калідор славуты ў тым сэнсе, што тут пачыналіся рэпрэсіі нашай беларускай Акадэміі навук. Магчыма, па ім прайшлі ў незваротны шлях беларускі выдатны пісьменнік Максім Гарэцкі, Вацлаў Ластоўскі і яго калегі па былым Інбелкульце Акадэміі навук. Так што мы лічым сябе пераемнікамі Акадэміі 20-х гадоў...

Для таго, каб пабыць у сваім уласным доме, пабыць гаспадаром, а Гасподзь Бог паставіў чалавека быць гаспадаром прыроды і сваёй працы, усё-такі трэба пэўны час мець свой дом, сваё са ўсіх бакоў абгароджанае месца. Свой рай, уласна кажучы. Ён патрэбны для чалавека, для сям'і, для народа і для дзяржавы. Бо ў калідоры цяжка быць і некамфортна. Вось мы сёння з вамі тут у калідоры. Ён славуты, як я ўжо сказаў. Па ім хадзілі нашыя слаўныя папярэднікі. Тут хадзілі і Янка Купала, і Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Вацлаў Ластоўскі. Тым не менш, ёсць нязручнасць. Значыць, не хапае гэтага камфорта для сустрэчы блізкіх сяброў. Пагэтаму краіна не павінна быць калідорам, інакш яе гаспадару прыйдзецца хавацца пад лаўку, каб на яго не наступілі нагою...

Драму перажываюць бацькі. А дзіця жыве, адчуваючы рай. У яго няма пачуцця зла, а ёсць толькі пачуццё абсалютнага дабра. І калі дзіця крыўдзяць, даюць яму пазнаць супярэчнасці, ён пачынае плакаць. Усякі плач дзіцяці ёсць плач па згубленым раі. Пагэтаму для мяне вось гэты хутар ёсць у нейкім сэнсе архетып раю...

Само паняцце рая, як вы ведаеце, з персідскага слова азначае: «кругом, з усіх бакоў абгароджанае месца». У прынцыпе, манастыр — у пэўным сэнсе сімвал раю на зямлі. Як фрагмент, як і архетып такога жыцця...

У гэтай царкве хрысцілі мяне і маіх бацькоў. Так што мне ўсё гэта блізка. Я помню, скажам, калі я ўпаў з печы. Мне было паўгода. А паколькі гэта эфект моцны для дзіцяці і страх страшны, ён запамінаецца. Такое вось першае запамінанне: падзенне з печы. Можа быць, цяпер у мяне развілася адна такая асаблівасць псіхалагічная: у мяне такое ўражанне, што ўсё можа ўпасці, і свет праваліцца. І калі стаіць посуд, шклянка на краі стала — так і хочацца адсунуць іх на сярэдзіну...

Памятаецца такі выпадак... Мы ў час вайны вучыліся, а там разбілі самагонны апарат. Гналі самагоначку людзі. Дзе школа, насупраць яе, ставілі самагонны апарат. Там рэчанька працякала. Прыйшоў адзін немец, два паліцыянты, разбілі гэта ўсё. Але пасля мужыкі гаварылі: а ўсё-ткі пяршак мы захавалі! Яны былі гэтым задаволены...

Наколькі ўплываюць нейкія асабістыя абставіны жыцця на філасофію? Гэта ў залежнасці ад філосафа. Скажам, на Гегеля не ўплывала, і на Канта. Яны тварылі сваю філасофію ў традыцыі. На Шапенгаўэра моцна ўплывала, Шапенгаўэр, так сказаць, — гэта філосаф жыцця. Пагэтаму счапленне з фактарамі жыцця ў яго больш моцнае. Што датычыцца мяне, то думаю, што я ўсё-такі больш у гегелеўскай традыцыі. І, натуральна, я прытрымліваюся беларускай традыцыі ў культуры...

Для таго, каб сустрэцца з Богам, мы павінны сустрэцца з чалавекам. Таму што калі сабраліся ўдвох ці ўтрох у імя Бога, значыць, з імі Бог...

З Лолай я пазнаёміўся якраз праз навуку. Яна яшчэ была студэнткай вячэрняга факультэта Маскоўскага ўніверсітэта. Удзельнічала ў нашай навуковай канферэнцыі, прысвечанай Сімяону Полацкаму. Я быў тады адзінокі, можа быць, не толькі адчуваў богапакінутасць, але і пакінутасць людзьмі. Гэтага адзіноцтва цяпер няма ў мяне. У чалавека рэлігійнага адзіноцтва не бывае. Але тады яно было. Вось, я б сказаў, што яна мяне знайшла, альбо, нават, калі гаварыць больш грубавата, падабрала. І потым у нас такая любоў і, шырэй, сяброўства засталіся на ўвесь час. І мы звычайна праводзілі свае летнія канікулы або водпускі ў Доме творчасці пісьменнікаў «Перадзелкіна». Я, на жаль, заўсёды адчуваю некаторыя цяжкасці, калі нават іду да споведзі. Таму што на споведзі трэба якраз гэтыя негатывы свайго жыцця расказаць. Бо яны не даюцца чалавеку лёгка. Для споведзі трэба адпаведны настрой. Я думаю, што ўсе гэтыя негатывы былі вынікам, наступствамі богапакінутасці...

Ёсць прычына, калі чалавек усё-ткі ідзе да Бога. Гэта пакуты, якія ён перацерпае. Алегу Бембелю прыйшлося іх на сабе адчуць, калі пачаліся ганенні бальшавікія на яго ў сувязі з тым, што апублікаваў у Лондане ў 1985 годзе кніжку ў абарону беларускай мовы. І гэтыя ганенні, безумоўна, распаўсюдзіліся не толькі на яго, першым аб'екце ўдару, але і на мяне як яго навуковага кіраўніка, і нават на Бабосава як дырэктара інстытута філасофіі і права Акадэміі навук Беларусі...

Мы жывём у хрысціянскай цывілізацыі, аднак, хрысціянізаваць дзяржавы, і нават у значнай ступені грамадства, не ўдалося. Хрысціянізацыя аднасіцца больш да асобнага чалавека. Пагэтаму я мяркую, што можна тыпалагічна падлічыць тры царствы, або тры імперыі. Першая — тэрытарыяльная імперыя, самая працяглая ў часе. Рэшткі яе засталіся і сёння. Тэрытарыяльная імперыя імкнецца разбурыць так званыя нацыянальныя перагародкі. Разбураючы іх, разбурае і культуру нацыянальную. Пры тым метраполія разбурае не толькі культуру калоніяў, але і сваю ўласную, паколькі адбываецца распыленне насельніцтва метраполіі па ўсёй неабдымнай імперыі. Цяпер мы ўваходзім у другую імперыю, яна даўно ўмацавалася — фінансавая. Цяпер будзе правіць бал той, хто стварыць мацнейшую фінансавую сістэму, прамысловы комплекс. Гэта самы кароткі час, царства фінансаў, фінансавай імперыі. Яно, па-мойму, пачынае ўжо ўступаць у стадыю крызісу. Гэты крызіс можа працягнуцца яшчэ поўстагоддзя. Потым, з майго пункту погляду, наступіць імперыя духу, царства духу, калі правіць будзе духоўная эліта, свецкая і духоўная, і царкоўная. І тады якраз адпадуць некаторыя аргументы на карысць разбурэння нацыянальных культур. Наадварот, акцэнт будзе пастаўлены на гармонію нацыянальных культур ва ўсім свеце. І кожная культура кожнага народа, і нават таго народа, які ў значнай ступені адстаў ад ходу цывілізацыі і дзесьці апынуўся ў мінулым, будзе ўяўляць вялікую цікавасць для гэтай сімфоніі сусветных культур...

Як гаворыцца ў кнізе Іова: чалавек нараджаецца на пакуты, каб, як іскры, падымацца ўверх...

Падрыхтоўка тэкста і публікацыя Уладзіміра Мароза

Нітка лёсу

Беларускаму празаіку, перакладчыку, кінасцэнарысту, сябру Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесю АСТАШОНКУ 1 чэрвеня споўнілася б 60 гадоў. А ўжо дзесяць гадоў яго няма на гэтым турботным свеце…

Творца нарадзіўся ў Мінску. Скончыў перакладчыцкі факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Працаваў перакладчыкам у Алжыры (на будоўлі мэталургічнага камбіната ў пасёлку Эль-Хаджар), інспектарам дэканата па працы з замежнымі навучэнцамі, выкладчыкам французскай мовы Беларускага політэхнічнага інстытута, рэдактарам рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Упраўлення тэатраў і музычных установаў Міністэрства культуры БССР, рэдактарам у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя П. Броўкі, старшым рэдактарам часопіса «Крыніца».


Перакладаў пераважна з французскай і ангельскай моваў: творы Ж. Сіменона, П'ера Буля, Веркора і інш.

Ён — аўтар кніг прозы «Фарбы душы» (1989) і «Жоўты колер белага снегу» (2005, пасмяротна), п'есаў «Іскры ўначы» (пастаўленая ў 1982, апублікаваная ў 1986), «Камедыянт, ці Узнёсласць сумнай надзеі» (пастаўленая ў 1984, апублікаваная ў 1985). Аўтар сцэнароў фільмаў «Камедыянт» (1987) і «Сон» (1989).

Пра яго «П'яную кнігу, або Жоўты колер белага снегу» ў другім томе Беларускай энцыклапедыі напісана, што яна выдадзеная ў 1996 годзе. Але насамрэч яе набор, тады яшчэ ручны, быў у выдавецтве «рассыпаны». У «Мастацкай літаратуры» змянілася начальства, і Алесь Асташонак трапіў у доўгі спіс непажаданых пісьменнікаў. Ягоныя сябры пачалі жартаваць, што ён не самотны, ён карэктуру кнігі мае. Вычытаная аўтарам карэктура (згубіўшы пры гэтым першую частку назвы) была выдадзеная толькі ў 2006-м — пасля таго, як з Кіева, дзе пісьменнік апошнія гады жыў, не маючы магчымасці вярнуцца ў Беларусь (праз «бізнэс-эксперыменты» сваёй жонкі), прыйшла жалобная вестка аб ягонай смерці 7 верасня 2004 года…

У юбілейны вянок памяці «Літаратурная Беларусь» сабрала сяброўскія згадкі пра Алеся Асташонка. Сярод іх — віншавальная паштоўка да 50-годдзя пісьменніка (якая была напісана для тыднёвіка «ЛіМ», аднак на свет так і не з'явілася, прадмова Л. Галубовіча да кнігі «Жоўты колер белага снегу» і пасляслоўе да яе Л. Дранько-Майсюка (якія выдавецтва «Мастацкая літаратура» так і не асмелілася надрукаваць).

«Думаецца, гэтыя тэксты скажуць цяперашняму чытачу не менш, чым сказалі б тыя, якія мы з Леанідам Дранько-Майсюком напісалі б сёння», — слушна адзначыў, рыхтуючы гэтую публікацыю, Леанід Галубовіч.



Алесь Асташонак з Жужай у Кіеве

Віншавальная паштоўка

Пісьменніку Алесю Асташонку з нагоды яго пяцідзесяцігоддзя

***«Зараз дазваляюць пісаць толькі аб рэчах прыемных для начальства, але кароткі век гэтых твораў. Можна пісаць і аб непрыемных з'явах у жыцці, але тады — вельмі кароткі век аўтара. Выбар, можна сказаць, багаты.»* (Максім ТАНК, «Лісткі календара», 1939 г.)**

Дарагі мой сябра, калега па пяры, кум, у рэшце рэшт!

Віншую цябе з юбілеем, што прыпадае на пачатак чэрвеня! Нарадзіцца чалавеку на самым зачыне лета, як паўстаць перад гарачым пеклам, яшчэ не ўчыніўшы граху, хоць і гэты варыянт, напэўна ж, лепшы за халоднае лета пяцьдзясят трэцяга…

Зрэшты, галоўнае, што ты ўсё яшчэ жывы і здаровы, у адрозненне ад прататыпа галоўнага героя твайго аповеду «Пасведчанне», былога мінскага завакзальнага суседа, светла-таленавітага паэта Алеся Пісьмянкова… Ён ужо на Кальварыі. Туды адыходзіць цяпер пераважная большасць нашых людзей — бліжэй да аўтара першай нашай вершаванай кніжачкі Янкі Лучыны… І каталікі, і праваслаўныя, і уніяты, і нават няверуючыя — у адну беларускую вязанку. Каб паразумецца…

Беларушчына ж і літаратура сталі справай прыватнай: хочаш гавары, хочаш пішы — не чуюць і не чытаюць. Бо ўсе, хто гаворыць і піша, пішуць і гавораць для сябе. Народ труднуе (як піша М. Вайцяшонак) і глядзіць серыялы. Ёсць у яго «Беларусь сегодня» і «Лад», а заўтра — Бог-бацька…

«Любіць ноч — права пацукоў», «Ордэн Белай Мышы», «Літоўскі воўк» — во якая гідка-драпежная заалогія нашай сучаснай літаратуры. А між іншым, чацвёрты поруч з імі свой «Дом» збудаваў. І ці не з гэтай прычыны малодшаму з пяці заюдзела наладзіць тут сваю «Рэвізію»…

Распавядаю табе гэта, таму што ты не ведаеш нас цяперашніх. Ды і я, напэўна, застыў бы саляным слупам, абярнуўшыся неспадзеўкі на твой закардонны голас. Так далёка ты, што нават не верыцца. Прабач. Напершапачатку можна было патэлефанаваць, дык не было чым дзяліцца, а сёння, калі столькі адчаю, — няма як выказаць…

Ды і ты адтуль па-беларуску адно толькі лісты сюды пішаш… мроіш-думаеш ды сны сніш… А ўсё астатняе па іхняму патрапіць стараешся, каб дзень свой пражыць. Але ўжо не пішаш ты дзеля сябе самога. Бо выгараў ўсе фарбы душы тваёй. А крывёй яшчэ рана… Дзякаваць Богу.

П'яная кніга твая па ўсіх нас рассыпаная. І калі яе аднойчы збяруць-такі — кожны адчуе тваю творчую страту… Ды будзе позна.

А наконт балючай для цябе тэмы: хто вялікі, а хто малы — то яно і так відно. Тым больш, што пасля дваццаці пяці людзі ўжо не растуць. Нам жа за пяцьдзясят. А пасля пяцідзесяці не растуць нават пісьменнікі…

Таму — задаволімся тым, што маем. А чаго не маем, тое не наша. Перад намі і пасля нас — словы, словы і словы…

Віншую цябе, сябра, з нажытым юбілеем! Няхай яго коўзкі ялей адсуне ад цябе гарызонты нежыцці. А нашы калегі і мажлівыя чытачы, спадзяюся, далучацца да маіх зычанняў табе ўдачы і творчага плёну.

ЛеГАЛ

Чалавек без нумара

(прадмова да кнігі)

Алесь Асташонак памёр праз дзесяць гадоў пасля напісання гэтай кніжкі — 7 верасня 2004 года. У старажытным, не такім далёкім, але не родным Кіеве. Гэтак сталася. Такім быў яго вырак. Так распарадзіўся Гасподзь. Дачка, якую ён любіў, адплаціла любоўю, забрала яго прах дадому — і пахавала ў калумбарыі на Кальварыйскіх могілках у Мінску.

Пры жыцці ён быў аўтарам адзінай кніжкі («Фарбы душы», 1989), прадмоўку да якой напісаў жывы класік перабудовы Алесь Адамовіч. І вось нарэшце выходзіць і гэтая, другая, пакутная кніжка яго кароткага драматычнага жыцця, якая павінна была пабачыць свет яшчэ ў 1995 годзе. Але быў такі няпэўны ва ўсіх адносінах час, што на нейкім не да канца выверавым дзяржаўным зруху рассыпаўся і набор яго «П'янай кнігі» (гэтак мелася яна быць названай). А лёс ужо гнаў яе аўтара апальным шляхам… Ні ў чым па сутнасці і ні перад кім не вінаваты, раптам, ён стаў вінаватым ва ўсім і перад усімі. Адзінокі, пакінуты сярод адчужанага свету са сваёй любімай, але бязмоўнай сучкай Жужай…

Усяго не раскажаш, бо не зразумеюць. Ды ён і сам не ўсё разумеў. Інтэлектуал і франт з сярмяжнай беларускай натурай. Я любіў яго. Мы разам смяяліся і плакалі над тым, што мелі. Цяпер я смуткую адзін. Там — без Айчыны, мовы і сяброў — ён не мог вытрываць даўжэй, чым вытрываў. Магчыма нешта яшчэ ён напісаў бы, але — не… Не напісаў, бо было немагчыма.

**І каталікі, і праваслаўныя, і уніяты, і нават няверуючыя — у адну беларускую вязанку. Каб паразумецца…
Беларушчына ж і літаратура сталі справай прыватнай: хочаш гавары, хочаш пішы — не чуюць і не чытаюць. Бо ўсе, хто гаворыць і піша, пішуць і гавораць для сябе. Народ труднуе (як піша М. Вайцяшонак) і глядзіць серыялы. Ёсць у яго «Беларусь сегодня» і «Лад», а заўтра — Бог-бацька…**

Тое, паасобнае, не даведзенае да ладу, што не ўвайшло ў кніжку, будзе таксама чакаць свайго часу. А гэтая кніжка — помнік гадам перабудовы, чарговаму беларускаму Адраджэнню і станаўленню незалежнасці, помнік ЯМУ самому, яе аўтару. Шчыраму, цудоўнаму чалавеку, таленавітаму пісьменніку, драматургу і перакладчыку, які сканаў ад таго, што яго жаданні не супалі з магчымасцямі. У чалавечым жыцці надараюцца таямніцы і загадкі, якія так і застаюцца нераскрытымі і неразгаданымі. Жыццё і творчасць аўтара гэтай кніжкі якраз з такога выключнага шэрагу. Прачытай гэты тайнапіс, шаноўны чытач, і, мажліва, ты наблізішся да разумення ісціны. Не болей за тое, і ўсё ж… Магчыма, з яго слоў ты ўразумееш і сваю паднебную значнасць і зямную нікчэмнасць. Жыццё кароткае…

Не асуджайце асуджаных. Паспрабуйце зразумець чалавека такім, якім ён быў, а калі ўдасца, то і такім, якім ён хацеў быць…

Леанід Галубовіч

Пасляслоўе

Проза Алеся Асташонка пераважна малаўсмешлівая, сумная. Яна нагадвае прыгарадны лес, адстойвае першазначнасць чалавечае цеплыні і прыгажосці ўнутры ўсеагульнай нашай неўладкаванасці і адсутнасці жаданага ўтулля. Галоўныя вобразы яе навеяны занядбанасцю драўлянае гарадское ўскраіны, людзі якой увесь час чакаюць «наступу» бетонных кварталаў, спадзеючыся памяняць свае несамавітыя хаціны на добраўпарадкаваныя кватэры, і ў гэтым сваім паўсонным чаканні бавяць часам паўжыцця…

На крапіўных вулках Менска, у наваколлі Чэрвеньскага рынку, будучы празаік і драматург Алесь Асташонак дыхаў напаўчыстым паветрам хуткаплыннага маленства і поўнага пякучых спакусаў юнацтва, пра многае рамантычна думаў, але яшчэ больш рэалістычна заўважаў, таму, вядома, яшчэ да напісання сваіх першых п'ес і апавяданняў ужо досыць выразна ўяўляў усю драматычную непаўнату шчасця, на якую асуджаны чалавек.

Агульнажыццёвае дый, бадай, агульналітаратурнае пытанне: ці шчаслівы чалавек? — у апавяданнях А. Асташонка набыло даволі пэўную тэматычную дамінанту. Пісьменнік не імкнецца знайсці якісьці адказ, мабыць, разумеючы, што адказу проста можа й не існаваць, тым больш канкрэтнага, але ён дэталёва даследуе само гэта пытанне, якое гэтак ірве душу: ці шчаслівы чалавек? — прычым пазбягае, што асабліва важна, павярхоўнага філасофствавання і аднастайнасці ў пісьме.

У цыкле апавяданняў «Пясок і попел» — зноў-такі «прыхаваная» размова аб шчасці, нейкі разгорнуты сумны эцюд без якіхсьці высноваў і адказаў. Галоўнае — у запытальна-паэтычнай інтанацыі, што суседнічае часам з жорсткімі тайнамі, — інтанацыі шчымлівага гучання. Новая проза А. Асташонка скіроўвае нашую ўвагу не ў ілюзорную будучыню, а ў рэальную мінуўшчыну, стварае вобразную гісторыю яшчэ аднаго дзяцінства, юнацтва, сталасці.

Дасведчаны чытач уловіць у гэтай запытальнай, крыху настальгічнай гісторыі водгукі бурштынавай прозы Міхася Стральцова. Што ж, усё таленавітае пазнавальнае, як пазнавальнае перастворанае шчырым словам жыццё, — у кожнага было сваё дзяцінства, дзедава хата, ці падабенства яе, і ў кожнага ёсць ці было ёсць, ці хоць бы сямейны пра яго ўспамін.

Леанід Дранько-Майсюк



Анатоль ІВАШЧАНКА



Карціна Аляксея Марачкіна

Бэтмэн вяртаецца

Апошні верш зімы

ад словаў стаміўся
ад гэтай пустой валтузні
ад шэрай сталіцы
ад беспярапыннай грызні
мітусні…
ад няшчырай гульні…

стаміўся ад смецця
заспаны заспамлены голаў
і голы
выходзіш на лютаўскі холад
у горад
дзе кожны бязрытмава б'ецца
ва ўласнай адчыненай клетцы
да смерці

адно застаецца
сэрцу даверыцца

Па-над

і толькі лянівы
шчэ не зрыфмаваў: какаін — гераін
і толькі лянівы шчэ не лекаваў сябе тым,
што застаўся адзін
і самы маўклівы
насамрэч найболей шчаслівы
і толькі праўдзівы
у стане знайсці ў сабе дзіва
упарты, нібыта Сідхартха
празрысты, нібы Дхаммапада
увішны, бы Вішну ў бойцы
Каўраваў з нашчадкамі Панду
у стане не па-за
а па-над

* * *

Гарант
захацеў вучыць граматy —
пабудаваў дыямант.
Кінуць
у дыямант гранату б,
толькі хто б даў
пад гэтае грант?

* * *

Усеваладу Сцебураку,
з нагоды выхаду кнігі
«Бег па самаадчуванні»

Няхай наўкол суцэльны POST і LAST,
не перайма́йся дужа, дружа.
Хай будзе так, не склеім ласт,
пакуль ёсць рыфмы
ў нашых паэтычных ружжах.

Бэтмэн вяртаецца

Голаў працуе хутчэй, прапарцыйна
павелічэнню голаду.
Хуткасць сто сорак. За бортам зоры.
Колькі шчэ трэкаў да гораду?
Колькі шчэ трэкаў, — пытаецца слых, —
ліпава-рэпавых, новых і злых?..

Лісце з бязвыйсця пад колы кідаецца
клёны з праклёнамі ў шыбу ўзасмок.
Шчоўкае горад сталёвымі сківіцамі,
фары ўгрызаюцца ў чэзлы паўзмрок.

Бэтмэн вяртаецца з рэйду пад раніцу
ў свой запляваны цёмны пад'езд.
Слізгае ў фортку дзеўчына-котка,
зрэшты, цяпер крыху не да яе.

Ўсё у парадку. Айфон — на зарадку.
Піва ў лядоўню, крылы ў кут.
Выхапіць поўня надпіс няроўны
маркерам чорным:
«LU.. НА МУКУ».

Бэтмэн кладзецца ў ложак астылы
з веданнем пэўным: хутка гамон
прыйдзе ржыму, й ні Джокер з Пінгвінам
не ўратуюць, ні НКУС, ні АМОН.

Спіце ж спакойна й вы, гараджане.
Волі світанне не за гарой.
Цемра растане. Паспі й ты, кажане.
Хутка на працу,
супергерой.

Белая багіня

строфы выкрочваюцца нагамі
словы закручваюцца ў арыгамі
новы хаўрус са старымі багамі
белая гіне багіня
пад намі
багна,
засцеленая ведзьмакамі
выспа,
заспамленая слімакамі
марная марнасць
мары пра мора
хіба гэта хіба
га?

…

закаркаваныя
ў ранішніх трафіках
замардаваныя
працоўнымі графікамі
раней мы пісалі нарысы
цяпераka — зводзім каштарысы
раней мы пісалі вершы
раней мы хадзілі пешшу…
паголеныя пачуцці
агаленыя праўды
хоць слоўца хачу пачуць ці
паўслоўца хоць —
праўды

Сын

сунуць у фортку нос
нюхаць подых вясны
ведаць: за сценкай спіць
сын

добрае слова: сын
ў сына растуць валасы
ведаць: цяпер глядзіць
сны

сын гэта я сам
ў сына забіты нос
бачыць за сценкай сын
сон

нюхаць подых вясны
ведаць: за сценкай сон
ведаць: забіты нос
лёс

Чорная сутра

той хто змог убачыць сябе па-за сабой
наўрад ці павядзецца на танныя коміксы
пра планету як вязніцу
і канвой з анёла-ахоўніка за спінай

той хто меў патрыманую «бэху»
ужо не перасядзе нават у новую «жыгу»
вытворчасці тальяцінскага аўтазавода

той хто кахаў каралеўну
ніколі не будзе жыць у законным шлюбе
з надзіманай гумовай лялькай

Былы-лепшы-сябар

я не ведаю калі страціў яго
але напэўна раней за тое
тэлефоннае тлумачэнне
калі мы абодва так шмат
даведаліся пра сябе…
мне цікавы й дасюль не зразумелы
механізм нашага разрыву
як не да канца зразумелыя
яго сапраўдныя прычыны

нейкі час я ўпарта спрабаваў
высветліць тое
але ён паставіў на мяне бан
унёс ва ўсе чорныя спісы
змяніў сімку мэйлы
(а мо й горад ці планету?)

першы час бывала
я мог па некалькі разоў на дзень
бачыць яго на вуліцы
(і не дзіва бо мы ж жывем у суседніх
дамах
што калісьці было зроблена адмыслова
дзеля зручнасці сустрэчаў ля нейтраль-
нага пад'езда
дзе пад піва вырашаліся лёсы чала-
вецтва…)

аднойчы нават
ён прайшоў зусім блізка
але не ўзняў вачэй —
ці тое сапраўды не заўважыў
ці тое…
а так напраўду
што б я сказаў яму?
«Здароў, былы-лепшы-сябар»?..

пасля ён знік
і мяне мала займае
што з ім
і дзе ён цяпер
разам са сваім
дэпрэсіўна-маніякальным псіхозам
паўтаруся
мне цікавы сам механізм…

цяпер я шпацырую
з нашым старым вазком
але новым дзіцёнкам у ім
вык[д]рочваю гэтыя радкі
і бачу
як ён пралятае на ровары
міма мяне
(дарэчы не факт
што ён ізноў мяне заўважыў
бо і ў гады сяброўства
ён мог гэтак праляцець міма
і не заўважыць)

я азіраюся
я праводжу яго позіркам
і дасылаю яму ў спіну
даўно прыгатаваную
вынашаную
і ўжо цалкам спакойную
кропку.

Яна варыць суп

Кідаем бульбу ў рондаль —
буль! —
булькае бульба ўсё роўна,
быццам маленькая бомба.
Кіпень бурчыць і вуркоча,
вымкнуць з-пад накрыўкі хоча.

Зробім паменей агеньчык —
чык! —
солькі крыху дададзім.
Роўненька столькі
кінема солькі,
каб было досыць усім.

Мама, дачысці цыбульку!
Вочкі баляць у дачулькі.
Хуценька, мама, інакш
вочка ў дачулькі заплача!

Дзякуй, матуля! Цяпер жа
дробна цыбульку парэжам,
сальцам патэльню зможам.
Будзем цыбулечку смажыць!

Кінем у рондаль цыбульку —
булькне не горай за бульбу.
Ўсыпем грыбкоў, зеляніну…
Супчык мяшае Яніна.

Хай пракіпіцца крыху.
Скажам у бок цыху-цыху-цыху,
выключым, хай настаіцца.
Праўда ж, мы — чараўніцы?!.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 5 (93) | 30 мая 2014 | № 21 (390) Новы Час

Мікалай Ігнатавіч



Анатоль САНАЦЕНКА

Павольна наладжваецца фокус памяці, павольна рухаюцца лінзы ўспамінаў у пошуках патрэбнай кропкі. Вось знайшлі, спыніліся — і адраджаецца мінулае, павялічваюцца, растуць дэталі. Цяпер можна казаць...

Мікалай Ігнатавіч быў захавальнікам выставачнай залы. Пазнаёміліся мы з ім так: я на ўсялякі выпадак — рэпарцёрская прадбачлівасць — перапісваў у нататнік імёны мастакоў, чые працы былі на выставе, ён прывідна з'явіўся перада мной на некалькі імгненняў і ласкавым, прыязным тонам прапанаваў сваю дапамогу.

«Звяртайцеся, калі вам што-небудзь трэба, пытайцеся», — ціха сказаў Мікалай Ігнатавіч і, дачакаўшыся майго адказу: «Дзякую. Пакуль я толькі знаёмлюся», — гэтак жа прывідна, ціха пайшоў. (Гэтак жа прывідна і ціха, як і ў той восеньскі дзень, які паклаў канец яго зямному існаванню.)

Пасада захавальніка выставачнай залы як нельга лепш падыходзіла да яго аблічча, характару, ладу жыцця. Вось недакладны партрэт Мікалая Ігнатавіча, намаляваны акварэллю памяці: сярэдні рост, густыя цёмныя валасы, такія ж бровы, славянскія, мяккія рысы твару. Рухі яго былі павольныя і асэнсаваныя; ён меў выдатную «дарэвалюцыйную» выправу. Насіў звычайны касцюм-«тройку», але, пры поглядзе на яго, чамусьці ўвесь час здавалася, што на ім строгі смокінг.

Размаўляў Мікалай Ігнатавіч на бездакорнай мове. Праўда, некалькі старамоднай. Яго гаворку расквечвалі афарызмы, і, памятаю, як мне было прыемна яе слухаць — вобразную, прыгожа пабудаваную, павольную, — асабліва ў час чарговага майго душэўнага землятрусу, балаў гэтак шэсць паводле Рыхтэра.

Апавядальнік ён быў насамрэч цудоўны. А з яго жыццёвым і культурным вопытам (служыў афіцэрам, кіраваў гарнізонным Домам культуры, шмат падарожнічаў...) яму было пра што распавесці. Мог, напрыклад, вельмі дарэчы, успомніць які-небудзь «выпадак з жыцця», прачытаць яркую лекцыю пра творчасць таго ці іншага мастака, які выстаўляўся ў зале, распавесці гісторыю стварэння палотнаў; умеў прасачыць звіліст ход якой-небудзь ідэі або тэмы, асвятляючы факелам свайго інтэлекту самыя аддаленыя куткі падсвядомасці мастака.

Шануючы яго разуменне, жывапісцы ставіліся да яго з вялікай любоўю і павагай, шмат дарылі яму сваіх палотнаў, казалі: «выставіцца ў Ігнатавіча, галерэя Ігнатавіча...»

Дарэчы, дырэктарам залы была яго адзіная дачка Наталля, Наталі, а яе малодшай сяброўкай — мастачка Вольга.

Такім чынам, Мікалай Ігнатавіч мімаволі стаў пасярэднікам лёсу, што звёў мяне праз некаторы час з Оляй. А паколькі ў лёс я веру, то лічу гэта не выпадковым плёнам хаосу, а абдуманай, асэнсаванай падзеяй... Мабыць, пра той перыяд варта распавесці падрабязней...

Гэта быў самы цяжкі ў маім жыцці час. Я знаходзіўся ў хісткім, пакутлівым стане пераходу ад падлетка да маладога мужчыны, прычым вызначана затрымаўся ў малалецтве, у сваю чаргу зусім завязнуў у праклятых пытаннях быцця, якія да таго часу і сам праклаў. Штосекундная рэфлексія, якая стала шостым, самым няправільным маім пачуццём, зусім загнала маю душу, змучыла розум, зрабіла мяне занадта асцярожным, занадта ранімым.

Свет праходзіў скрозь мяне. Я стараўся радзей сутыкацца з рэчаіснасцю і людзьмі, што жылі ў ёй.

Я закрываўся ў сваім пакоі, які, на шчасце, у мяне быў, і заміраў у здранцвенні.

Мае бедныя добрыя бацькі глядзелі на ўсё, што адбывалася са мной, спалоханымі вачыма, але мудра не ўмешваліся.

Гэта сапраўды было разумна з іх боку, паколькі па той дарозе, на якой я апынуўся, мне трэба было прайсці самому, у поўнай адзіноце.

І толькі прайшоўшы яе, я быў бы выратаваны, супакоены на ўсё наступнае жыццё.

Больш за ўсё, вядома, маіх бацькоў палохалі тыя развілкі, што непазбежна сустракаюцца на любым (фізічным або метафізічным) шляху. Трывожыліся яны нездарма: сустрэтыя мной павароты, якія спачатку маглі здацца абходнымі, лёгкімі дарожкамі, на самай справе вялі, у лепшым выпадку, у вар'ятства, у горшым — у самагубства. На шчасце, я своечасова гэта адчуў, у чым мне дапамагла не зусім яшчэ задушаная рэфлексіяй інтуіцыя, якая пазней, калі я заняўся журналісцкай працай, стала маім галоўным прафесійным інструментам.

У пошуках апорнага пункта для свайго духу, для створанай мною сістэмы каштоўнасцяў, я разабраў свет да каркаса, унутрана скаланаючыся ад тых знаходак, што былі зробленыя мной у выніку такой вось духоўнай археалогіі. Да дзевятнаццаці гадоў (да часу сустрэчы з Оляй) я ўяўляў сабой даволі жахлівае відовішча: закутае ў браню комплексаў і фобій істота з трывожнымі вачыма самазабойцы, якая баіцца кожнага новага дня.

Але Оля змагла стаць той шуканай кропкай у маёй сістэме каардынатаў, дзякуючы якой свет зноў з цягам часу здабыў сэнс і значэнне. Калі мы сышліся з ёю, гэта зрынула ў жах маіх добрых бацькоў, якія бачылі мой лёс зусім іншым, зусім іншым. Яны лічылі Олю эксцэнтрычнай, дрэнна выхаванай



асобай, уплыву якой, маўляў, паддаўся іх хлопчык.

Яны, вядома, мелі рацыю, мае бедныя бацькі: Оля сапраўды была хуліганкай. Але менавіта гэта мне ў ёй і падабалася. Дзіця свайго часу, яна ўвабрала ў сябе ўсё — пачынаючы ад моднай эмансіпацыі да гэтак жа модных адносінаў да кахання, як — аднаго з відаў спорту, карыснага для здароўя.

Гэтак жа легкадумна яна ставілася да алкаголю і цыгарэт, апынуўшыся прама-ткі вундэркіндам у засваенні «імпартнага», як казалі мае бацькі, ладу жыцця.

Мне ж, непітушчаму маралісту ў дзясятым калене, зусім абыякаваму да ўсяго дымна-тытунёвага (акрамя не зусім зразумелай для мяне самога апрыёрнай павагі да гаванскіх цыгар), — мне, зразумела, спачатку ўсё гэта было дзіка.

Але нездарма ж кажуць, што супрацьлегласці сыходзяцца. Відаць, гэтым і тлумачацца нашыя, незразумелыя для іншых, адносіны. Менавіта Оля зняла чары майго ўзросту, вызваліла з штосекунднай турмы майго ўнутранага чалавека. Гэта яна пазбавіла мяне ад страху перад полавым пытаннем (прывітанне венскай школе псіхааналізу), калі аднойчы ўвечары ад жартаўлівай бойкі за яблык мы перайшлі да ўзаемнага распранання.

Так паўтарылася біблейская гісторыя...

Калі ж я абвясціў маім любым бацькам, якія так за мяне непакоіліся, аб рашэнні стварыць сям'ю, і не з кім-небудзь, а з Оляй, яны дружна пацягнуліся па валідол.

Катэгарычнае «не!» бацькі спрыяла яшчэ большаму збліжэнню з Мікалаем Ігнатавічам.

Даведаўшыся ў прыватнай гутарцы са мной, што нам з Оляй тэрмінова трэба знайсці якое-небудзь жыллё, ён адразу прапанаваў сваю дапамогу (у выглядзе кватэры, якая засталася яму ў спадчыну ад памерлай сваячкі). Прычым кватэра была прапанавана нам у бясплатнае карыстанне — з умовай аплаты толькі камунальных паслуг. Мы з Оляй тады перабіваліся выпадковымі заробкамі, і толькі такія ўмовы і былі нам прыдатнымі.

Але на гэтым дабрачыннасць Мікалая Ігнатавіча не скончылася: ён знайшоў для Олі выгадныя заказы на афармленне офісных інтэр'ераў тагачаснага фінансавага панства, а мне — пастаянную журналісцкую працу (па дамове з адной з буйных газет з добрым фінансавым самаадчуваннем).

Цяпер цалкам зразумела, што Мікалай Ігнатавіч быў нашым добрым анёлам-ратавальнікам. Оля — таемна, за вочы — нават намалявала яго партрэт, на якім так яго і адлюстравала: шасціскрылы Серафім з пячаткай веды, або — мудрасці, на чале.

На маю думку, яна была недалёка ад ісціны. Мне і самому часам здавалася, што ён знаходзіцца паміж намі, людзьмі, з таемнай місіяй дабра і гармоніі, умела хаваючы ў тагасветным свае цудоўныя палевыя крылы і залацісты німб. Уяўлялася таксама, што яго сям'я — ціхая, маўклівая жонка і не пазбаўленая мастацкага дару дачка — своеасаблівае прыкрыццё, так бы мовіць, кампраміс з зямным жыццём.

Мы з Оляй цягнуліся да Мікалая Ігнатавіча ўсёй душой, — ён ураўнаважваў наша бурнае быццё сваім спакоем і жыццёвай мудрасцю. Я часта забягаў да яго «на каву» — падзяліцца навінамі, адвесці душу або проста пагутарыць «ні пра што». Ён забяспечваў мяне кнігамі з сваёй з густам падабранай бібліятэкі, чым вельмі дапамагаў мне ў журналісцкай працы. Нярэдка, у цёплы час года, мы ўсе разам выязджалі на прыроду — у сасновы лес, дзе асабліва лёгка дыхаецца, або да рэчкі, на які-небудзь маляўнічы бераг. І гэтыя нашыя ўцёкі з урбаністычнай цывілізацыі дарылі відавочнае задавальненне Мікалаю Ігнатавічу — вялікаму аматару прыроды.

Па цэльнасці сваёй натуры ён, безумоўна, быў чалавекам не гэтага стагоддзя. Такой цэльнасці цяпер ужо не сустрэнеш. З ім было вельмі ўтульна і спакойна. Душэўны, мяккі тон гутаркі Мікалая Ігнатавіча аказвалі на яго слухачоў-суразмоўцаў сапраўды гаючае ўздзеянне — не горш мэтанакіраванай псіхатэрапіі. Да яго звярталіся па дапамогу і параду, нібы да свецкага святара. І ён дапамагаў, усім дапамагаў, чым мог.

Менавіта да яго і пайшоў я ў душэўнай тузе, калі ў нас з Оляй здарылася буйная, але дробязная па сваёй прычыне сварка — і Оля, сабраўшы рэчы, пайшла да сябе. Мы абодва былі вельмі маладыя, ганарлівыя, амбіцыйныя і наўмысна не тэлефанавалі адзін аднаму каля двух тыдняў, хоць, па меншай меры, мне вельмі хацелася гэта зрабіць.

Мікалай Ігнатавіч з'ездзіў да Олі, пагутарыў з ёй — і памірыў нас. Ці былі ў яго нейкія недахопы? — задумваюся я цяпер. Прыгадваецца толькі яго нелюбоў да газет і тэлебачання; бясплатны пропуск у выставачную залу сваіх шматлікіх сяброў і знаёмых, а таксама — дзяцей, якія зазірнулі да яго з-за цікаўнасці...

Так прайшлі два гады. Што я яшчэ памятаю? Памятаю выдатныя літаратурна-музычныя вечары, якія ён ладзіў у сваім зале. Таксама — усе гэтыя размовы пра літаратурныя навінкі, якіх тады было вельмі шмат, пра філасофію, пра жыццё — наогул...

А як ён спяваў рамансы Грыга і Рахманінава! Пад акампанемент піяністкі — нашай агульнай знаёмай, настаўніцы музыкі, — яго глыбокі, аксамітны барытон расплываўся па ўсіх пакоях выставачнай залы, напаўняў сабой усю прастору, усю душу...

Памёр ён гэтак жа, як і жыў — лёгка і спакойна.

На пачатку верасня стаяла цёплае надвор'е, і мы адважыліся на яшчэ адну, як затым аказалася, апошнюю, паездку ў лес.

Нябёсы былі чыстыя і блакітныя па-вясноваму. Мы аджыўлена гаманілі, радаваліся такому дню і магчымасці пагутарыць адзін з адным. Мікалай Ігнатавіч усё жартаваў са сваёй дачкі — з яе недарэчнага ў лесе макіяжа і высокіх абцасаў.

«Ты, радасць мая, нібы на баль восені сабралася», — казаў ён і весела падміргваў нам з Оляй. Калі мы, нарэшце, дабраліся да нашага ўлюбёнага месца — ціхай, утульнай паляны ў сасновым бары, — ён раптам аддаўся меланхоліі і неўзабаве кудысьці знік.

Праз некаторы час мы спахапіліся, весела, гулліва закрычалі трыма маладымі галасамі на ўвесь лес: «Мікалай Ігнатавіч, дзе вы?» — ніхто не адгукнуўся.

Затым убачылі: ляжыць на краі паляны, спіной да нас... Думаючы, што гэта нейкі розыгрыш, мы, ціхенька хіхікаючы, прыкладваючы палец да вуснаў і жартаўліва пагражаючы адзін аднаму кулакамі, падкраліся да яго. Калі пасля іранічных слоў ды заклікаў мы нарэшце занепакоіліся, кранулі яго за плячо, — лёгка перавярнуўшыся на спіну, ён у апошні раз зірнуў на нас застылымі вачыма...

Пасля яго смерці свет нядоўга ўтрымліваўся ў сваёй ранейшай раўнавазе. Неўзабаве ён зноў рушыў на мяне — усім сваім невыносным цяжарам.

Нашы адносіны з Оляй неяк самі сабой сапсаваліся, і мы разышліся — ужо назаўсёды. І хоць потым у нашым жыцці адбываліся і станоўчыя метамарфозы: яна, напрыклад, удала выйшла замуж за камерцыйнага дзялка, я зрабіў журналісцкую кар'еру, — усё гэта ўжо было нязначным і не мела ніякага дачынення да душы.

Важным было іншае: неба больш нікога да нас не прыставіла; я зноў пагрузіўся ў метафізічную, непазбыўную, невыносную адзіноту.

Май мае што сказаць

Вершы розных гадоў



Віка ТРЭНАС

***

Усе нашы лісты, адпраўленыя ў нікуды,
усе атрыманыя намі пацалункі Іуды,
усе тыя, хто шаптаўся ў нас за спінамі
з вачамі нявіннымі —
усе, каму мы ўпоперак горла
і з-за каго мы спазналі гора —
усё гэта знікне, сплыве ў вокамгненне,
бы дрэннае сненне.
Застанецца адно:
сумленнае,
несумненнае.

2014

***

пакуль не спазнаеш, што бог ёсць любоў,
не спраўдзіш на ўласнай скуры,
не выйдзе душа, як рака з берагоў,
у вусцішны свет, не ўратуе яго
ад злой непазбежнае буры

пакуль не дазнаешся, хто ты такі,
датуль не адолець імклівай ракі

дзесь там, у глыбінях, на зацішным дне,
нязробленых спраў, неагучаных словаў
і думак даволі, адно выйсця — не
віна тоне ў сэрцы, а праўда ў віне,
ды болю маўклівая мова

той толькі не згіне ў нястрымных вірах
хто ў вырай свой знае найпроставы шлях

2012

***

Ты кажаш: змагайся! Трымае мяне за руку
Пяшчота маланак і здушаны шэпт
навальніц.
Усмешкаю ветлай, няхай мы
заціснуты ў кут,
Збалелае сэрца крані.

Няхай не сабраць раскіданых для нас
камянёў —
Маўчы, мой анёл.
Калі каралі без каронаў, а дрэвы
без каранёў —
Цярпі, мой анёл.

2011

Прыручаны

па берлінах прагах і венах
на мяне забыўшыся быццам
ты вандруеш бы кроў па венах
я збалелага сэрца хачу пазбыцца

не ў берлінах прагах і венах
вакол пальца абводжу стужкі
сцяжын і вяртаецца верны
як прыручаныя вяртаюцца птушкі

ты дазволь маім новым імёнам
пераблытаць дні назвы і даты
калі ты некім быў прыснёны
ці ёсць розніца — стаць акрыленым
ці крылатым

чым адным заставацца ў выраі
адчуваючы свербр за спінай
анёлы вандруюць шляхамі вывернутымі
і толькі мы — з крыламі вывернутымі
— аўтаспынам

2009

***

я там дзе марыператвараюцца ў прысак
рукамі вуголле гарачае разграбаю
прыгадваю твару твайго бездакорныя рысы
і думаю што нездарма за цябе паміраюць

усе мае вечныя жыцці — валошкі ў жыце
усе мае дзеці — адлюстраванні ў вадзе
адбіткамі ног на дарогах кроўнага краю
усё паспее памерці за крок да раю

цалую цябе і рана сівеюць скроні
ратую цябе каб не быў ты ў сумленне
закуты
зацягнуцца рваныя раны вандроўнік
мой родны
душа як будзе балець — прыкладзі
трыпутнік

2009

Моўкны свет

Пах скошанай травы. У цэнтры горада.
Стаю, збялелая ад гора, гордая,
І ў твары выпадковых слухачоў
Крычу. І чуе нават хмарачос.

Мне набалелы белы бэз. Мой толькі
смутак.
Май мае што сказаць, ды суму так
Няёмка перад ім, і ён даждждом прайшоў.
Мне млосна без цябе. І ў гэтым шоу

Я стану мурашом на той травінцы,
Якую ты сарвеш. Ты ў навальніцу
Ідзі. Там будзе верш. Там горад наш увесь.
Знайдзі. Разгаварыў мой моўкны свет.

2009

***

я пакутую на пяшчоту
я пакутую на спакой
навальніц маланак грымотаў
не турбуюся я наконт
марнатраўных майскіх залеваў
прадчуваю саматы скон
і чытаю справа налева
незабыўны нязбытны сон
марнатраўных травеньскіх ліўняў
іх абдоймы мне прадракуць
зноў квітненне бо я расліна
ты дазволь мне выпрастаць спіну
ты вазьмі мяне за руку

2009

***

ты з роду гламурных дзяўчынак
з душою наросхрыст,
на тое самота прычынай,
Хрыстос уваскрослы,
і многае іншае, зрэшты,
бо ёсць мера ў рэчах,
ты парастак райскага дрэва,
ды грэшны, ты рэчка
збавення ад згадак, ты ростань,
ты роспач, ты рэха
даўно прамінулых падзей дый ты
— Божая рэшта,
распнутая ветрам раз'ятраным
на скрыжаванні
дарог, ты крычыш у нікуды: я з вамі
я з вамі

2009

(балада пра бітае шкло)

ты прымушаў хадзіць па бітым шкле
і я ішла амаль не баючыся
як чалавек ад жаху мружыць вочы
так дом закінуты прымружваў вокны

загадваў ты трымацца за паветра
штурхаў паперадзе сябе з балкона
са скрыўленымі вуснамі з пагардай
і я ішла ад болю сцяўшы зубы

п'яны хваробны бляск у вузкіх зрэнках
ў якіх адбіліся маё маўчанне
і перакуленае неба
і птушка ў ім
і дрэвы дагары карэннем
я помню
як страшна мне бо гэта быў не сон

2008

Пытанне ў бездані



Ганна ХОМЧАНКА

Ганна Хомчанка нарадзілася ў 1994 годзе ў Менску, студэнтка 3 курса факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Сфера інтарэсу: прастора і час, прырода свядомасці.

***

Адзінства робіць множным самое сябе,
Застывае сонцам, раздзіраючы
неба напалам.
А складкі эгаізму хаваюць сапраўднае,
Магіла рота — дно бясконцае,
Дзе мы топімся ў нашай жа сліне.
Мы адчуваем гэты смак.
Часам яго можна стрываць,
Часам няма куды плысці.

Мёртвае беларускае неба

Адмаўлячыя словы — пустыя,
Як вада, сваёй поўнасцю.
Чырвоныя ягады халодныя,
Як дарогі, якія сагравають лісце клёну.

Аддаваць душу лесу, каму ж яшчэ?
І выпрошваць зваротна, што ж яшчэ?
Аблокі падманваюць, як неба — мёртвыя,
Паднімаць мёртвых рыб з глыбіні...

Сонца заліта
заліта неразуменнем чырвоным:
Вечнае чырвонае — вяшчальнік цемры,
Усведамленне падробленых існаванняў —
Ад свету і волі, сусвету далоні,
мы адхілены.

Назаўжды
сыходзячы ў гукі песняў смерці,
Адчужэнне ўпісана ў нашыя сэрцы,
Якія матляюцца, а сумленне разадрана
ідэямі велічы і перамог варварства.

Агатавыя кроплі, зваліўшыся з галін, змываюць
Пот святара, што нас увесь час хавае
Кожнай стомленай восенню.
Каму ж яшчэ лес частку свядомасці
адразае?

***

павольна папіваючы віно, выдыхаючы дым,
выцірае куткі вуснаў сурвэткай,
падае сваю гужаватую руку,
прапануе сесці на крэсла, што стаіць насупраць яе.
прапануе паглядзець адна на адну,
прапануе закахацца, потым аддаліцца,
стаць роднымі. а потым — усяго толькі назаўжды!
Але, Смерць, камусьці адной не хопіць
месца ў прасторы вечнасці!

Хто я?

У часе, у прасторы Я — з'ява.
У тым ліку і для самой сябе.
Эмпірычнае, забруджанае, множнае.
Пад гурбай восеньскага лісця.
Я частка нейкага большага факту, але і я ёсць факт,
мае прэдыкаты часткі майго факту.



Я — памяць, якую страчу.
Я існую — пачатак,
я цяпер гэта, а заўтра іншае.
А потым я нішто — канец.
Сталае, якое змяняецца.
Я — гэта пытанне ў бездані
«Хто я?» — гэта ёсць я.

Нейрабог усё прадумаў, альбо Дзе няма чым дыхаць

Ніхто не самотны, калі
Адсвечвае Я, якое не ёсць я —
Вялікі слоік іншых «Я».
Скрыня быцця,
Дзе няма чым дыхаць.
Вакол нейронаў і нарратываў
Расце мой кволы бэз,
Дзе Няма чым дыхаць,
Выпадковая Асадола
Стварае такую ж маю свядомасць,
У якой ёсць цэнтр — маё Я —
празрыстая ваза іншых Я.
А іншыя Я паказваюць бясконцасць
працэсу.
Але ўсё магло быць горш.
Насамрэч, усё ёсць горш —
бясконцасць ілюзорная.
Адзіны Нейрабог усё прадумаў.

S.

У хворыя ўніверсітэцкія вокны
б'ецца хваля залатога святла,
а я, губляючы словы ззаду сябе
ў смузе і ў расе,
ўсярэдзіне галавы,
затрымліваю прыгожую бессэнсоўнасць,
якая спявае мне пра супярэчлівасць
кававых аблокаў, што прымусяць
кожнага на імгненне забыцца
пра чалавечае рабства.
Слова.
Словы трапляюць у прастору волі,
дзе значэнне марудна мокне ў разуменні.
Але Немагчымасць чапляецца за слова,
цягне ўніз, у маўчанне.
І там застаецца.

Маладыя гады

Аўтабіяграфічныя дыялогі Васіля Быкава з Алесем Адамовічам

«Маладыя гады» — першы літаратурны досвед напісання Васілём Быкавым вялікай аўтабіяграфіі. У іх падмурку — сустрэчы-гутаркі з Алесем Адамовічам, якія адбыліся ў сакавіку 1985 года. У гэты час Адамовіч працаваў над фотаальбомам пра сябра.

Упершыню цалкам дыялогі былі надрукаваныя ў часопісе «Полымя» ў 2001 годзе. Між тым працу над тэкстам Быкаў працягваў і далей, аб чым сведчыў сам Васіль Уладзіміравіч ва ўступным слове да «Маладых гадоў»: «Гэтыя гутаркі пад магнітафон адбываліся даўно, з таго часу шмат што змянілася ў свеце, у тым ліку і ў асабістых лёсах двух суразмоўцаў. Памёр незабыўны Алесь Адамовіч, апынуўся на чужыне Васіль Быкаў. Я не думаў друкаваць усё тое, нават забыўся на яго, але... Калі ўжо яно выйшла ў «Полымі», дык мусіў вярнуцца да знаёмага тэксту і што-ніштo паправіць, удакладніць — галоўным чынам у стылю апавядальніка. Апроч таго, некаторыя мясціны пашырыць і патлумачыць...».

«Маладымі гадамі» Васіль Быкаў хацеў распачаць свой 8-томны Збор твораў, які на пачатку 2000-х рыхтаваўся ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», але так і не быў выдадзены. Цяпер жа «Аўтабіяграфічныя дыялогі з Алесем Адамовічам» (фрагмент якіх пададзены ніжэй) адкрываюць 10 том Поўнага збора твораў народнага пісьменніка Беларусі, які падрыхтаваны Саюзам беларускіх пісьменнікаў адмыслова да 90-годдзя з дня яго нараджэння.

Сяргей Шапран



Васіль Быкаў і Алесь Адамовіч. 1984 г. Фота Яўгена Коктыша

Васіль Быкаў: ...[Студзень сорак пятага.] Перайшлі Дунай, пераначавалі ў нейкай хаце... Назаўтра дабрылі да новага шпіталя. Ра́на мая была лёгкая, там мне выцягнулі асколак, застаўся толькі невялічкі абломак, які ў мяне дагэтуль. Нашу ў руцэ як памяць.

Алесь Адамовіч: Ты чуеш яго?

В.Б.: Закрануты нерв. Дагэтуль не магу гэтай рукой ні ўзяць што мацней, ні сціснуць.

А.А.: Гэта правая рука?

В.Б.: Так.

А.А.: Не можаш сціснуць нічога?

В.Б.: Калі што не цвярдое, магу. А ўжо тронак рыдлёўкі, якую жалязяку сціснуць мне трудна. У тым тылавым шпіталі ў Сегедзе я быў нядоўга, пад канец месяца выпісаўся. На спадарожных машынах скіраваў у аддзел кадраў арміі, дзе атрымаў накіраванне — на гэты раз вышэй, у армейскую супрацьтанкавую брыгаду (ІПТАБР). ...Я вырываўся з пакутніцы-пяхоты.

У лютым полк наш (ІПТАП) сваім ходам выехаў на фронт і заняў пазіцыі — ззаду за пяхотай. То быў супрацьтанкавы абарончы раён (ПТОР) на напрамку верагоднага прарыву нямецкіх танкаў. Тут гэты полк дашчэнту разграмілі за адзін ранак. Амаль нічога не засталося, ні гармат, ні нашых цягачоў — «студэбекераў». ...Аказваецца, што нашыя 76-мм гарматы супраць танкаў малаэфектыўныя.

А.А.: Супраць «тыграў» ці звычайных?

В.Б.: Не толькі супраць «тыграў». Увогуле тая гармата — не супрацьтанкавая, проста яе выкарыстоўваюць у гэтай якасці. Бо іншых няма. Адлегласць прамога стрэлу ў яе малая, прабойная сіла снарада таксама. Прыцэльныя магчымасці кепскія — горшыя, чым у саракапяткі. Наогул якасць зброі — заўсёды наша самае злабадзённае пытанне. У шпіталі ці дзе ў зацішку мы болей за ўсё пра тое гаворым, якая гэта дрэнь — нашы аўтаматы, кулямёты, гарматы ды і танкі. Але на палітзанятках пра гэта сказаць немагчыма, бо ва ўсіх газетах напісана, што наша зброя лепшая за нямецкую, што ў немцаў усё дрэнь ды эрзацы. І хлеб, і мыла, і кава. Ды яшчэ смярдзючы дуст, якім яны перасыпаюць усё ў бліндажах. Куды лепей, як мы, вошы смажыць у бочках. Часам нам чытаюць загады пра выпадкі, калі некаторыя афіцэры асуджаны вайсковым трыбуналам за пахвалу нямецкай зброі. Тым болей нямецкай тактыкі. Нашая тактыка таксама лепшая за нямецкую, чуем мы, і толькі некаторыя з нас пры тым крыва ўсміхаюцца. Але маўчаць.

Тады мы займалі ПТОР (супрацьтанкавы абарончы раён). Гэта значыць, размяшчаемся на танканебяспечным напрамку, на прамой наводцы. Да пярэдняга краю, можа, кіламетры два. Стаім, відаць, з тыдзень. Увогуле спакойна, хіба толькі даймае нямецкая авіяцыя. Але дзе яна не даймае? Цераз дарогу ад маіх гармат размяшчаюцца агнявыя пазіцыі майго сябра лейтэнанта Беражнога, які дужа любіць кніжкі, заўсёды нешта чытае. Я таксама люблю пачытаць. Неяк я ўзяў у яго «Сястру Кэры» Драйзера, але прачытаць не паспеў, і ўвечары ён прыйшоў да мяне па кніжку. Я папрасіў адтэрміноўкі, і Беражны пайшоў на свае пазіцыі.

А ранкам я прачынаюся ў зямлянцы. Зямлянaчкі ў нас былі саплівенькія такія... Прачынаюся ад прадчування таго, што нешта здарылася. Спярша не магу зразумець, што? Роў стаіць, дым і агонь. Выскокваю з зямлянкі і зноў не магу зразумець нічога. Нічога не відаць, дым есць вочы. Зверху нешта абрушваецца, падае, вые. Быццам сірэны. Аказваецца, пікіруюць «месершміты». А ў нас на агнявой была скрынка ракет — звычайных для ракетніц, на выпадак начной стральбы.

А.А.: І яны падпалілі?

В.Б.: Самалёты абстралялі і падпалілі ракеты. Тыя гараць і ўзрываюцца. Асколкаў няма, але... Ракеты там асвятляльныя, каляровыя, букетныя, усё гэта гарыць, пыхае, ірвецца, і роў гэтых абрынаецца зверху. Адзін самалёт адыдзе, за ім — другі, і з кулямётаў лупяць. Я ўжо не памятаю, ці яны адляцелі, ці пікіравалі, але мы пачалі тушыць пажар. І вось тады да нашага слыху данеслася, што насоўваецца і горшае. Зямля хадуном захадзіла, дрыжыць і, канечне, — знаёмы гул. Калі ветрам трохі аднесла дым ад гарэлых ракет, зірнуў я на дарогу, што была збоч. А трэба сказаць: полк размяшчаўся так: дзве батарэі з гэтага боку, тры з таго. Тое называецца — асядлаць дарогу. Дык вось па той бок дарогі за пасадкай прэ натоўп танкаў.

А.А.: Натоўп?

В.Б.: Менавіта натоўп, ідуць суцэльным гуртом, бы каровы на вадапой. Ніякага там баявога парадку, толькі пярэднія страляюць з гармат. Ну вось так, не спыняючыся, прайшлі — і палову нашага палка бы злізалі. Бы яго і не было — ні гармат, ні машын, ні людзей. Тут да мяне прыбягае камбат, старшы лейтэнант Ахрын (жыве ў Нікалаеве, зрэдчасу мы перапісваемся): «Вытаскивай пушку, подогнать машины!.. Мотаем отсюда!» Падагналі «студэбекеры», выцягнулі гарматы і некуды ўбок, — канечне ж, як па рацыі загадаў камандзір палка — наперарэз танкам. Але тут трапілі ў нейкае забалочанае кустоўе, машыны пачалі грузнуць, пасля прабіраліся па зарослых дубняком пагорках. Вядома ж, спазніліся, куды трэба было, і трапілі пад абстрэл танкаў. Якраз палявы касагор, які трэба праскочыць, але яго выдатна прастрэльваюць танкі з сяла. У нас было машын з дваццаць, гармат меней, дзве батарэі. І мы рашылі, што трэба прарывацца па адной машыне. Машына разганяецца і як мага шпарыць па касагоры, а танкі страляюць. І так адна пройдзе, а другую спаляць. Я праскочыў, не пацэлілі. Іншых пападбівалі і папалілі шмат.

Яшчэ праз дзень засталася ў нас адна мая гармата з машынай, радыёстанцыя і штабная машына... Але з намі камандзір палка палкоўнік Парамонаў, штаб, некалькі тылавікоў і аўтаматчыкаў. Прыпыніліся мы ноччу ў нейкім венгерскім фальварку — вялікі дом пад чарапіцай, стайні, аборы. Наперадзе шырокі магістральны канал, там пантонная пераправа, і нам трэба на той бок. Але пераправа ўжо захоплена немцамі, нам далей ходу няма. Пад кустоўем у канцы падворка паставілі гармату. Перад намі шырокі роў, а за ім дарога на пераправу. І на гэтую дарогу ўранку хлынуў усё той жа танкавы натоўп. У паветры — гул, гром, лязгат гусеніц, нават зблізку нічога нельга пачуць. І тут прыбягае да мяне парторг: «Командир полка приказал открыть огонь». Ну што ж, агонь, дык агонь. Але ці доўга тут пастраляеш? Наводчык прыцэліўся і стрэліў. Я побач сачу — ці пацэліў? Ды бачу, снарад пайшоў высока ў неба. «Что такое?» — крычу наводчыку, той удакладніў на панараме прыцэл. Зноў стрэліў. Я ў бінокль сачу, чакаю, каторы танк спыніцца, ды дзе там! Снарад б’е ў зямлю побач. Тады кідаюся да гарматы... А ў ёй ёсць такі механізм — паралелаграм з цягай, якая злучае панараму са ствалом. Куды ствол, туды і прыцэл — паводле ідэі. Але як мы цягалі гармату па лясах і пагорках, збілі тую цягу, і цяпер панарама і ствол глядзяць у розныя бакі.

А.А.: На ваша шчасце.

В.Б.: Так. Далажыў парторгу, той пабег дакладваць камандзіру палка. Разумны чалавек быў наш палкоўнік Парамонаў, вылаяўся і махнуў рукой. Бо што тут можна зрабіць? І хто вінаваты? Пакуль мы мітусіліся, танкі прайшлі на пераправу і за пераправу. А нас тым часам з вышынь за каналам пачалі абстрэльваць свае цяжкія мінамёты. Мабыць, бачаць, што сноўдаюць нейкія людзі, во яны і б’юць, толькі чарапіца з дахаў разлятаецца. Тут мяне кліча камандзір палка і, паколькі я праштрафіўся, дае заданне перабрацца за канал і наладзіць сувязь з тымі мінамётчыкамі. Для таго выдзяляе мне чалавек пяць артылерыстаў, нейкіх прыблудных сапёраў і нашага батарэйнага старшыну Жарава. Што ж, сабралася група чалавек дванаццаць, прыгнуўшыся, пабеглі па полі. Але далёка не адбеглі, гляджу — нічога не выйдзе, тыя, з-за канала адразу накрылі нас агнём. Залеглі, што рабіць? Двух ужо параніла, некага забіла. Старшыне асколак у задняе месца ўпіўся. А да канала яшчэ ісці ды ісці...

А.А.: Яны рашылі, што вы наступаеце.

В.Б.: Яны, канечне, падумалі, што гэта немцы. Ну, і вырашыў я вярнуцца. Забралі двух параненых, забітых пакінулі і пад агнём, між разрываў прыйшлі на фальварак. Камандзір палка нават не лаяўся, сам усё бачыў. Праўда, мінамёты неўзабаве перанеслі агонь далей, рашылі, мабыць, што з фальваркам скончана. А мы тут неяк даседзелі да ночы. Ноччу рашылі прарывацца, бо іншага выйсця няма. Паслалі лейтэнанта Борматава (цяпер палкоўнік, жыве ў Крывым Розе) разведаць пераправу — ці цэлая. Ці, можа, мінамётчыкі яе ўжо расстралялі. Аказалася, пераправа цэлая, канечне, пад аховай (побач стаяць два бронетранспарцёры), і пад’езд да яе нават перагароджаны шлагбаўмам. У нас адна гармата, машына з радыёстанцыяй, яшчэ машын штук пяць было на ходу. Першым пусцілі мой «студэбекер», затым астатнія. Задача — збіць шлагбаўм і праскочыць на той бок канала. Але і на тым беразе таксама немцы, ужо паспелі заняць плацдарм. Чуваць, там ідзе бой, усё грукоча і грыміць. Мы з камбатам стаім на падножках абапал кабіны, у кузаве салдаты са зброяй напагатове. У прыцемках пад’ехалі да шлагбаўма, насустрач выскачыў немец з кружком чырвоным, бліснуў нам, штось крыкнуў. Ну а мы... «Студэбекер» усё ж магутная машына, як урэзаў ён у гэты шлагбаўм, той і адляцеў. Мы праскочылі...

А.А.: Не страляючы?

В.Б.: Мы праскочылі без стрэлаў, цераз пантоны на той бок, а там адразу каменны дом і паваротка на вуліцу. А ззаду пачалася страляніна, але мы па

гэтай вуліцы рванулі, як толькі можна было ўпрыцемках. Здаецца, усе праскочылі, толькі самую заднюю падбілі. Адразу за паселішчам прыпыніліся, бо нас абстралялі ўжо свае, паранілі двух салдат у кузаве і прабілі кола ў маім «студэбекеры». Тут жа паявілася начальства, і мы занялі абарону пад вышынямі. У пяхотным ланцугу паставілі гармату.

З тыдзень ішлі баі за тыя вышыні, але танкі далей не пайшлі. Мабыць, сваю задачу яны выканалі, паехалі на іншы ўчастак. А тут калашмаціла адна адну пяхота, вышыні па некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Я з гарматай акапаўся пад самай вышынёй, тое нас, мабыць, і ўратавала. Бо тых, што былі ззаду, немцы расстрэльвалі з вышыняў, а нас пад носам не бачылі. Там у нас загінуў падпалкоўнік Аўчароў, капітан Кавалёў, двое ўзводных і шмат салдат. Аднойчы пяхота ўцякла, пакінула маю гармату, якую мы не маглі выкаціць. Але абышлося — уратаваў туман. А ўвогуле маю гармату ратавала нашая самаходка, што згарэла ў першы дзень і прыкрыла сабой нас з боку канала, адкуль наш плацдарм прастрэльвалі нямецкія танкі. Яшчэ нас бамбілі свае «кукурузнікі» — жаночы авіяполк. Кожную ноч вешалі ў небе свае ліхтары і пачыналі кідаць бомбы. Добра, што яны не цалялі, проста разгружаліся... У перапынках паміж бамбёжкамі прыходзіў нампаліт маёр Цквітарыя, тлумачыў нам загады Вярхоўнага галоўнакамандуючага, каб ні кроку назад. Як пачыналася бамбардыроўка, ён кідаўся да ровіка, але быў тоўсты, няспрытны, месца ў цесным ровіку яму не хапала. Тады ён крычаў: «Я намеснік камандзіра палка, прыказываю асвабадыть места»...

Дзесьці ў гэты час мы атрымалі новыя 57-мм гарматы. Гэта былі добрыя супрацьтанкавыя гарматы — з доўгім ствалом і вялікай прабіўной сілай снарада. Яны нам адразу спадабаліся. Я сам прыстраляў іх паводле ўласнага спосабу — з дапамогай бінокля. Трапнасць іх таксама была выключная, і мы шкадавалі толькі, што паявіліся яны ў нас гэтак позна. Але і тое добра. У хуткім часе яны нам паслужылі, як за ўсю вайну не служылі іншыя гарматы.

16 сакавіка... Ноч некуды ехалі, ехалі — па нейкіх мокрых і гразкіх прасёлках, па полі, пад ранак праехалі на ўскраіну сяла, сталі абапал сцірты. Чутно, як непадалёк адбываўся якісьці рух — гырчэлі маторы, штосьці гуло, шархацела, часам чуліся прыглушаныя галасы. Ішлі калоны. Немцы ад Будапешта прарываліся на захад.

Як стала трошкі світаць, убачылі зводдаль тое, што чулі ў цемры. Ішоў суцэльны паток войска: аўтамабілі, танкі, пяхота. Зараз жа адкрылі агонь. Страляць было проста, бо блізка. Адразу там запылала некалькі аўтамабіляў, з танкаў па нашай ускраіне зрабілі некалькі непрыцэльных стрэлаў. А мой наводчык Расцалуеў меў вострае вока і трапна ўзяў іх на прыцэл. З другога стрэлу загарэўся танк. Калона амаль спынілася, заднія пачалі напіраць на пярэдніх, пярэднія гарэлі. Пяхота ў паніцы кінулася ў поле, і мы расстрэльвалі яе асколачнымі. Пасля, як усё скончылася, нешматлікія машыны ўцяклі, а пяхота разбеглася, мы пайшлі паглядзець, што нарабілі. Жудасна было тое бачыць... Такога разгрому я не бачыў з вясны сорак чацвертага года, як на дарозе пад Уманню нашыя танкісты разграмілі нямецкую штабную калону. Гэта быў ці не апошні бой на венгерскай зямлі, за восень, зіму і вясну багата палітай нашай крывёю...

Да аўстрыйскай мяжы рухаліся ўвогуле ўдала, з нядоўгімі сутычкамі. А на мяжы ўсё спынілася, немцы сталі ў абарону. У перадгор'і Альпаў — шырачэзная даліна, якую немцы перакрылі агнём і нас туды не пушчаюць. Нямецкія танкі здаля б'юць па адзінай на схіле дарозе. Пяхота, артылерыя — усё ў нас спынілася. Ды хутка з'явіўся нейкі генерал у камбінезоне, але з генеральскай фуражкай на галаве, і якраз налез на нашую батарэю. «А вы чаго тут тарчыце? Ану вперод!» І пагнаў батарэю па адхоне ўніз, туды, дзе немцы. «Студэбекеры» з гарматамі неяк праскочылі, і мы хуценька за кусцікамі пачалі акопвацца. Іншых, што ехалі за намі, немцы не пусцілі, спалілі некалькі машын, і болей ніхто праз іх агонь не праскочыў. Пра тое, што мы адкрытыя для сваіх, мы не клапаціліся. А ведаеш, як на вайне бывае? Розных часцей зашмат, нашыя ў палку, скажам, ведаюць, дзе іхнія астатнія, а іншыя могуць і не ведаць. І нейкія мінамётчыкі, якіх спрытны генерал змусіў хутчэй адкрыць агонь, агонь і адкрылі. Па нас, канечне. Толькі я з салдатам выкапалі ровік па калена, як тыя пачалі смаліць. Міны кучна клаліся якраз абапал. І, відаць, накрылі б, калі б не найшла вясновая хмарка і не паліў дождж... Я выскачыў з ровіка: «Давайце за машынай і хутчэй адсюль». Але куды, наперадзе ж немцы? А хоць да чорта ў зубы... Трохі некуды ад'ехалі, за нейкія кусцікі, ад якіх было бліжэй да немцаў, чым да сваіх, і тым ураталіся. Пад носам у немцаў стала спакайней.

Ну, а пасля падцягнулася болей войска, пачалося планамернае наступленне і баі. Баі за кожны пагорак і кожнае паселішча. Ды ўжо ў горнай мясцовасці. Адчувалася хуткае скканчэнне вайны, дух быў бадзёры. Помню, дзень біліся за нейкую вёску, не маглі ўзяць, тады аднекуль з іншага ўчастка перакінулі самаходны полк. Гэта 76-мм самаходкі, якіх на вайне таксама звалі «бывай, радзіма». Во яны праходзяць міма, у адной ззаду (зад у іх адкрыты) стаіць бравага выгляду камандзір, вусаты, у танкавым шлеме, і гойкае нам: «Упярод, пушкары, годзе пузам зямлю пахаць!» Што ж, давай упярод, калі ты гэткі спрытны. Вёску ўзялі, пяхота прайшла на той бок, мы следам, і каля мастка, гляджу, стаіць абгарэлая самаходка і з яе звісае на гусеніцы абгарэлы чалавек. Па недагарэлых вусах мы пазналі таго аптымістага.

Помняцца і яшчэ прыкрыя, а то і камічныя выпадкі. У Румыніі я першы раз захварэў на малярыю. Даволі паскудная хвароба, тым болей, што шпітальнага лячэння не вымагае. Зімой была перадышка, а вясной пачаліся прыступы. З пэўнай рэгулярнасцю — пад вечар або калі ўбачу ваду...

А.А.: Проста ўбачыш?

В.Б.: Убачу ставок, возера, рэчку.



Алесь Адамовіч і Васіль Быкаў. Мінск, Дом літаратара, 1987 г.

А.А.: Здалёк убачыш?

В.Б.: Хоць здалёк, хоць зблізку. Раптоўна здрыгаюся, і пачынаецца ліхаманка на некалькі гадзін. Аднойчы мы займалі пазіцыю на прамой наводцы ў полі. Трошкі далей і збоч ад агнявой раслі дрэўцы, нейкія кусцікі. Агонь не вялі, але немцы былі блізка. Мяне раптам затрэсла, і я адышоўся да тых дрэўцаў. Было цёпла, ужо зялёная траўка прабівалася. Як лёг, салдат наваліў на мяне нейкіх трафейных коўдраў, нямецкіх шынялёў — каб сагрэцца. Пасля, як крыху адпусціла, заснуў. А як прачнуўся, дык здзівіўся, што вакол дужа ціха. Высунуў галаву з-пад таго варахоб'я — ужо сцямнела. Але дзе гармата? На агнявой няма маёй гарматы. Але стаяць нейкія людзі і пазіраюць чамусьці не туды, куды заўжды пазіраюць на фронце — у бок праціўніка. Гэтыя пазіраюць назад. Я яшчэ прыгледзеўся і прыслухаўся — то ж немцы.

А.А.: Колькі метраў ад цябе?

В.Б.: Метраў? Во правільна ты пытаешся, колькі метраў — заўсёды, як кажуць, ключавое на вайне пытанне. Ну, тут, можа, метраў дваццаць.

А.А.: Ну, ты цікавы чалавек. Любы іншы аўтар даўно ўжо з такіх сваіх эмоцый пачаў бы пісаць.

В.Б.: Тут нічога дзіўнага. На фронце ў пяхоце ці там у супрацьтанкавай артылерыі такіх выпадкаў процьма. Але справа ў тым, што з пяхоты, апроч хіба В. Кандрацьева, у літаратуру ніхто не прыйшоў. Мабыць, не засталося. Усё лепшае, што напісана пра вайну з ліку яе ўдзельнікаў, канечне, належыць усё ж артылерыі. Мабыць, паводле традыцыі, распачатай артылерыстам Л. Талстым. А тут, пакуль я дрыжэў пад варахоб'ем, нашы драпанулі, гармату камбат загадаў адцягнуць ніжэй у сяло, а пра мяне забыліся. Таго салдата, што там мяне накрываў, паслалі па аўтамабіль, а іншыя не ўгледзелі... І я ўстаў...

А.А.: Як устаў? Яны ж глядзяць у твой бок.

В.Б.: Не, яны глядзяць на сяло, дзе ўжо нашы. І цёмна. Я бачу іх толькі на фоне неба.

А.А.: Сілуэты?

В.Б.: Іхнія сілуэты. Адзін у касцы, а другі, помню, у казаркастай шапцы. Вось... І я паўзком, на кукішках даў адтуль дзёру. Знайшоў сваіх, камбат пытаецца: дзе быў? У немцаў, кажу, быў. Пасмяяліся...

Усё ж ішоў сорак пяты, да перамогі заставався апошні месяц. А здарылася б тое раней на год ці паўгода, было б не да смеху. Як з тым нашым камандзірам узвода кіравання, які паранены пабратаўся з немцам. У Венгрыі, у час бою за нейкае сяло, надта бамбілі нямецкія смалёты, і гэты лейтэнант, паранены ў нагу, сунуўся ў нейкі скляпок на двары сялянскага падворку. Якраз змяркалася, і ў той скляпок сунуўся і яшчэ нехта, таксама паранены. Тады скончылася бамбёжка і наогул скончыўся бой. І во яны сядзяць удвох, але ў цемры не бачаць адзін аднаго і не ведаюць, хто побач — свой ці чужы. Для таго маўчаць. А галоўнае — не ведаюць, хто заняў сяло — нашы ці немцы. Ніхто першы не хоча адкрыцца, так мінула ноч. І толькі як пачало світаць, лейтэнант убачыў, што перад ім немец, оберлейтэнант медыцынскай службы. І ніхто з іх за пісталет не схапіўся, бо зноў жа — невядома, хто наверсе. Першы не стрываў немец, таксама паранены, неяк выбраўся, а лейтэнант сам выбрацца не можа. Сядзіць і чакае, калі прыйдуць немцы і возьмуць яго ў палон. Або прыстрэляць у яме. Немцы і прыйшлі. Але на ламанай рускай мове растлумачылі, што страляць не будуць, будуць рабіць арцліхер бейстанд (медыцынскую дапамогу). І выцягнулі лейтэнанта, занеслі яго ў медпункт, дзе той жа ягоны начлекнік перавязаў яго нагу і папытаўся, што ён хоча: да сваіх ці ў палон? Канечне, лейтэнант захацеў да сваіх, тады яго ўначы два немцы паклалі на палатку і падцягнулі да нашых акопаў на краі сяла. Праз паўгадзіны ён туды і зваліўся. Ну, адвезлі ў санбат, ляжыць там лейтэнант, яго перавязваюць, але ж дужа яму цікава з сваіх прыгодаў. І ноччу ціхенька ён расказаў пра тое суседу — што з ім тры дні таму здарылася. Падзівіліся трохі абодва. А яшчэ праз дзень прыйшоў незнаёмы афіцэр і сказаў, каб гэтага лейтэнанта тэрмінова падрыхтавалі да эвакуацыі. Аднаго. Болей яго ніхто ў палку не бачыў. І чутак нават ніякіх не дайшло.

Пасля той выпадак нейкім чынам паслужыў мне, калі я пісаў «Адну ноч». Хаця там іншы фон ды інакшы час. Але грамадства, а найперш нашая рэдактура не былі гатовыя прыняць падобныя тэмы, ад якіх патыхала непрыймальным для іх пацыфізмам. Тагачасны рэдактар «Полымя» Максім Танк адмовіў аўтару ў публікацыі таго апавядання з прычыны «невыразнасці», як ён напісаў, ідэі. Думаецца, ідэя была выразная, як надта выразнымі былі і партыйныя адносіны да яе.


Во ўжо гэтыя партыйна-кадэбоўскія адносіны!

...Тады ж у нейкім аўстрыйскім гарадку я сустрэў праўобраз сваёй будучай Джуліі. У гарадку тым, як зрэшты, і ў шмат якіх аўстрыйскіх гарадках, было шмат прыгнаных з усходу (ды і з захаду таксама) рабочых, што працавалі на аўстрыйскіх вайсковых заводах. Жылі яны ў вялізных даўгіх бараках, а як горад займала Чырвоная армія, разбягаліся хто куды. Вядома ж, кіруючы найперш на радзіму, калі тое было магчыма. Неяк мы сталі калонай машын з гарматамі на гарадской вуліцы, чакалі, пакуль начальства наперадзе штосьць вырашыць. І тады ля машын паявілася спрытненькая чарнавалосая дзяўчына ў паласатым убранні, якая нешта пыталася ў салдат. Аказваецца, пыталася нейкага Івана. Канечне, амаль з кожнага кузава ёй адгукаўся які-небудзь Іван, але дзяўчына ківала галавой — не... Тады я падышоў да яе і папытаўся, каго яна шукае. На кангламераце немецка-руска-італьянскіх слоў яна распавяла, што яе імя Джулія, яна італьянка і шукае рускага палоннага Івана, з якім летась разам уцякала з канцлагера. У гарах іх схапіла паліцыя, яе зноў кінулі ў канцлагер, а што сталася з Іванам, яна не ведае. Цяпер яна мае надзею знайсці яго сярод чырвонаармейцаў. Канечне, то была марная надзея. Але невялічкая тая гісторыя запомнілася мне, каб гадоў пра 20 зрабіцца «Альпійскай баладай».

А ў другім месцы, заняўшы агнявыя пазіцыі на гарадской ускраіне, мы пастукаліся ў дзверы бліжняга катэджа. Нам адчынілі адразу, на парозе стаяла маладая дзяўчына ў белым фартушку, якая спытала па-руску, што нам трэба? Тое нас дужа здзівіла, і мы ў сваю чаргу спыталі яе, ці яна руская? Так, быў адказ, яна руская. Але тут жыве гаспадзін прафесар, ён стары і просіць яго не турбаваць. Але хто такая яна і чаму тут? А яна з Днепрапятроўску і служыць у прафесара, які зусім цывільны чалавек і вельмі добра ставіцца да яе. Тое нас здзівіла яшчэ болей: гэтая зямлячка абараняе немца? І падобна, не збіраецца пускаць нас у гэты заможны катэдж. Тое ўжо абурала. Нехта з нас падвысіў голас, нехта схапіўся за пісталет. Тады мой сябра, таксама ўзводны Валька Бахцігозін, рашуча мовіў: «Стойце, адставіць!» Пайшлі назад... Мы пайшлі адтуль, знайшлі іншае прыстанішча, дзе нас ніхто не спыняў. Не запрашаў, але і не спыняў. Пасля я папытаўся ў Валькі, чаму ён стаў у абарону тае зямлячкі, і Валька сказаў, што ў Еўропе трэба паводзіць сябе як цывілізаваныя людзі, а не хцівыя азіяты. Тое мне запомнілася. Як і сам Валька, самы малады з нашых узводных, далёкі нашчадак польскіх ссыльных у Сібіры, родам з горада Ачынска, адзіны сын у матулі, якая ці не кожны дзень слала яму на фронт пранумараваныя лісты і прасіла яго рабіць таксама — яна працавала бухгалтаркай. Валя так не рабіў, хоць меў добрую натуру і любіў сваю маму. Начальства не любіла надта маладога і нейкага не характэрнага для ўзводных хлопца. А я любіў Валю. Пасля вайны з усіх нашых ветэранаў я найболыш хацеў адшукаць Валю Бахцігозіна, ды марна: малодшы лейтэнант Бахцігозін прапаў без следу...

Іншыя фрагменты гутаркі можна прачытаць у № 70 часопіса «Дзеяслоў».

Васьмірадкоўі



Мікола ГІЛЬ

***

Успаміны… І без вас мне сёння
Цяжка, і маркотна, і тужліва, —
Вы ж — нібыта сон благі, прыснёны
Неўспадзеў — трывожны і прымхлівы…

Мама мне, студэнту, у дарогу
Свой траяк апошні аддавала…
Чым аддзячыў? Памаліцца б Богу,
Ды — не ўмею… Час вучыў нядбала…

***

СССР, апошнія гады…
Гляджу кіно з слязамі на вачах:
Там быў шчаслівы я і малады…
І вось ён згінуў, разваліўся, спрах!

А розум кажа сэрцу, бы няўзнак:
Не плач і ў роспачы сябе не рві, —
Скончаецца ўсё менавіта так,
Што ўзрошчана на фальшы і крыві.

***

І ранкам, які дня ўсё не адкрые,
І ноччу, што бяссонне калыхала,
Не раз згадаўся мне радок Купалы, —
Як «у Піліпаўку воўк нема вые»…

І хай ваўчынага выцця не чую,
Каменнай клеткаю тут паланёны, —
Ды вусцішшу піліпаўскай — прыгнёны,
І аднаго — прыждаць вясны! — хачу я…

***

Не ведаю, мо й Боская ёсць кара,
Якой ніводзін грэшнік не мінае.
Ды кара ёсць, што й Боскае да пары:
Якою кожны сам сябе карае.

Часцей за ўсё карае у тым веку,
Калі прыходзіць час падбіць рахункі:
Паправіць анічога, недарэка,
Не можаш ты, хоць выверні ўсе шлункі!

***

Ты кажаш, можна заспяваць і з гора?
Наўрад! Дачушка весялосці — песня!
Душа і ў паняверцы — непакора,
Але для песні ў радасці ўваскрэсне.

І думка ўсё вярэдзіць, аж да болю:
Ніяк не ўспомню, мама каб спявала!
Няўжо ні разу і нідзе ніколі?
Няўжо адны турботы й гора знала?!

***

Што больш за ўсё гняце, атручвае жыццё?
Што люд наш прадзедаў
не збярог спадкі —
Нацыянальнае святое пачуццё, —
Ды і жыве гарохам анігадкі;

І што даводзіцца мне веку дажываць
Вось у такой балюча-горкай скрусе:
На Бацькаўшчыне — па Радзіме
сумаваць,
На Беларусі — жыць без Беларусі!..

***

Жыццё, лічы, я ў хлусні мадзеў,
З хлусні меў і свой кавалак хлеба:
Пісаў не так, як мог і хацеў, —
Змушаны быў пісаць, як трэба…

Даўно ўрабляюць ніву сыны,
Але й над імі ўсё тое ж неба:
Аруць не так, як маглі б яны,
Гэтак вымушаны — як трэба…

***

Не, мне не сорамна казаць, —
І паўтару сто раз! —
Што не хачу я паміраць,
Хоць, можа, ўжо і час;

Хоць дых сцінае, бы пятлёй,
Наш беларускі рай…
Пажыць бы, ўбачыць над зямлёй
Світанку небакрай!

***

Сэрца, сэрца, што ж ты, дружа,
Б'ешся гулка, ўразнабой?
Пэўна, шмат гадоў задужа
Ахвяроўвала сабой?

Вось і выбілася з сілы,
І якраз тады, калі
Хачу, Божа напрамілы,
Затрымацца на зямлі…

***

Дзяцей уласных разумеем мала,
І настальгуем па былых часінах:
Зямля-карміцелька сям'ю яднала,
Вучыў штодзённай працай бацька сына.

Парушаны, панішчаны дазвання
Жыцця нацыянальнага асновы:
Апошні чыннік блізкі да сканання,
Што лучыў з продкамі нашчадкаў — мова!..

***

«Мы дзялілі апельсін,
Многа нас, а ён — адзін!»
Два радкі — і ўсё пра час,
Што савецкім зваўся ў нас.

Што ж нашчадку скажа наш
Белараша шчасны час?
«Ён пакінуў па сабе
Аграгарадок «РБ»!»

***

Сябра мой, гадзіннік настольны,
Мне міжволі хлусіць штораз:
Яго датчык настроены
На Еўропы сярэдні час.

І штораз, як на лічбы гляну,
Думка скрухаю хвастане:
Па Грынвічу — абганяем,
Па ўсім астатнім — адстаем…

***

Мільгала думка й раней, як цяпер:
Быў промах зроблены пры дзяльбе —
Трэ было ахрысціцца зноў БНР,
А не няўклюдным імем — РБ.

Калі б запярэчыў хто: шляхта рэй
Вяла заўсёды ў дзяржаве ў нас, —
Дык жа й была яна народам хутчэй,
Прытым спрадвеку, як сведчыць час.

***

Жыццё — пражыта
Так ці не гэтак? —
Ўсё шыта-крыта,
Адзін паследак.

Адно пры гэтым
Хіба здзіўляе:
З якім імпэтам
Яно мінае!..

Нецалаваны, загавораны, вымалены…



Мікола ІЛЬЮЧЫК

…Апынуўся Алесь у самай гушчы падзей складаных, супярэчлівых, жахлівых і пакутлівых. Праз некалькі дзён пасля таго, як адступілі немцы, прыехалі ў іх палескую глуш два афіцэры Чырвонай Арміі. У той жа дзень Алесь, як і яшчэ два дзясяткі маладых хлопцаў, якім ледзьве споўнілася васямнаццаць, былі залічаныя ў вайсковую часць. А назаўтра ўсім навабранцам трэба было з'явіцца ў прызначаны час на чыгуначную станцыю.

Матуля плакала. Не магла стрымаць слёз і Алена. Як мог, суцяшаў іх. Маўляў, вайна заканчваецца. Немцы ўжо недзе за Віслай. А там — Берлін і перамога…

Праз два дні навабранцы апынуліся ў перасыльным лагеры. Сярод рэдкалесся пабудаваны дыхтоўныя бліндажы, узведзена некалькі намётаў з шэра-зялёнага брызенту. Гэта класы для тэарэтычных заняткаў. Намеснік камандзіра ўзвода сяржант Мамкееў казаў, што тут яны прабудуць тры, самае большае — чатыры тыдні. Перад адпраўкай на фронт іх трэба падвучыць сяму-таму, каб не сталі гарматным мясам. Яму яшчэ трэба з кімсьці Берлін браць. Мамкееў добры, на яго шырокім татарскім твары заўсёды ўсмешка. Расказвалі, што ён прайшоў усю вайну ад пачатку. Але аднойчы іх батальён трапіў у такі кацёл, што мала хто выжыў. Цяпер ён павінен падрыхтаваць папаўненне з гэтых жаўтаротых юнакоў.

Словы сяржанта балюча і прыкра разанулі слых. Алесю не хацелася стаць «гарматным мясам». Дома чакаюць бацькі. Ён у іх меншанькі. Ён павінен абавязкова вярнуцца, каб падтрымаць іх у старасці. Яго чакае Алена. Яны планавалі пабрацца шлюбам. Закаханыя марылі аб сваім доме, аб дзецях…

— Я вярнуся!

— Канечне ж, вернешся, — азваўся з цемры голас сяржанта Мамкеева, — але ж навошта так крычаць? Трэцяя гадзіна ночы толькі, а ты падняў узвод, нібыта па трывозе…

…Ну вось, нарэшце, дачакаліся. Назаўтра абвявілі: у складзе пяхотнага палка рухацца на захад. У раёне ракі Одэр патрэбна далучыцца да дзеючых падраздзяленняў. Раніцай прыехала калона навенькіх «студэбекераў». Раздалі зброю, пакармілі. І рушылі…

Жарты і вясёлыя гісторыі скончыліся пасля таго, як пачулі далёкую кананаду. Пасля разгрузкі за некалькі кіламетраў ад перадавой да калоны падышоў абоз з параненымі. Акрываўленыя бінты, скалечаныя целы нагадалі ўсім яшчэ раз, якая яна — сапраўдная вайна. Гэта няхай сабе і параненыя, але ацалелыя пасля фарсіравання Одэра. Яны будуць жыць. А колькі іх засталося там, па берагах гэтай ракі і ў яе шэрай, змрочнай вадзе?

— Ну што, шчаслівец, наперад! — прамовіў сяржант Мамкееў, па-сяброўску ляснуўшы Алеся па плячы.

Рота па пантоне перапраўлілася на другі бераг і заняла пазіцыю ў пакінутых немцамі акопах. Мабыць, раніцай будзе наступленне. Ротны загадаў падрыхтавацца і агледзецца. Спаць не давялося нікому. Яшчэ не прызвычаіліся да акопнага ладу жыцця, ды і час ад часу гучалі стрэлы.

На золку раздалі хлеб і бляшанкі з тушонкай. Чырвонае сонца толькі-толькі паказалася за пакатым берагам ракі. Алесь ведаў: там радзіма.

Побач нешта дзынкнула, і шчаку балюча секанула жвірам. Алесь не адразу зразумеў, што гэта варожы снайпер заняў сваю пазіцыю, і першы на сённяшні дзень свінцовы пасланец смерці ўжо шукае ахвяру.

— Пачынаецца, — незадаволена буркнуў Мамкееў, — а ты, хоць і шчаслівец, дарма галаву не падстаўляй.

Пранізлівы свіст і выбух. Адзін, другі, трэці… Мінамёты апрацоўвалі ўжо добра пераараную выбухамі лагчыну, усё бліжэй падступаючы да акопаў. Зусім блізка здрыганулася зямля. Захістаўся, але ўстаяў на нагах. Зазвінела ў вушах. Нібыта з далечыні, пачуў голас сяржанта Мамкеева:

— Бяжы на левы фланг, там ротны. Трэба атакаваць, бо паляжам пад мінамі ні за што ні пра што. Чаму няма ніякай каманды? Даведайся і хутка вяртайся!

Алесь пабег штомоцы, не зважаючы на выбухі. Спатыкнуўшыся аб раскіданыя скрыні, упаў, а падняўшы галаву, знерухомеў ад убачанага. На брудным снезе ляжалі часткі цел ягоных прыяцеляў. Толькі што ротныя весяльчакі снедалі, расказвалі-смяшылі. Варожая міна трапіла акурат у гэты вясёлы вір. Пара вілася над крывавым месівам… Ротнага ён знайшоў па лейтэнанцкіх зорках. Галава і тулава былі засыпаны чарназёмам…

«Назад, трэба бегчы назад, — падумаў Алесь, — да сяржанта Мамкеева. Няхай ён падымае байцоў у атаку».

…Сяржант глядзеў у неба чорнымі вачыма. Пасярод ілба — чорна-чырвоная адмеціна. Варожы снайпер нарэшце паправіў прыцэл.

— Рота! Пад'ём! У атаку! — штомоцы закрычаў Алесь. — Хлопцы! Наперад! Паляжам жа ўсе тут, калі не пойдзем!

Байцы пачалі ўзнімацца. Нерашуча выскачылі з акопа. Нехта спачатку нясмела, а потым ва ўсю моц зароў: «Ура-а-а!» Застракаталі аўтаматы. Злева і справа заварушыліся суседнія падраздзяленні. Мінамёты рвалі апусцелыя ўжо акопы. Свіст і разрывы былі ўсё радзейшымі, а праз нейкі час заціхлі…

Той першы бой Алесь узгадвае часта. Часам прысніцца і свіст куль, і выбухі. Прачнецца — і апаноўвае радасць, што жывы. Былі іншыя вышыні. Бо трапіў у самае пекла — вырашальны наступ на Берлін.

Пераможная вясна 45-га для Алеся не была надта радаснай. Амаль нікога не засталося з тых, з кім прызываўся. Дадому не адпусцілі, і гэта дадало суму. Сумавала і Алена, у лістах пісала, што хлопцы вяртаюцца з фронта. Хтосьці адразу ажаніўся і мала-памалу прызвычаіўся да мірнага жыцця. Многія, на жаль, не вярнуліся. Алесь жа апынуўся ў далёкім Азербайджане. На вялікай будоўлі ахоўвалі і канваіравалі да месца працы палонных. Толькі праз тры гады вярнуўся ў родную вёску.

Справілі вяселле. «Шчаслівая, — зайздросліва казалі Алене сяброўкі, — дачакалася». «Так, дачакалася, — сціпла адказвала яна і дадавала: — Вымаліла…»

Вялікі стол у дыхтоўнай хаце з прысмакамі і пачастункамі. Хутка пад'едуць, збяруцца ў бацькоўскай хаце сыны, дочкі, унукі і праўнукі — вялікая, дружная сям'я. Мінула 65 гадоў з таго дня, як справілі Алесь з Аленаю сваё вяселле. І сёння ўсе збяруцца зноў, каб павіншаваць. А пакуль яны ўдвух.

— Добра, што мы разам ад маладосці жылі і разам пастарэлі…

— Ну што ты, якое там пастарэлі, сягоння ж мы «маладыя»!

…У двары весела бразнулі веснічкі, пачуўся тупат ног і вясёлыя дзіцячыя галасы.

Пяць шчаслівых аблокаў



Роберт
ВАН ГУЛІК

Гэтая гісторыя адбываецца ў 663 г.н.э., калі суддзя Дзі толькі тыдзень праслужыў на сваёй першай незалежнай пасадзе — судзе ў Пэнлаі, аддаленай акрузе на паўночнай ускраіне Кітайскай імперыі. Адразу пасля прыбыцця на месца ён сутыкнуўся з трыма загадкавымі злачынствамі, апісанымі ў аповесці «Суддзя Дзі і золата Будды», дзе згадваецца пра росквіт суднабудаўнічай галіны ў Пэнлаі і пра пана І Пэна, багатага суднаўласніка. Апавяданне «Пяць шчаслівых аблокаў» пачынаецца ў кабінеце суддзі Дзі, дзе чыноўнік разам з І Пэнам і іншымі толькі што скончыў доўгія спрэчкі вакол прапановы ўсталяваць над суднабудаўніцтвам дзяржаўны кантроль.

— Што ж, панове, — з задаволенай усмешкай сказаў тром сваім гасцям суддзя Дзі, — думаю, пытанне вырашанае.

Абмеркаванне пачалося ў яго кабінеце каля другой, а цяпер закончылася пятая. Суддзя тым не менш думаў, што час прайшоў не дарэмна.

— Накіданыя намі правілы ахопліваюць, здаецца, усе магчымыя абставіны, — выразным голасам зазначыў пан Хо. Гэты сціпла апрануты мужчына сярэдніх гадоў быў сакратаром міністра юстыцыі ў адстаўцы. Зірнуўшы на Хуа Міня, багатага суднаўладальніка, які сядзеў ад яго справа, ён дадаў: — Пане Хуа, вы згодныя, што наш праект дазваляе справядліва ўлагодзіць усе непаразуменні паміж вамі і прысутным тут вашым таварышам панам І Пэнам?

Хуа Мінь скрывіўся.

— Справядлівасць — добрае слова, — суха сказаў ён, — але як гандляр я аддаю перавагу слову «выгада»! Калі б мне далі магчымасць свабодна канкураваць з маім сябрам панам І, вынік справядлівым вы б, можа, і не назвалі, не... Але ён мог бы зрабіцца надзвычай выгадным — для мяне!

— Ад будаўніцтва суднаў залежыць нашая берагавая абарона, — строга сказаў суддзя Дзі, — а таму ўлады нашае Імперыі манаполіі тут не дазволяць. Мы ўвесь дзень прасядзелі над гэтай праблемай і дзякуючы каштоўным парадам пана Хо выпрацавалі ўрэшце гэты дакумент, дакладна вызначыўшы ўсе ў ім правілы, якімі мусяць кіравацца суднаўладальнікі. Цяпер я чакаю, што вы абодва будзеце іх прытрымлівацца.

Пан І Пэн марудна кіўнуў. Суддзю падабаўся гэты кемны, але шчыры дзялок. Да пана Хуа ён ставіўся горш, бо ведаў, што той не цураецца сумнеўных здзелак і часта трапляе ў непрыемныя гісторыі з жанчынамі. Суддзя Дзі падаў службоўцу знак напоўніць кубкі гарбатай і адкінуўся ў крэсле. Дзень быў гарачы, але цяпер з мора падзьмуў прахалодны брыз, які прынёс у маленькі пакой водар расквітнелай пад акном магноліі.

Пан І паставіў кубак і запытальным поглядам абвёў Хо і Хуа Міня. Самы час разыходзіцца.

Раптам дзверы адчыніліся і ўвайшоў радца Хун, даўняя даверaная асоба суддзі Дзі. Ён наблізіўся да стала і сказаў:

— Пана суддзю чакаюць з тэрміновай навіной.

Суддзя Дзі злавіў яго погляд.

— Прашу мне на хвілінку прабачыць, — сказаў ён тром гасцям і разам з радцам пакінуў пакой.

Калі яны апынуліся ў калідоры, Хун ціхім голасам сказаў:

— Прыйшоў аканом пана Хо, каб паведаміць гаспадару, што пані Хо здзейсніла самагубства.

— Усёмагутныя нябёсы! — усклікнуў суддзя. — Скажы, хай пачакае. Будзе лепш, калі я сам перадам пану Хо гэтую кепскую навіну. Як яна гэта зрабіла?

— Павесілася, пане суддзя. У садовай альтанцы, падчас паабедзеннага адпачынку. Аканом адразу ж прыбег сюды.

— Якая бяда для пана Хо! Ён мне падабаецца. Трохі сухаваты, але вельмі добрасумленны. І таленавіты законнік.

Ён сумна пахітаў галавой і вярнуўся ў кабінет. Сеўшы за свой стол, ён з журбой у голасе звярнуўся да Хо:

— Прыйшоў ваш аканом, пане Хо. Ён прынёс жахлівую навіну пра пані Хо.

Хо схапіўся за ручкі крэсла:

— Пра маю жонку?

— Відаць, яна скончыла жыццё самагубствам, пане Хо.

Пан Хо напалову падняўся, але потым зноў зваліўся ў крэсла. Бясколерным голасам ён сказаў:

— Вось мае страхі і спраўдзіліся... Апошнія тыдні яна... яна была вельмі прыгнечаная, — ён правёў рукамі па вачах і спытаў: — Як... як гэта адбылося, пане суддзя?..

— Ваш аканом паведаміў, што яна павесілася. Ён чакае ўнізе, каб забраць вас дадому, пане Хо. Я адпраўлю разам з вамі судовага лекара выпісаць пасведчанне пра смерць. Вы, канечне ж, хочаце як мага хутчэй разабрацца з фармальнасцямі...

Здавалася, што пан Хо яго нават не чуе.

— Памерла! — мармытаў ён. — Усяго праз некалькі гадзінаў, як я сышоў! Што мне рабіць?

— Безумоўна, мы дапаможам вам, пане Хо, — паспрабаваў падтрымаць яго Хуа Мінь і дадаў некалькі спачувальных словаў, да якіх далучыўся І Пэн. Але здавалася, што Хо іх нават не чуе. З перакрыўленым тварам ён углядаўся ў пустату. Раптам ён паглядзеў на суддзю і пасля нядоўгага вагання сказаў:

— Пане суддзя, мне трэба трохі часу... Я не хачу злоўжываць дабрынёй пана, але... Ці можа хтосьці выканаць фармальнасці ад майго імя? Тады я вярнуся дадому пасля... пасля ўскрыцця, калі мёртвае цела ўжо...

Голас Хо абарваўся, і законнік з мальбой у вачах зірнуў на суддзю.

— Канечне, пане Хо! — імгненна адазваўся суддзя Дзі. — Вы застанецеся тут і выпіце яшчэ кубак гарбаты. Я сам адпраўлюся з судовым лекарам у ваш дом і загадаю падрыхтаваць часовую труну. Гэта найменшае, што я магу для вас зрабіць. Вы ніколі не адмаўлялі мне ў сваёй каштоўнай парадзе і прысвяцілі сёння ўвесь час паабедзеннага адпачынку справам нашага суду. Не, пане Хо, я настойваю! Вы ж, панове, прыглядзіце за нашым сябрам. Я вярнуся праз паўгадзінкі ці каля таго.

На дварэ ўжо чакаў радца Хун. Побач з ім стаяў поўны чалавечак з казлінай барodкай, якога Хун прадставіў як аканома пана Хо.

— Я ўсё ўжо паведаміў пану Хо, — звярнуўся да аканома суддзя. — А цяпер вяртайся дадому. Хутка я далучуся.

Потым суддзя павярнуўся да радцы Хуна:

— Табе лепш вярнуцца ў суд, Хун, і разабрацца з паперамі, якія прыйшлі. Потым мы яшчэ раз прагледзім іх разам. Дзе мае памочнікі?

— Ма Чжун і Цяо Тай, пане, муштруюць на галоўным двары вартаўнікоў.

— Добра. У дом пана Хо я вазьму з сабой толькі начальніка варты і двух яго людзей. Яны пакладуць мёртвае цела ў труну. Калі Ма Чжун і Цяо Тай скончаць з муштроўкай, то могуць ісці адпачываць — вечарам яны мне не спатрэбяцца. Давай сюды лекара і загадай падрыхтаваць судовы паланкін!

Тоўсты аканом чакаў суддзю ў маленькім дворыку перад сціплым домам пана Хо. Ля вартоўні тапталіся дзве служанкі з пачырванелымі вачыма. Начальнік варты дапамог суддзю Дзі выйсці з паланкіна. Суддзя загадаў яму застацца з двума вартаўнікамі ў двары і потым папрасіў аканома адвесці іх з лекарам у альтанку.

Адкрытай галерэяй, якая атачала ўвесь дом, таўсцяк вывеў іх у велізарны сад, вакол якога ўзвышаліся высокія муры. Прайшоўшы дагледжанай сцяжынкай, што вілася сярод расквечаных кустоў, яны апынуліся ў самай зацішнай частцы сада, дзе ў цяню двух высокіх дубоў стаяла васьмікутная альтанка, пабудаваная на круглай цаглянай аснове. Выкладзены зялёнай дахоўкай спічасты дах заканчваўся пазалочанай сферай, а калоны і мудрагелістыя кра́ты на вокнах былі пакрытыя ярка-чырвоным лакам. Суддзя падняўся па чатырох мармуровых прыступках і расчыніў дзверы.

У маленькім, але высокім пакойчыку было горача, і ў застаялым паветры вісеў рэзкі дзіўны водар. Вочы суддзі Дзі адразу ж спыніліся на бамбукавай канапцы, якая стаяла ля правай сцяны. На канапцы ляжала нерухомая жаночая фігура. Яе твар быў павернуты да сцяны, і суддзя бачыў толькі густыя пасмы бліскучых валасоў, што рассыпаліся па мёртвых плячах. Жанчына была апранутая ў летняе ўбранне з белага ядвабу, на маленькіх ножках — белыя атласныя пантофлікі. Паварочваючыся да судовага лекара, суддзя сказаў:

— Што ж, бярыся за справу і агледзь цела, пакуль я падрыхтую пасведчанне пра смерць. Аканом, адчыні вокны, тут надта душна.

Чыноўнік дастаў з рукава афіцыйны бланк, паклаў яго на стале ля дзвярэй і потым лянотна агледзеў пакой. У цэнтры разнога стала, зробленага з ружовага дрэва, стаяў гарбатны паднос і два кубачкі. Вялікі гарбатнік перавярнуўся і ляжаў у пляскатай латуннай скрыні. Побач з ім ляжала чырвоная аксамітная вяроўка. Ля стала мясціліся два крэслы з высокімі спінкамі. Апроч дзвюх бамбукавых паліцаў з кнігамі і некалькімі прыгожымі дробязямі мэблі ў пакоі больш не было. Верхнюю частку сценаў пакрывалі драўляныя дошкі з вершамі знакамітых паэтаў. Усё ў ціхім пакоі сведчыла пра вытанчаны густ.

Калі аканом расчыніў апошняе акно, ён падышоў да суддзі і паказаў на тоўстыя, пафарбаваныя чырвоным лакам бэлькі, якія перасякалі купалападобную столь. На цэнтральнай бэльцы вісеў абрывак чырвонай вяроўкі.

— Калі мы са служанкай увайшлі, пане, яна вісела тут.

Суддзя Дзі кіўнуў.

— Сёння раніцай пані Хо была расстроеная?

— Не, пане, падчас абеду настрой у яе быў цудоўны. Аднак калі да гаспадара зазірнуў пан Хуа Мінь, яна...

— Ты сказаў: Хуа Мінь? Навошта ён сюды прыходзіў? Сёння ўдзень ён мусіў сустрэцца з панам Хо ў маім кабінеце!

Аканом збянтэжыўся. Трохі павагаўшыся, ён адказаў:

— Калі ў гасцёўні я падаваў двум панам гарбату, я не мог не пачуць урывак з іх размовы. Як я зразумеў, пан Хуа хацеў, каб мой гаспадар даў сёння пану суддзю выгадную для яго параду. Ён нават прапанаваў гаспадару прыстойную э-э-э... узнагароду. Безумоўна, мой гаспадар абурана адмовіўся...

Тут да суддзі падышоў лекар:

— Я хацеў бы паказаць пану нешта вельмі дзіўнае!

Адчуўшы ў голасе лекара трывожную інтанацыю, суддзя коратка загадаў аканому:

— Прывядзі сюды служанку пані Хо!

Пасля ён падышоў да канапы. Лекар павярнуў твар мёртвай жанчыны: нягледзячы на жахлівую агонію, якая сказіла яе твар, было бачна, што пані Хо была прыгажуняй. Суддзя даў ёй каля трыццаці гадоў. Судовы лекар адкінуў убок яе валасы і паказаў чыноўніку на левай скроні вялізны сіняк.

— Гэта першае, што мяне турбуе, пане суддзя, — ціха сказаў ён. — І другое — жанчына памерла ад удушэння, але ніводзін з шыйных пазванкоў не ссунуўся. Я памераў даўжыню вяроўкі, што звісае з бэлькі, пятлі, якая ляжыць на стале, і рост самой памерлай. Лёгка зразумець, як яна гэта зрабіла. Яна стала на гэтае крэсла, з яго — на стол. Потым перакінула праз бэльку вяроўку, зрабіла зашмаргу і замацавала сваю прыладу смерці. Потым завязала на другім канцы вяроўкі пятлю, надзела яе на шыю і скочыла са стала, перавярнуўшы гарбатнік. Калі яна павісла, ступакі апынуліся ўсяго ў некалькіх цалях ад падлогі. Пятля марудна душыла жанчыну, але шыя не зламалася. І вось я дзіўлюся, чаму яна не паставіла на стол другое крэсла, каб скочыць з большай вышыні. У такім выпадку яна зламала б шыю і памерла б імгненна. Калі дадаць сюды сіняк на скроні...

Не скончыўшы сказ, лекар шматзначна зірнуў на суддзю.

— Маеш рацыю, — пагадзіўся суддзя Дзі.

Ён узяў са стала бланк і паклаў яго назад у рукаў. Адны нябёсы ведаюць, калі ён зможа падпісаць гэтае пасведчанне пра смерць! Чыноўнік уздыхнуў і спытаў:

— Што наконт часу смерці?

— Цяжка сказаць, пане суддзя. Цела ўсё яшчэ цёплае і канцавіны не пачалі дранцвець. Але ў такой гарачыні ды ў зачыненым пакоі...

Суддзя безуважліва кіўнуў. Ён глядзеў на латунную скрыню, зробленую ў форме пяцівугольніка з закругленымі вугламі, дыяметрам трохі большым за адзін чы і ў адну цалю вышынёй. Латуннае вечка прарэзваў узор, які ўяўляў сабой пяць звязаных паміж сабой спіраляў. Праз яго было добра бачна, што скрыня да верху запоўненая нейкім карычневым парашком.

Лекар таксама зірнуў на скрыню.

— Гэта гадзіннік-курыльніца, — зазначыў ён.

— Так, гэта менавіта ён. Прарэзаны на вечку ўзор — гэта пяць шчаслівых аблокаў, кожнае з якіх выяўленае ў выглядзе спіралі. Калі запаліць духмянае рэчыва ў пачатку ўзору, яно будзе марудна гарэць, рухаючыся спіралямі, якія выконваюць тут ролю кнота. Глядзі, вадкасць з носіка перавернутага гарбатніка пралілася ў цэнтр трэцяй спіралі, пагасіўшы духмянасць акурат на сярэдзіне яе шляху. Калі мы дакладна даведаемся, калі запалілі курыльніцу і колькі часу патрэбна для таго, каб агонь дайшоў да сярэдзіны трэцяй спіралі, мы зможам выявіць прыблізны час самагубства. Ці прынамсі...

Тут суддзя замоўчаў, бо ў пакой увайшоў аканом, якога суправаджала мажная жанчына гадоў пяцідзесяці ў ахайнай карычневай сукенцы. На яе круглым твары ўсё яшчэ віднеліся сляды слёз. Убачыўшы на канапе застылую фігуру, яна зноў расплакалася.

— Колькі яна праслужыла пані Хо? — спытаў суддзя Дзі ў аканома.

— Больш за дваццаць гадоў, пане суддзя. Яна належала сям'і пані Хо, і калі тры гады таму пан Хо ажаніўся, пераехала да яго разам з ёй. Яна не надта разумная, але вельмі добрая жанчына. Гаспадыня вельмі яе любіла.

— Супакойся! — звярнуўся суддзя да служанкі. — Я разумею, што для цябе гэта страшнае няшчасце, але чым хутчэй ты адкажаш на некалькі пытанняў, тым хутчэй мы зможам годным чынам пакласці цела ў труну. Скажы, ты бачыла гэтую курыльніцу раней?

Служанка выцерла твар рукавом і абыякава адказала:

Працяг на стр. 20 (12)

Пяць шчаслівых аблокаў

Працяг.
Пачатак на стр. 19 (11)

— Безумоўна, пане. Яна гарыць роўна пяць гадзінаў, па гадзіне на кожную спіраль. Калі я пакідала пакой, гаспадыня паскардзілася на затхлае паветра, і я запаліла духмянасць.

— Колькі тады было часу?

— Амаль дзве гадзіны, пане.

— Гэта быў апошні раз, калі ты бачыла сваю гаспадыню жывой?

— Так, пане. Калі пан Хуа размаўляў з гаспадаром у гасцёўні, я прывяла гаспадыню сюды. Хутка пасля гэтага ў альтанку зазірнуў гаспадар, каб праверыць, ці добра пані ўладкавалася для паабедзеннага адпачынку. Яна папрасіла мяне наліць два кубкі гарбаты і дадала, што да пяці гадзінаў я ёй не патрэбная і магу таксама трошкі паспаць. Яна заўсёды была такой уважлівай! Я вярнулася ў дом і сказала аканому падрыхтаваць у галоўнай спальні новае шэрае ўбранне гаспадара для сустрэчы ў судзе. Потым прыйшоў і сам гаспадар. Калі аканом дапамог яму пераапрануцца, гаспадар сказаў мне паклікаць пана Хуа, і яны разам пакінулі дом.

— Дзе быў пан Хуа?

— Я знайшла яго ў садзе, пане, дзе ён захапляўся кветкамі.

— Усё правільна, — сказаў аканом. — Пасля размовы ў гасцёўні, пра якую я пану суддзю ўжо расказаў, гаспадар папрасіў пана Хуа на хвілінку яму прабачыць і пайшоў развітацца з пані Хо ў альтанцы і пераапрануцца. Пан Хуа, відаць, у гасцёўні засумаваў, а таму выйшаў на двор, каб зірнуць на сад.

— Зразумела. Хто першы знайшоў цела, ты ці служанка?

— Я, пане, — адказала служанка. — Я прыйшла сюды трошкі раней за пяць і тут... і ўбачыла, што яна вісіць... на той бэльцы. Я выбегла на двор і паклікала аканома.

— Я адразу ж стаў на крэсла, — працягнуў аканом, — і абрэзаў вяроўку, а служанка ў гэты час абхапіла цела рукамі. Я зняў з яе шыі пятлю, і мы перанеслі гаспадыню на канапу. Пані не дыхала, і яе сэрца не білася. Мы спрабавалі вярнуць яе да жыцця, з усяе моцы расціраючы цела, але было запозна. Я паспяшаўся ў суд, каб паведаміць гаспадару пра бяду. Калі б толькі я знайшоў яе раней...

— Ты зрабіў усё, што мог, аканом. А цяпер глядзі — ты сказаў мне, што за абедам пані Хо была ў добрым настроі, пакуль не прыйшоў пан Хуа, правільна?

— Так, пане. Калі пані Хо пачула, як я паведамляю гаспадару пра візіт пана Хуа, яна адразу ж пабялела і сышла ў бакавы пакой. Я бачыў, што яна...

— Ты, відаць, памыліўся! — злосна перарвала яго служанка. — Я суправаджала яе з бакавога пакоя ў альтанку і зусім не заўважыла, што яна знiякавела.

Аканом збіраўся ўжо гнеўна ёй запярэчыць, але суддзя Дзі даў яму знак маўчаць і коратка сказаў:

— Ідзі да вартоўні і распытай брамніка, хто і з якой мэтай прыходзіў сюды пасля выхаду гаспадара і пана Хуа, а таксама як доўга тут заставаўся. І паспяшайся!



Аканом тут жа знік з вачэй, і суддзя Дзі прысеў на крэсла. Марудна і маўкліва пагладжваючы бакенбарды, ён разглядаў жанчыну, якая з апушчанымі вачыма стаяла перад ім. Урэшце сказаў:

— Твая гаспадыня памерла, і цяпер твой абавязак расказаць усё, што можа дапамагчы знайсці чалавека, які наўпрост ці ўскосна спрычыніўся да яе смерці. Расказвай, чаму яе знерваваў прыход пана Хуа?

Служанка кінула на яго спалоханы погляд. Зусім іншым голасам яна адказала:

— Я праўда не ведаю, пане! Я ведаю толькі тое, што за два апошнія тыдні яна двойчы наведвала пана Хуа, нічога не кажучы гаспадару. Я хацела пайсці разам з ёй, але пан Фан сказаў... — раптам яна замаўчала, пачырванеўшы і сярдзіта закусіўшы губу.

— Хто такі пан Фан? — рэзка спытаў суддзя Дзі.

Служанка хвілінку вагалася, і яе лоб перарэзала глыбокая зморшчына. Потым яна паціснула плячыма і сказала:

— Што ж, праўда ўсё адно выйдзе вонкі, ды яны нічога кепскага і не рабілі! Пан Фан — гэта мастак, пане, бедны і вельмі хворы. Ён жыў у хацінцы непадалёк ад нашага дому. Шэсць гадоў таму бацька мае гаспадыні, прэфект у адстаўцы, наняў пана Фана вучыць маю гаспадыню маляваць кветкі. Тады ёй было толькі дваццаць два, а ён быў такі прыгожы малады мужчына... Няма нічога дзіўнага, што яны закахаліся адно ў аднаго. Пане суддзя, пан Фан — такі цудоўны чалавек, і яго бацька быў вядомым навукоўцам. Але ён страціў усе свае грошы і...

— Гэта не мае значэння! Яны былі каханкамі?

Служанка энергічна захітала галавой і хутка адказала:

— Не, пане, ніколі! Пан Фан збіраўся папрасіць каго-небудзь пагаварыць са старым прэфектам наконт вяселля. Ён і праўда быў адчайна бедны, але паходзіў з такой слаўнай сям'і, што мог спадзявацца на згоду. Аднак раптам здароўе пана Фана рэзка пагоршала. Ён параіўся з лекарам, які сказаў, што пан Фан пакутуе на невылечную хваробу лёгкіх і памрэ маладым... Пан Фан сказаў маёй гаспадыні, што яны ніколі не ажэняцца і што іх каханне — гэта мімалётны вясновы сон. Ён хацеў з'ехаць ад яе як мага далей. Але яна маліла яго застацца з ёй, кажучы, што яны могуць проста сябраваць і яна хоча быць побач, калі здароўе яго зусім пагоршыцца...

— Яны працягвалі сустракацца, калі пан Хо ажаніўся з тваёй гаспадыняй?

— Так, пане. Яны сустракаліся тут, у альтанцы, але толькі ўдзень, і я заўсёды была з імі. Клянуся, пане, што ён ніколі да яе нават не дакрануўся!

— Ці ведаў пра гэтыя візіты пан Хо?

— Безумоўна, не! Мы чакалі, калі гаспадар з'едзе на цэлы дзень, і тады я перадавала пану Фану цыдулку ад мае гаспадыні. Праз веснічкі ён праслізгваў у сад і ў гэтай альтанцы выпіваў з гаспадыняй кубачак гарбаты. Я ведаю, што апошнія тры гады, калі мая гаспадыня выйшла замуж, пан Фан толькі гэтымі выпадковымі сустрэчамі і жыў. Яе гэтыя размовы так радавалі! А я заўсёды была побач...

— Ты патурала яе таемным спатканням, — жорстка сказаў суддзя Дзі, — а можа, нават забойству! Бо твая гаспадыня не скончыла жыццё самагубствам — яе забілі! А палове пятай, калі быць дакладным.

— Але пане суддзя, пры чым тут пан Фан? — застагнала служанка.

— Гэта я і збіраюся высветліць, — сурова сказаў суддзя і павярнуўся да лекара. — А цяпер хадзем да вартоўні!

Начальнік варты і двое яго людзей сядзелі на каменнай лаўцы ў двары перад домам. Калі яны ўбачылі суддзю, то тут жа ўскочылі, і начальнік, аддаўшы суддзю знакі пашаны, спытаў:

— Магу я, пане, загадаць сваім людзям прынесці часовую труну?

— Не, пакуль яшчэ не, — панура адказаў суддзя і пайшоў далей.

У вартоўні нізенькі аканом кляў сухарлявага дзядка ў доўгім белым убранні так, што вяла трава. Праз акно за імі назіралі два кулі — насільшчыкі паланкіна — і ўхмыляліся, відавочна радуючыся забаве.

— Пане суддзя, гэты чалавек сцвярджае, што ў дом ніхто не заходзіў, — гнеўна сказаў аканом. — Але стары дурань прызнаўся, што паміж трыма і чатырма ён трохі задрамаў. Якая ганьба!

Не зважаючы на яго абурэнне, суддзя раптам спытаў:

— Ты ведаеш мастака Фана?

Здзіўлены аканом пахітаў галавой, аднак тут адгукнуўся старэйшы кулі:

— Вашая правялебнасць, я ведаю пана Фана! Ён часта купляе ў майго бацькі місу локшыны, тут, у латку за рогам. Ён здымае гарышча над бакалейнай крамкай за гэтым домам. Я бачыў, як ён стаяў ля нашай садовай брамы каля гадзіну таму.

Суддзя Дзі павярнуўся да лекара і сказаў:

— Хай гэты кулі праводзіць цябе да жытла пана Фана. Прывядзі яго сюды. Але ніякім чынам не згадвай пра смерць пані Хо!

Потым суддзя павярнуўся да аканома і загадаў:

— Адвядзі мяне ў гасцёўню. Там я сустрэнуся з панам Фанам.

Гасцёўня падалася зусім маленькай, аднак сціплая мэбля ў ёй была найвышэйшай якасці. Аканом прапанаваў суддзю зручны фатэль ля стала, наліў кубачак гарбаты і асцярожна знік.

Марудна пацягваючы гарбату, суддзя Дзі задаволена падумаў пра тое, што след забойцы знойдзены. Ён спадзяваўся, што лекар застане мастака дома, і яго можна будзе адразу ж дапытаць.

Судовы лекар вярнуўся нават раней, чым суддзя яго чакаў, і прывёў з сабой высокага худога мужчыну гадоў трыццаці, апранутага ў зношаную, але чыстую сінюю кашулю, падперазаную чорным бавоўняным пасам. У новапрыбылага быў вытанчаны твар з кароткімі чорнымі вусікамі. Некалькі пасмаў выбівалася з-пад чорнай выцвілай шапачкі. Суддзя зірнуў на яго вялікія, занадта бліскучыя вочы і на запалыя шчокі з чырвонымі плямамі. Потым запрасіў сесці на крэсла з другога боку стала. Лекар наліў госцю гарбаты і застаўся стаяць за яго спінай.

— Я чуў пра вашыя працы, пане Фан, — прыязна пачаў суддзя, — і даўно хацеў з вамі пазнаёміцца.

Мастак доўгай пачуццёвай далонню паправіў кашулю і голасам, які выдаваў адукаванага чалавека, адказаў:

— Цікавасць пана вельмі мяне цешыць. Тым не менш цяжка паверыць, што пан суддзя тэрмінова запрасіў мяне сюды, у дом пана Хо, толькі дзеля прыемнае размовы пра мастацтва.

— Безумоўна, не ў першую чаргу. У гэтым садзе, пане Фан, здарылася няшчасце, і я шукаю сведак.

Фан выпрастаўся на крэсле і ўстрывожана спытаў:

— Якое няшчасце? Спадзяюся, не з пані Хо?

— Менавіта з ёй, пане Фан. Гэта адбылося ў альтанцы паміж чатырма і пяццю. У гэты час вы да яе заходзілі.

— Што з ёй здарылася? — выкрыкнуў мастак.

— Адказ вы павінныя ведаць самі! — холадна адказаў суддзя Дзі. — Бо гэта вы яе забілі!

— Яна памерла! — і Фан схаваў далонямі твар. Вузкія плечы мастака затрэсліся. Аднак праз некаторы час ён зноў узяў сябе ў рукі, зірнуў на суддзю і стрыманым голасам спытаў:

— Ці можа пан ласкава патлумачыць, навошта мне забіваць жанчыну, якую я кахаў больш за ўсё ў жыцці?

— Вы баяліся выкрыцця. Пасля вяселля вы працягвалі навязваць ёй сваю ўвагу, яна ад вас стамілася і сказала, што калі вы не скончыце свае візіты, яна паскардзіцца мужу. Сёння вы горача паспрачаліся, і вы яе забілі.

Мастак марудна кіўнуў.

— Усё правільна, — пакорліва сказаў ён, — такое тлумачэнне, мабыць, вельмі праўдападобнае. Бо ў згаданы панам час я і праўда быў у гэтым садзе.

— Яна ведала, што вы прыйдзеце?

— Ведала. Сёння ранкам вулічны хлопчык прынёс мне ад яе цыдулку. У ёй было напісана, што нам тэрмінова трэба сустрэцца. Я мусіў прыйсці да садовай брамы каля паловы пятай і, як заўсёды, пастукаць чатыры разы, каб служанка мяне ўпусціла.

— Што было пасля таго, як вы ўвайшлі ў сад?

— Я туды не ўвайшоў. Я грукаў некалькі разоў, але ніхто не адчыніў. Тады я трошкі пабадзяўся, зрабіў яшчэ некалькі марных спробаў трапіць у сад і ўрэшце адправіўся дадому.

— Пакажыце мне цыдулку!

— Не магу, бо я яе знішчыў. Гэта была яе просьба.

— Дык вы адмаўляеце, што забілі яе?

— Калі пан суддзя ўпэўнены, што сапраўднага злачынцу знайсці не атрымаецца, — паціснуў плячыма Фан, — то я ахвотна прызнаюся ў забойстве, каб дапамагчы пану закрыць справу. Я ў любым разе хутка памру — а адбудзецца гэта ў ложку ці на эшафоце, мне ўсё адно. Яе смерць пазбавіла маё вартае жалю жыццё апошняга сэнсу, бо другое маё каханне — мастацтва — даўным-даўно мне здрадзіла. Відаць, мае творчыя сілы падарвала працяглая хвароба. Аднак калі ў пана ёсць магчымасць высачыць сапраўднага забойцу, які перарваў жыццё гэтай нявіннай жанчыны, то я не бачу ніякіх прычынаў збіваць пана з панталыку і прызнавацца ў злачынстве, якога я не здзяйсняў.

Суддзя Дзі зірнуў на мастака і задумена тузануў свой вус.

— Пані Хо заўсёды перадавала вам цыдулкі праз вулічных хлопчыкаў?

— Не, пане. Звычайна іх прыносіла яе служанка. Сёння мяне першы раз папрасілі знішчыць пасланне, аднак я ўпэўнены, што

напісала яго яна, бо добра ведаю яе стыль і почырк, — тут яго словы перарваліся страшэнным прыступам кашлю. Мастак вырцер вусны папяровай насоўкай, абыякава зірнуў на крывавыя плямы і працягнуў. — Не ўяўляю, якое тэрміновае пытанне яна хацела абмеркаваць. І хто мог жадаць ёй смерці? Я ведаю і яе, і яе сям'ю больш, чым дзесяць гадоў, і магу пана ўпэўніць, што ў іх ніколі не было ніводнага ворага! — пакруціўшы свой вус, ён дадаў: — Яе замужжа аказалася досыць шчаслівым. Хо трошкі нудны, але ён шчыра яе любіў і ставіўся з усёй дабрынёй і павагай. Ніколі не загаворваў пра наложніцу, хаця яна не магла нарадзіць яму дзіця. Яна таксама любіла яго і паважала…

— Аднак гэта не перашкодзіла ёй сустракацца з вамі за яго спінай! — суха абарваў яго суддзя. — Надзвычай няўхвальныя паводзіны для замужняй, не кажучы ўжо пра вас!

Мастак ганарліва зірнуў на суддзю.

— Пан гэтага не зразумее, — холадна сказаў ён. — Пан аблытаны сеткай пустых правілаў і бессэнсоўных традыцыяў. Але магу пана ўпэўніць, што ў нашым сяброўстве не было нічога заганнага. Свае сустрэчы мы трымалі ў сакрэце толькі таму, што Хо — чалавек досыць старамодны і мог няправільна нас зразумець, зрэшты, як і пан суддзя. Мы не хацелі, каб яму было балюча.

— Якая далікатнасць! Калі вы ўжо так добра ведалі пані Хо, вы, несумненна, патлумачыце, чаму яна апошнім часам была такая прыгнечаная.

— Безумоўна. Справа ў яе бацьку, старым прэфекце, які не ўмеў добра ўпраўляцца са сваімі фінансамі і быў павінен багатаму суднаўладальніку Хуа Міню вялікую суму грошай. Прыкладна месяц таму гэты бязлітасны ліхвяр пачаў прымушаць старога перадаць яму ў кошт доўга зямлю, аднак прэфект хацеў яе захаваць. Зямля вось ужо невядома колькі пакаленняў належала яго сям'і, да таго ж ён адчуваў адказнасць за дабрабыт сваіх арандатараў. Хуа выціснуў бы з гэты бедных людзей іх апошнія грошы! Стары ўгаворваў Хуа пачакаць хаця б да жніва, калі ён зможа заплаціць прынамсі вялізарныя працэнты. Аднак Хуа настойваў на неадкладнай перадачы яму зямлі — тады яна абышлася б яму зусім танна. Пані Хо вельмі з гэтай нагоды хвалявалася і нават двойчы прасіла мяне адвесці яе да Хуа. Яна рабіла ўсё магчымае, каб угаварыць яго адтэрмінаваць выплату, але гэтая брудная свіння пагаджалася на ўсё, толькі калі пані Хо з ім пераспіць!

— Пан Хо пра гэтыя візіты ведаў?

— Не. Мы разумелі, як агаломшыць яго навіна пра фінансавыя праблемы яго цесця, якому ён нічым не можа дапамагчы. Вы ж ведаеце, што сваіх сродкаў у пана Хо няма, ён жыве на адну сціплую пенсію.

— Якая незвычайная дабрыня ў дачыненні да пана Хо!

— Ён заслужыў яе, бо ён прыстойны чалавек. Адзінае, чаго ён не мог даць сваёй жонцы — гэта інтэлектуальныя размовы, і таму ёй патрэбны быў я.

— Ніколі не сустракаў такой поўнай адсутнасці хоць нейкай маральнасці! — з агідай усклікнуў суддзя Дзі. Ён падняўся і загадаў лекару: — Перадай начальніку варты, каб замкнуў яго ў турме як падазраванага ў злачынстве. Пасля адправу разам з двума вартаўнікамі цела пані Хо ў суд і правядзі ўважлівае ўскрыццё. Як толькі зробіш — да мяне. Я буду ў сваім кабінеце.

І ён выйшаў, гнеўна трасучы сваімі доўгімі рукавамі.

У кабінеце суддзю Дзі чакалі пан Хо і два суднаўладальнікі; разам з імі заставаўся адзін са службоўцаў суду. Калі суддзя ўвайшоў, яны хацелі ўстаць, але суддзя жэстам супакоіў іх. Ён прысеў ля стала і загадаў службоўцу напоўніць кубкі гарбатай.

— Усе фармальнасці зробленыя, пане суддзя? — скрушным голасам спытаў пан Хо.

Суддзя Дзі выпіў гарбату, потым паклаў рукі на стол і марудна адказаў:

— Не зусім, пане Хо. У мяне для вас кепскія навіны. Я высветліў, што вашая жонка самагубства не здзяйсняла. Яе забілі.

Пан Хо не змог стрымаць адчайны стогн. Пан Хуа і пан І абмяняліся здзіўленымі поглядамі. Тут пан Хо выдыхнуў:

— Забілі? Хто? Святыя нябёсы, за што?

— Усё паказвае на мастака, якога завуць Фан.

— Фан? Мастак? Ніколі пра такога не чуў!

— Я папярэджваў вас, што навіны кепскія, пан Хо. Вельмі кепскія. Перад тым, як вы пабраліся з вашай жонкай шлюбам, яна сябравала з гэтым мастаком. Пасля вяселля яны таемна сустракаліся ў садовай альтанцы. Магчыма, ён яе стаміў, і яна вырашыла з ім развітацца. Ведаючы, што ўдзень вы будзеце ў мяне, яна магла адправіць Фану цыдулку і запрасіць яго ў альтанку. І калі яна сказала яму пра разрыў, ён і мог яе забіць.

Хо сядзеў, утаропіўшыся ў адну кропку і ціхенька сціснуўшы вусны. Хуа і І зусім збянтэжыліся. Яны сабраліся падняцца і пакінуць суддзю і Хо саміх, але чыноўнік уладным жэстам загадаў ім заставацца на месцы. Урэшце пан Хо зірнуў на суддзю і спытаў:

— Як гэты нягоднік яе забіў?

— Яе ўдарылі ў скронь і, калі яна страціла прытомнасць, павесілі за шыю на бэльцы. Яна задыхнулася. Але злачынца перавярнуў гарбатнік, і гарбата патушыла агонь у гадзінніку-курыльцы, дзякуючы чаму мы даведаліся пра час жахлівага ўчынку — палова пятай ці каля таго. Магу яшчэ дадаць, што адзін са сведак бачыў мастака Фана, які прыкладна тады ж сноўдаўся ля вашай садовай брамы.

Тут у дзверы пагрукалі. Увайшоў судовы лекар і перадаў суддзю справаздачу пра ўскрыццё. Хутка яе прагледзеўшы, чыноўнік пацвердзіў, што прычынай смерці сапраўды было марудное ўдушэнне. Ніякіх слядоў гвалту, апроч сіняка на скроні, на целе не знойдзена. Жанчына была на трэцім месяцы цяжарнасці.

Суддзя Дзі марудна скруціў паперу і паклаў яе ў рукаў. Потым звярнуўся да лекара:

— Загадай начальніку варты выклікаць падазраванага. Хай ён пачакае ў вартавым памяшканні. Пазней я хачу яго яшчэ раз дапытаць.

Як лекар пайшоў, пан Хо падняўся. Хрыплым голасам ён сказаў:

— Калі пан суддзя дазволіць, я хацеў бы сысці. Я мушу…



— Пакуль яшчэ не, пане Хо, — перарваў яго суддзя. — Перш я хачу задаць вам пытанне. Тут, пры пане Хуа і пане І.

Хо з разгубленым выглядам сеў.

— Пане Хо, вы пакінулі сваю жонку ў альтанцы каля дзвюх гадзінаў дня, — пачаў суддзя Дзі. — У маім кабінеце вы праседзелі да пяці, пакуль аканом не прыйшоў з навінай пра смерць вашае жонкі. Хаця мы ведаем, што яна магла памерці ў любы час паміж дзвюма і пяццю, вы, калі даведаліся пра самагубства, сказалі: «Усяго праз некалькі гадзінаў, як я сышоў». Пан Хуа і пан І могуць гэта засведчыць. Адкуль вы даведаліся, што яна памерла каля паловы пятай?

Хо маўчаў. Ён вялікімі вачыма з недаверам глядзеў на суддзю. Нечакана суровым голасам чыноўнік працягнуў:

— А я скажу вам, адкуль! Калі вы забілі сваю жонку а другой, адразу пасля таго, як служанка пакінула яе альтанку, вы спецыяльна залілі гадзіннік-курыльніцу гарбатай. Вы, відаць, палічылі мяне нядрэнным следчым — вельмі вам за гэта ўдзячны. Вы ведалі: калі я прыйду на месца злачынства, то зразумею, што вашую жонку забілі і з дапамогай гадзінніка-курыльніцы вылічу, што гэта адбылося каля паловы пятай. Таксама вы не сумняваліся, што рана ці позна я даведаюся пра Фана, які акурат у гэты час быў ля садовай брамы — яго прывяла дасланая вамі падробленая цыдулка. Гэта быў хітры план, Хо, варты добрага законніка. Але так цудоўна прадуманы ход з гадзіннікам вас і падвёў. Вы ўвесь час казалі сабе: мяне ніколі не западозрыць, бо ўсё сведчыць пра тое, што забойства здзейсніла а палове пятай — і выпадкова прагаварыліся наконт некалькіх гадзінаў пасля вашага зыходу. Тады вашая заўвага дзіўнай мне не падалася. Але як толькі я зразумеў, што калі пані Хо забіў не Фан, то гэта мусілі зрабіць вы, і я ўспомніў вашыя словы — і яны канчаткова даказалі вашую віну. Пяць шчаслівых аблокаў апынуліся для вас, пане Хо, не такімі ўжо і шчаслівымі!

Тут Хо выпрастаўся і холадна пацікавіўся:

— І навошта мне забіваць сваю жонку?

— А я скажу вам, навошта! Вы даведаліся пра яе таемныя сустрэчы з Фанам, і калі яна паведаміла вам пра цяжарнасць, вырашылі адным ударам знішчыць іх. Вы ўпэўніліся сябе, што бацька ненароджанага дзіцяці — Фан, і…

— Ніякі ён не бацька! — раптам закрычаў Хо. — Няўжо пан думае, што гэты нікчэмны нягоднік увогуле можа… Не, гэта было маё дзіця, чуеце? Тыя двое былі здольныя хіба што на агідную слязлівую балбатню! А што яны казалі пра мяне!.. Што я прыстойны, але нудны муж, які атрымаў яе цела, чуеце, але які ніколі не зразумее яе высокую душу. Я мог бы, мог… — знясілены лютасцю, ён пачаў запінацца, але потым сабраўся і больш спакойным тонам працягнуў: — Я не хацеў дзіця ад жанчыны з розумам распусніцы, ад жанчыны…

— Хопіць! — рэзка спыніў яго суддзя Дзі. Ён пляснуў у далоні і, калі з'явіўся начальнік варты, загадаў яму: — Надзень на яго кайданы і адвядзі ў турму. Заўтра на паседжанні я выслухаю поўнае яго прызнанне.

Калі начальнік варты вывеў Хо, суддзя звярнуўся да І Пэна:

— Службовец вас праводзіць, пане І.

Потым павярнуўся да другога суднаўладальніка і сказаў:

— А вы, пане Хуа, яшчэ на некалькі хвілін затрымайцеся: мне трэба пагаварыць з вамі сам-насам.

Калі яны засталіся адны, Хуа ліслівa сказаў:

— Пан суддзя так хутка расследаваў справу! Гэта ж падумаць толькі, пан Хо… — і сумна пахітаў галавой.

Чыноўнік змрочна зірнуў на яго.

— Фан як падазраваны мяне не надта задавальняў, — суха адзначыў ён. — Усё занадта выразна ўказвала на яго, аднак само забойства зусім не адпавядала ягонай натуры. Я загадаў насільшчыкам несці мяне ў суд кружным шляхам, каб мець трохі часу на развагі. Я падумаў, што забойства мог падрыхтаваць толькі нехта свой, а значыць, гэта Хо — ён меў відавочны матыў, бо, як любы падмануты муж, хацеў адпомсціць адначасова нявернай жонцы і яе каханку. Але чаму ён так доўга чакаў? Пра пасланні, якія пані Хо адпраўляла Фану, ён ведаў і даўно раскрыў таямніцу іх сустрэч. Але калі я прачытаў у справаздачы пра цяжарнасць пані Хо, то падумаў, што менавіта навіна пра дзіця паўплывала на рашэнне яе мужа. І я меў рацыю, хаця, як мы толькі што даведаліся, Хо кіраваўся не тымі пачуццямі, якія я яму прыпісваў, — тут суддзя спыніў свой змрочны погляд на суднаўладальніку і дадаў: — Падрыхтаваць фальшывыя доказы мог толькі нехта з дому Хо, знаёмы з прынцыпамі працы гадзінніка-курыльніцы і з почыркам пані Хо. Гэта і ўратавала вас, пане Хуа, ад абвінавачання!

— Мяне, пане?! — ускрыкнуў агаломшаны Хуа.

— Безумоўна. Я даведаўся пра тое, што пані Хо да вас прыходзіла і што вашую ганебную прапанову яна адхіліла. Муж яе нічога не падазраваў, але Фан ведаў. Вось вам і матыў для таго, каб прыбраць яе і Фана. Магчымасць у вас таксама была: а другой гадзіне, калі пані Хо адпачывала ў альтанцы адна, вы прагульваліся ў садзе. Вы невінаватыя ў забойстве, пане Хуа, але вінаватыя ў спробе спакушэння замужняй жанчыны, якую пацвердзіць пан Фан, і ў спробе даць хабар, што засведчыць аканом, які чуў вашую з Хо паабедзенную размову. Я абвінавачу вас заўтра ў двух гэтых злачынствах на паседжанні і прысуджу вам турэмны тэрмін. На гэтым вашая кар'ера ў Пэнлаі скончыцца, пане Хуа.

Хуа падскочыў з крэсла і сабраўся ўжо ўкленчыць і прасіць у чыноўніка літасці, але суддзя Дзі тут жа працягнуў:

— Я не буду караць вас за дзве гэтыя правіны, калі вы пагодзіцеся заплаціць два спагнанні. Па-першае, гэтым жа вечарам вы напішаце бацьку пані Хо афіцыйны ліст з належным подпісам і пячаткай, у якім паведаміце, што пазычаныя ім грошы ён можа вярнуць у любы зручны для яго час і што вы адмаўляецеся ад усіх працэнтаў. Па-другое, вы замовіце пану Фану карціны з усімі караблямі на вашай верфі і за кожны малюнак заплаціце яму адзін срэбны злітак, — тут ён падняў руку, спыняючы выяўленні ўдзячнасці пана Хуа, і дадаў. — Безумоўна, гэты штраф дасць вам толькі адтэрміноўку. Калі раптам я пачую, што вы зноў назаляеце прыстойным жанчынам, вас адразу ж асудзяць на апісанае мной пакаранне. А цяпер ідзіце ў вартавое памяшканне. Там вы знойдзеце пана Фана, зробіце замову і заплаціце яму на месцы пяць срэбных зліткаў у якасці задатку. Да пабачэння!

Калі перапалоханы суднаўладальнік паспешліва выйшаў, суддзя ўстаў і наблізіўся да адчыненага акна. Ён з асалодай удыхнуў тонкі водар магноліевых кветак і прамармытаў: «Асуджэнне чыіхсьці маральных прынцыпаў — не нагода даць яму памерці ў нястачы».

Тут ён рэзка павярнуўся і накіраваўся ў суд.

Пераклад з ангельскай мовы
Ганны Янкута

Прайсці праз рыфы, або Жыццё працягваецца

Заканчэнне.
Пачатак на стр. 9 (1)

Таму пра дэбют можна казаць толькі адносна некалькіх чалавек. (Зрэшты, а чаму было не даць кароткія біяграфічныя даведкі пра аўтараў, — фотак жа вунь колькі нашлёпалі.)

Не асабліва расплёскваючыся думкамі, паспрабую суб'ектыўна праклеймаваць кожнага аўтара. Пачну, бадай, з цяжэйшага жанру, прынамсі, для пісання. Ці не таму яе (прыстойнай прозы, зразумела) так няшмат у нашай літаратуры. А выбітная і ўвогуле рэдкасць. Пяць-шэсць празаікаў, якіх можна чытаць, наперад ведаючы, што не губляеш часу дарма. З гэтай прычыны такая пільная ўвага да маладых аўтараў і непадробная радасць і чытацкае задавальненне ад іх рэдкай удачы.

Першы аповед Дар'і Вашкевіч «Пялёсткі» напісаны ў стылі плыні свядомасці, а можна дапусціць, што і з пэўнай праявай метаметафорыкі, якая была распрацавана паэтамі яшчэ на пачатку 90-х мінулага стагоддзя. Такія тэксты чытача раздражняюць і стамляюць, калі ў іх аслаблены хоць які дзейны сюжэт. Да таго ж тэкст выдрукаваны, як пазначана, у аўтарскім правапісе. І вось першы сказ: «Калі я павярнулася позна ўначы дадому, то ўчула водар ягонае парфумы». Без каментарыяў. А вось другі аповед «Соня» мне спадабаўся. Гэта тонкі і цудоўны фрагмент мастацкай прозы. Своеасаблівае ўспрыманне навакольнага свету і людзей праз напластаванні ўласнага эга... Даволі адметная проза. Дар'і можна смела замахвацца на асобную ўласную кніжку.

Кірыл Дубоўскі расчараваў мяне сваім кароткім расійскамоўным тэкстам. Гэты лапідарны, як па сюжэце, так і па стылі (дарэчы, сухаватым і даўкім), аповед ні пра што асаблівае не кажа, хоць аўтарам задумваўся глыбока філасафічны падтэкст. Расчараванне павялічваецца, калі прыпамінаеш, што дзесьці ўжо даводзілася чытаць даволі ўхвальныя словы пра яго творчасць...

Алена Казлова нарэшце ўстыдалася сваіх юнацкіх прэтэнзій да песняра, перастала спатыкацца і падаць (маю на ўвазе яе псеўданім Анка Упала) і намерылася вярнуцца да сябе самой, або, што больш пэўней, спраўдзіць сябе самую... У аповедзе «Мінск два» пісьменніца спрабуе выявіць свой глыбокі ўнутраны свет, які ніяк не можа пераадолець цвёрдую абалонку знешняга свету (па тыпу яйка і птушаняці), таму агалошвае сябе знутры... Нешматслоўная, але ёмкая па сваёй сутнасці проза мастацкага жыцця пэўнага індывідуума, што намагаецца стаць асобай...

У Паўла Капанскага даволі адметны стыль пісьма, але зашмат штучнай вобразнасці. Часам гэта напамінае каментары ў сацыяльных сетках інтэрнэту ці выкладзеныя запісы ў Фэйсбуку. З прачытанага мной тэкста нічога істотнага не вынікае, апроч



ухвальнага жадання аўтара намацаць уласную пісьменніцкую арыгінальнасць.

Аповед Машы Лапо «War» займальны і прафесійны, напісаны ў такім скрыжаваным стылі Жванецкага-Даўлатава. Упершыню пашкадаваў, што аўтар расійскамоўная. Такога тыпу беларускамоўнага празаіка нам яўна бракуе. Карацей, аўтару рэспект!

А вось проза Насты Манцэвіч не тое што расчаравала, а проста не дала нагоды для шырокай і цэльнай гаворкі. Яшчэ раней яна зацікавіла мяне як паэт(-ка) сваім зборнікам «Птушкі», а тут атрымаўся нейкі псіхалагічны канспект, можна сказаць нават — чарнавыя накіды да задуманага (змрояна-будучага) твора. Ці не з гэтай прычыны тэкст пакуль так і не займеў назвы, а па вершаванай звычцы ўсё яшчэ пазначаны трыма зорачкамі.

Аповед «Сон рэальнасці» Кірылы Стаселькі напісаны ў авангардным стылі — жыццё чалавека перад люстэркам яго свядомасці. Шкодзіць такому стылю вельмі шчыльная аднастайнасць усяго тэкста, але навідавоку аўтарская шчырая спроба мастацкага зразумення свайго часу...

Аповеды ж Наталлі Ярмольчык праставатыя, хоць і маюць нібыта глыбокія падтэксты; ім бракуе мастацкага развіцця, вобразы герояў прыкладваюцца да канкрэтных сітуацый і наадварот, сам аўтар застаецца як бы па-за тэкстам, адсюль не зусім жывое дзейства, трафарэтнасць і пэўны літаратурны схематызм. Мяркуючы па схільнасці да дыялогаў і па іх саміх, аўтар магла б паспрабавацць сябе ў драматургіі (прынамсі, як мне здаецца, кароткія п'есы ёй даваліся б). Адметна, што ўсе тры тэксты напісаныя ў розных матывацыях: псіхалогіі, фэнтэзі і гумару. Агулам, маючы адносна дабротныя літаратурныя здольнасці, іх неабходна развіваць.

Цяпер, што да паэзіі.

Вершы Рамана Абрамчука заўважна вучнёўскія, мова і рытміка ў іх кульгаюць. Аднак ёсць маладая і безаглядная эмоцыя, шчырасць пачуццяў, прага паэтычнай жарсці.

Глытаю вецер,
што эскадру хмараў
Шалёна гоніць прэч кудысь на ўсход
І расчышчае шлях усім крылатым,
Каб здзейснілі свой вылет, лёт
і веснавы прылёт.

Шкада, што прывязка да алфавіта змусіла ўкладальнікаў і рэдакцыйную раду пачынаць кніжку менавіта нізкай гэтага аўтара.

Паэтычная публікацыя Марыны Варабей таксама пакуль яшчэ з адценнем пачаткоўства. Яна піша:

сонца ўзыходзіць рана.
цьмяны асенні ранак...

У аўтара не ўсё добра са звычайнай логікай: сонца восенню ў яе ўзыходзіць рана, а да таго ж — пры сонцы! — у яе цьмяны ранак... Трэба больш пільна адсочваць такую аўтарскую слепату і глухату, у тым ліку і рэдактарам. Шмат у тэкстах націску, пожаду і жарстлівасці, а майстэрства — вобмаль. Амаль кожны радок аўтара «гуляе сам па сабе». Бракуе адчування гармоніі ў стварэнні вобразаў і лірычнага свету.

Перакладзены Андрэем Былінскім вершаваны цыкл Ўільямса Карласа Ўільямса, створаны аўтарам паводле карцін Брэйгеля, можна было б палічыць даволі ўдалым, калі б, скажам, сяляне ў яго не «скокалі» ды «высока не задзіралі абцасы». Агулам жа атрымалася цэльная паэтычная нізка, да якой, спадзяюся, перакладчык яшчэ не раз добра прыгледзіцца.

Яшчэ гадоў восем таму Наста Грышчук прыносіла мне свае вершы ў «ЛіМ», і, як памятаецца, яны былі больш празрыстыя і цяплейшыя, нешта накшталт сёлетняй ранняй вясны... Трэба, аднак, прызнаць, што цяпер пераважная большасць яе тэкстаў вызнаная знутры жыцця і іх дзіцячая непасрэднасць злагоджана сталым поглядам развażлівага чалавека. Як у гэтых двух строфах на зачыне падборкі:

Мы развіталіся.
На памяць
Я падарыла крыжык свой,
Каб ты і ў ноч, і ў дождж, і ў замець
Не сустракаўся з доляй злой.
Няхай нас болей лёс не зніжа,
Я зноў убачу: ты стаіш.
На шыі — мой маленькі крыжык,
І на плячах — вялізны крыж.

Андрэй Касцюкевіч пераклаў вершаваныя тэксты Фрыдрыха Ніцшэ з «маладой» кнігі знакамітага філосафа «Вясёлая навука» (1882). Вось што пісаў пра яе сам тады яшчэ не надта вядомы аўтар: «...амаль у кожным радку яе пяшчотна трымаюцца за рукі праніклівы роздум і гарэза. Вершы, якія выказваюць удзячнасць самаму цудоўнаму месяцу, студзеню, які я пераҗыў — уся кніга ёсць ягоны дарунак — у дастатковай ступені тлумачаць, з якой глыбіні «навука» тут стала вясёленькай». Здаецца, пераклад А. Касцюкевіча таксама атрымаўся — калі не вясёлы, то ўсё ж дастаткова гарэзлівы.

У расійскамоўнай Дашы Латышавай вершы жывыя, нярвовыя, але, на жаль, без дастаткова выразнай мастацкай абламоўкі. Таму падчас выдаюцца залішне прасталінейнымі, як знешне (пры чытанні), так і знутры (пры суперажыванні). Ну і такіх вось перлаў трэба пазбягаць:

у людзей няма лішніх касцей:
усе патрэбныя і карысныя.

Гэта вульгарная проза па-за эстэтыкай паэтычнага красамоўства. Словам, скажу тут у тон аўтару: маладой вершатворцы трэба «абрастаць метафарычным мясам»...

А вось вершы Антона Рудака выдаюць на публікацыю ўжо сталага прафесійнага (калі крыўдна, няхай застаецца аматарам) паэта. Чытаючы, сам сабе падумаў, што яго выдрукавалі ў гэтым зборніку толькі дзеля таго, каб падвысіць цэнз (мастацкі ўзровень) самога выдання.

бо я і не думаў, нібы аб цудзе
спяваць утрапёна, звонка й высока
аб той, што ніколі нідзе не будзе,
не бачачы той, што са мной
навокал.

Рудак пакуль яшчэ шматгалосы, ён акумуляваў вялікі паэтычны свет у сабе, каб, у рэшце рэшт, вылучыць высока напружаную энергію ўласнага голасу. Дай Бог.

Аня Рудак са сваімі вершамі выглядае на яго фоне «беднай родзічкай» (што канкрэтна да апошняга, то, шчыра кажучы, не ведаю, можа яно і так). Надрыўныя рытмы нечым блізкія да народных (цяпер ужо фальклорных) замоў і плачаў. Гармонія сумуе па гэтым хаасе...

На адметных вершах Юлі Цімафеевай заўважна адбіўся літаратурны вопыт яе перакладчыцкай творчасці. Але ў іх ёсць водбліскі сапраўднай паэзіі, якую вылавіла з сусветнага эфіру яе пажадная да прыгажосці душа.

Я з гэтым светам
дзялю тэрыторыю.
Гэты кавалак табе,
гэты кавалак мне...

Тое, чаго ты не ведаеш,
табе не належыць,
— кажа мне свет.
— І ў табе тваё толькі тое,
што ты ўсвядоміла.

Як крытык аматарскага кшталту, я не лічу Вольгу Чайкоўскую ў паэзіі «дзевачкай для біцця», на што яна намякае ў адным са сваіх вершаў. Наадварот, адношу яе да найбольш цікавых сучасных паэтак.

Філасофскі вектар яе творчасці, у нечым блізкі да стылю і напрацовак А. Разанава, нярэдка, апынуўшыся па-за самім гэтым стылем, становіцца бездапаможным, як нярэдка пачуваецца бездапаможным чалавечы розум перад боскім провідам:

І толькі калі мы разам, свет
мае сэнс,
а Бог мае рацыю.

Нездарма бальшыня творчых памкненняў Вольгі палягае ў прасторы духоўнага дыялогу:

пуста без знакаў прыпынку
проста зашмат прасторы
думкі разгубіліся
і ўніклі задуманага сэнсу
паміж бязродных і адзінокіх
словаў
радкоў
гуляюць твая і мая думкі
і ніяк на агульны
клічнік ці кропку
натыкнуцца
не могуць


Падводзячы вынікі гэтага агляднага крытычнага круізу на «Параходзіку сучаснасці», магу сказаць, што Школа маладога літаратара пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў сваю місію выканала (сыходзячы з цяперашніх сваіх магчымасцяў) і, безумоўна, у далейшым мае быць працягнутай у тым ці іншым фармаце.

Заўважу яшчэ: пры чытанні зборніка склалася ўражанне, што сучасны працэс маладой беларускай літаратуры звернуты як бы вонкі — у акаляючы свет, і яго стваральнікам варта было б больш уважліва засяродзіцца на ўласным унутраным свеце. Пакуль жа выяўленыя імі мастацкія відзежы паўсядзённага жыцця, дзе пануе культ эгаістычнага прагматызму, пакідаюць за межамі сваіх сюжэтаў духоўны катарсіс зямнога смяротнага чалавека.

Аднак радуе тое, што ў нашых духоўных нацыянальных абсягах яшчэ дастаткова здольных і таленавітых маладых людзей. Што яны прагнуць дасканаласці і ім ёсць у каго гэтаму вучыцца і пераймаць мастацкі вопыт.

Літаратурнае жыццё працягваецца...

«ДЗЕЯСЛОЎ» №69



«Сэрцапіс»

ЛеГАЛ

Ніколі не думалася, што за лёс іншай краіны буду перажываць і хвалявацца, не раўнуючы, як за лёс роднай. Але сёння гэта так. Украіна ўтрапёна б'ецца ў маім сэрцы...

Успомніліся радкі з верша вядомага паэта братняй дзяржавы Паўло Гірныка, з якім давялося вучыцца на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве напрыканцы 1980-х... Тады ўжо «курсанты» мелі свае адметныя нацыянальныя групоўкі. Я, Гірнык і расійскамоўны немец з Казахстана Шмідт таварышавалі і заўсёды «тусаваліся» разам, і, ці паверыце, гаварылі кожны на сваёй мове, не маючы патрэбы ў перакладчыку, і нават як бы не прыдаючы таму значэння: маўляў, так і трэба... У Гірныка ў Мінску дачка, Шмідт даўно жыве ў Нямеччыне... Не бачыліся і не чуліся цэлую вечнасць... Зрэдзьчасу ецьць настальгія... І такая скруха агарнула душу, такая беспрасветная немачнасць, што можна кранўцца розумам, калі не сагнаць гэты цень адчаю ды не ўспомніць пра чалавечую годнасць і мужчынскую мужнасць... Мы яшчэ пабачымся, Паўло! І я веру, што тая наша сустрэча будзе светлая і святочная...

Але, на жаль, пакуль так: ім — вайна, а нам — хакей...

Нейкім чынам заключная частка рамана Алеся Усені «Грэх», выдрукаваная ў 69 нумары часопіса «Дзеяслоў», зводдалі акрэслівае ўладкаванне і станаўленне чалавечага грамадства часоў вялікай Рымскай імперыі, накладваючы тое ў чытацкай падсвядомасці на праекцыю сучаснага вялікага «русского мира» (амаль без іроніі)... Распавядаючы пра пачатак хрысціянства, ганенні на яго і ахвяры, якія даводзіцца прыносіць у імя абранай веры, аўтар падводзіць чытача да роздуму над сутнасцю зямнога жыцця, якое мае сваімі духоўнымі складнікамі любоў, веру і надзею... За гэтыя Хрыстовыя імператывы людзі гатовыя ахвяраваць сваімі жыццямі і нават жыццямі сваіх малалетніх дзяцей, як маці Сафія, якая аддае на жорсткае катаванне сваіх дачок — Веру, Надзею і Любоў... Аўтар скрупулёзна выпісвае гэты (у розных месцах па рознаму ідэнтыфікаваны) гістарычны факт, не баючыся быць абвінавачаным у візуальных празмернасцях з жахлівымі малюнкамі крывавых сцэн... Вельмі добра выпісаны вобраз імператара Адрыяна, закаханых Архелая і Вірсавіі, былога вяара, сенатара Гнея...

Хоць самі некаторыя дзеі рамана падаюцца трохі ілюстрацыйнымі і сям-там зацягнутымі ў занадта правільных маналогах, асабліва ў палеміцы хрысціянкі Сафіі з імператарам Адрыянам наконт іх вераванняў.

І ўсё ж твор, як першы такога аб'ёмнага маштабу для аўтара, па-добраму ўражвае. Ён чытэльны і прэзентабельны для любой чытацкай аўдыторыі. Тым больш, што гэта рэдкі беларускі гістарычны раман на небеларускай аснове... Як для мяне, то з падтэкста твора выснаўваецца для чытача наступная тэза: чалавек, абапіраючыся толькі на любоў, веру і надзею, і тым самым як бы спавядаючы «непротивление злу», ніколі не зможа пазбегнуць і адпрэчыць ні подлых намераў, ні самой подласці і прыгнёту, якія сыходзяць ад таталітарных рэжымаў, дзе б і ў якім выглядзе яны ні існавалі. Дух павінен апірацца на сілу. І тады сіла духу павінна змагчы сілу зла...

Далей. Сяргей Шапран прадстаўляе невядомыя (а некаторыя па недаглядзе ўкладальніка і вядомыя) вершы і паэтычныя накіды Рыгора Барадуліна. Народны паэт — жывы сваім словам насуперак смерці. Хоць,

Што такое пакуты,
Ведае
Да слова прыкуты...

Падобныя строфы ўкладваюцца ў памяць, як у заступы, выбітыя ў цвёрдай зямной пародзе, ступні альпініста, што ўпарта дамагаецца свайго Эверэста... Гэта як апраўданне перад чытачом (своеасаблівае замольванне багемнага граху) сваёй місіі паэта на гэтай зямлі...

Мастацкі нарыс, што змешчаны ў рубрыцы прозы, «Гослар» вядомага пісьменніка Анатоля Кудраўца — гэта літаратурна-пазнавальны экскурс ва ўсходнюю Германію, дзе ён пабываў, гасцюючы ў сваёй дачкі. Цікава, займальна, як і ўсё чужое па першым часе, але ўсё ж не сваё... У тэксце адсутнічае ў такіх звычайных беларускіх расповедах пра замежжа эфект параўнання і скрупулёзна-ўзнёслага альбо крытычнага аналізу, — тут проста літаратурна акрэслены нарысавы паказ нямецкага старадаўняга гарадка і яго ваколіц з ненавязлівай гістарычнай падсветкай. Вось так, маўляў, цывілізаваныя людзі жывуць... Чытайце і асэнсоўвайце, браткі-беларусы...

Вершы Валерыя Дубоўскага мне ўжо не чужыя і нават не незнаёмыя (не так даўно я пісаў пра яго першы вершаваны зборнік). Чалавечы вопыт паэта, які не засланяе і не спрашчае жыццё, а робіць надзённае мастацкай навізной гэтага свету, яшчэ ўсё выяўляецца ў яго вершах (назву яго падборкі я прысабечыў для гэтага агляда). Бо па словах паэта:

Жыццё –
Найскладанейшы верш.
Да яго, як рыфму,
Падбіраеш ключы.

Каб не чытаў Святлану Курс у Фэйсбуку, дык і не падумаў бы, што Ева Вежнавец (яна ж) можа пісаць такія фантасмагорыі (амаль у стылі Яна Баршчэўскага, толькі з сучасным ракурсам жыцця): духоўна і маральна спляжаная Беларусь, якую можна ўратаваць (адрадзіць) толькі старадаўнімі замовамі ці прываротным зеллем... Правінцыйны зрэз сённяшняй беларускай вёскі — як на далоні, сцерці яе з твару зямлі можа і чарговы Хаўер, і нават маласвядомы вінны натоўп «прыніжаных і зняважаных»... Е. Вежнавец, безумоўна, адна з найбольш таленавітых нашых пісьменніц, якая вартая шырокай чытацкай і літаратурна-крытычнай увагі.

Паэтэса Людка Сільнова, дзякаваць Богу, усё тая ж: здзяцінелая, пазнавальная кожнай сваёй нечаканай метафарай, метрыкай, строфікай, знешняй атрыбутыкай вершаскладання найперш... Але і глыбіня ўнутраная — ад фізічных праяў да духоўнага ўздыху — таксама пры ёй. Таму ў чытача захоўваецца шчыры давер да яе верша. А як не даверыцца такім словам:

Дачкі і ўнучкі партрэт настольны
Мне быццам кажа:
«Ты будзеш вольнай!
Ты будзеш вольнай і назавешся
Найцішім словам
у Божым тэксце...»

Вінцэсь Мудроў — пісьменнік адметны і, што галоўнае, чытэльны, аднак, заўважна, што стылёва і тэматычна ён адпстайны... Але ж, во, жонка мая, згледзеўшы, што я прынёс новы нумар «Дзеяслова», прабегшы па яго змесце, абрадавана ўсклікнула: «О, Мудроў ёсць! Трэба абавязкова пачытаць...» Як бачым, не зважаючы на занудната Галубовіча, прыхільнікаў у наваполацкага пісьменніка хапае... Чаго вартая адна толькі назва аповеда — «Мутны Меконг»! Ну як ты прапусціш чытанне з такой заяўкай?!

Каторы раз чытаючы вытанчанае версіфікатарства Леаніда Дранько-Майсюка — вясёлае, забаўнае, не абцяжаранае штучнымі мудронасцямі — пра розныя прыгоды любімага сабакі Хомкі, я не страчваю спадзеву, што, як і ўсе ранейшыя свае паэтычныя цыклы, Леанід Васільевіч завершыць і гэтыя публікацыі на выверанай ноце. У гэтых, на першы погляд, не зусім сур'ёзных творах за роспсамі іроніі і сарказма шмат адсылаў і падтэкстаў да праяў нашага грамадскага і палітычнага ладу жыцця...

Вершы Эрнеста Савы даволі адметныя, хоць месцамі і цьмяныя... Паэзія ў іх адчуваецца. А вось уся старанна і па-мастацку прафесійна накручаная сітуацыя вакол вершаў і яго аўтара ў прадмове-эсэ Андрэя Стэфановіча асабіста ў мяне выклікае асацыяцыі з містыфікацыяй... ці, скажам, нейкі такі няпэўны давер...

А што было ў паданні тым далей?
Кажу сабе: наступны крок здалей,
а там Сінай пабачыш ці пустэчу,
на конях паімчыш да вечных меж
ці па каменні вострым папаўзеш
з мінуўшчыны дасветнай на сустрэчу.

Неяк так. Раю пачытаць.

Дзіўна, але ў Беларусі пабалела паэтаў жаночага роду, а мы гэтай прыгожай з'явы як бы не заўважаем... А на мой погляд паэтак сёння чытаць цікавей, і пішуць яны таленавіцей. Не ўсе, вядома. Вось і Валерыя Кустава... Памятаю, калісьці яе дэбютны зборнік я крытыкаваў за хаатычную экспрэсію, залішнюю экзальтаванасць ды эмацыйны сэнсавы хаас... Але ж вырасла дзяўчына з падлеткавых джынсаў. Гармоны ўнармавала і гармонію выверыла. І хоць свет яна ўспрымае ўсё яшчэ вельмі крытычна, аднак разам з тым адчуваецца, што і да ўласнай асобы паэтка стала праяўляць большую строгасць. Зрэшты, лепшыя вершы Валерыі сёння вартыя самага пераборлівага чытача.

У мяне з Краінай кантакт.
Мы рухаемся ў такт.
Я люблю яе,
а яна мяне — мае.
Дыхаю толькі я.
А яна — нямая.
Неяк так.
Хто такое стрымае?

Ніколі не лічыў сябе меламанам, таму прачытаў тэксты расійскай рок-паэзіі па-беларуску без асаблівага трапятання... Па вялікім рахунку, найперш, сам гэты праект варты ўвагі, бо, скажам, а чаму не перакласці заходне-еўрапейскую рок-паэзію ды разам з айчыннай выдаць асобным зборнікам? Сярод аўтараў: А. Макарэвіч, Б. Грэбеншчыкоў, В. Цой, А. Башлачоў, Ю. Шаўчук ды іншыя. Сярод перакладчыкаў: А. Хадановіч, В. Гронская, М. Шчур, А. Івашчанка, С. Балахонаў, Ю. Несцярэнка ды іншыя. Чытаючы, ясна бачацца сімвалы і таго, іхняга, і нашага, цяперашняга, часу...

Гады ляцелі, кожны з нас
Боль звядаў і трываў пакуты.
Але нарэшце выйшаў час —
Мы рукі вызвалім ад путаў.
....
Калі сканаў апошні вораг,
Труба зайграла перамогу –
Тады заўважыць кожны змог,
Як засталося нас нямнога.

(1978)

Як бачым, у Расіі былі і яшчэ застаюцца людзі, у тым ліку і творчыя, з іншымі, адносна імперскай улады, ідэямі і меркаваннямі, вальнадумцы і пратэстанты.

У раздзеле «Спадчына» няўтомны Сяргей Шапран працуе ліставанне Васіля Быкава (1963–1977) з калегамі-літаратарамі (беларускімі, расійскімі, украінскімі). Ёсць вельмі цікавыя фрагменты, якія тычыліся творчых праблем пісьменніка ў змаганні з партыйнай наменклатурай і выдавецкай цэнзурай. Вось урывак з ліста Нілу Гілевічу (1966): «У школах даводзяць, што Быкаў — гэта гродзенскі Сіняўскі, вораг. І хто? Ведама, кадравыя работнікі КГБ. Пайшлі на прадпрыемствы «с разъяснениями». З дня на дзень усё горш. Як воўка ў аблаву. Але — вытрымаем! І падтрымка сяброў абавязвае».

Яшчэ адна адметная публікацыя — даволі аб'ёмная гутарка таго ж Сяргея Шапрана з «правінцыйным» пісьменнікам Міколам Захаранкам, што жыве ў Швабах на Лагойшчыне. Гаваркі чалавек, трэба адзначыць, гэты Захаранка. Па ўсім відаць, дзякуючы сваёй неардынарнай біяграфіі, якая высновала яму шмат горкага вопыту і шчымлівага жыццёвага досведу. Такія людзі больш уседлівыя за вясёлым гасцінным сталом, чым за пісьмовым. Гутарка «расцяклася мыслю па дрэву», але тым самым страціла пэўную глыбіню і засяроджанасць. Шмат цікавостак для калялітаратурных вушэй, аднак амаль не зачэплены праблемы, — ні грамадскія, ні літаратурныя, — што тычацца нашага часу. Хоць, што казаць, само чытво — гуллівае і шчырае — прыцягвае і выклікае душэўную прыхільнасць да абодвух аўтараў...

Друкуюцца раздзелы з дакументальнай кнігі Яўгена Лецкі «На чужыне палеглыя». Дарэчы, аўтару — 70 гадоў, віншуем! Таксама, следам, юбілейны артыкул Леаніда Галубовіча да 80-годдзя паэта, пісьменніка і выдаўца Кастуся Цвіркі. Ірына Клімковіч піша пра «міфічных першапродкаў беларусаў». Уладзімір Сіўчыкаў у водгуку-бурлеску адгукаецца на кніжку Пятра Васючэнкі «Дванаццаць подзвігаў Геракла». Алеся Лапіцкая рэцэнзуе раман «Сфагнум» Віктара Марціновіча. Падаецца анатацыя новых беларускіх кніжак у рубрыцы «Дзеяпіс».

Духоўнага вам здароўя і прыемнага чытання.

ТОП-3 ЗБОРНІКАЎ СУЧАСНАЙ УКРАІНСКАЙ ПАЭЗІІ

Падзеі ва Украіне — у эпіцэнтры сусветнай чытацкай увагі. Падзеі, на жаль, не літаратурныя. «ЛБ» вырашыла пазнаёміць з папулярнымі старонкамі сучаснай украінскай культуры. У прыватнасці — паэзіі.

Напачатку XX стагоддзя адным з найбольш вядомых украінскіх вершаў быў шэдэўр Уладзіміра Сасюры «Любіть Україну». У канцы стагоддзя нашыя суседзі па памяці цытавалі твор Аляксандра Ірванца «Любіть Аклахому». Якая ўкраінская паэзія папулярная цяпер?


Фота buknews.com.ua

1 Першы па папулярнасці, паводле апытанкі prostokniga.com.ua, — **Юры Іздрык** (яго вершы «Літаратурная Беларусь» публікавала ў сакавіку (№3 (91)).

У сваім новым зборніку вершаў «Ю» Іздрык працягвае гуляць у гульню, правілы якой яго чытачы паспелі ўжо засвоіць. Адмысловую ўвагу ён, як заўсёды, надае афармленню і ілюстрацыям. Малюнкі ў яго таксама важныя, як і тэкст, яны не толькі яго дублююць, але і напаўняюць новым значэннем. Акрамя таго, перад тым, як выдаць кнігу, аўтар выклаў усе вершы ў сваім блогу «Мертвий щоденник» і на Фэйсбуку, пасля чаго ўважліва адсочваў лайкі і каменты, тым самым даючы больш магчымасці чытачам уплываць на сваю творчасць.

У адным з інтэрв'ю Ю. Іздрык адзначыў, што творчая дзейнасць для яго — гэта спосаб разабрацца ў сабе і з сабой. Вершы, якія ўвайшлі ў зборнік «Ю», — гэта плынь гаворкі чалавека, які застаўся сам-насам з вобразамі і рыфмамі, што мільгаюць у яго галаве. Дамінантнымі тэмамі кнігі сталі Каханне і Сакральнасць, галоўнай жа адзнакай — іранічная безуважлівасць, якая часам мяжуецца з сарказмам.


Фота informator.su

2 **Сяргей Жадан, «Агнястральныя і нажавыя»**

У сваім новым паэтычным зборніку С. Жадан як заўсёды абыгрывае поп-культурныя штампы. Ён вымае іх са звыклага кантэксту — масавай культуры — і ўзносіць да ўзроўня мастацтва, праз што яны набываюць новыя падтэксты і значэнні ды ўспрымаюцца па-іншаму. Акрамя таго, С. Жадан звяртаецца да сваіх любімых урбаністычных сцэн, малюе жыццё звычайных людзей з падваротняў, гопнікаў і злачынцаў. Крымінальных матываў тут асабліва шмат.

Здзіўляе і тое, што да ўсіх гэтых міфалагем аўтар дадае многія алюзіі на Біблію. З-за перанасычанасці зборніка хрысціянскімі вобразамі-знакамі крытыкі назвалі яго «евангеллем ад Жадана». Уся кніга пабудавана на своеасаблівым аксюмаране, злучэнні неспалучальнага: крымінальных і рэлігійных матываў. Ды і мова — грымучая сумесь. Побач з сухой дзелавой і палітычнай лексікай гучаць цёплыя і далікатныя словы кахання.

3 **Марыяна Кіяноўская, «Нешта штодзённае»**

Красамоўна пра лірыку М. Кіяноўскай гаворыць вокладка яе зборніка з намаляваным па цэнтры чалавечым вокам, пад якім


Фота chytomo.com

па-жаночы акуратна выведзена: «Нешта штодзённае» (у арыгінале — «Дещо щоденне»). У яе вершах ёсць пачуццёвасць, якая можа быць уласцівая толькі жаночай паэзіі. Аднак яе паэзія — гэта далёка не любоўная лірыка. У першую чаргу гэта перапляценні вобразаў і матываў, узятых з сусветнай класікі, Бібліі, апокрыфаў, старажытнагрэцкіх міфаў і г.д. Паэтка стварыла поліфанію галасоў з розных культур і эпох.

Існую, мислю — грекою й латинню,
Садами йдучи, садами мов,
Бо sermiofacit. Троп триває тінню
Не проминань. В метафорі — любов.

Аднак усе гэтыя галасы служаць толькі элементамі яе ўласнай міфатворчасці. Такія тэксты складана прааналізаваць і немагчыма інтэрпрэтаваць, іх трэба ўспрымаць не лагічна, а інтуітыўна, бо менавіта так яны і ствараліся.

Пулітцэраўская прэмія

У Нью-Ёрку абвешчаны пераможцы Пулітцэраўскай прэміі — адной з самых прэстыжных амерыканскіх узнагарод у галіне журналістыкі і літаратуры.

Пулітцэраўская прэмія ўмоўна падзяляецца на два блокі: у адным узнагароджваюць за актуальныя дасягненні ў журналістыцы, у другім, гуманітарным, адзначаюць лепшы мастацкі твор (кнігу па гісторыі, п'есу, біяграфію ці мемуары, вершаваны твор і нон-фікшн). За дасягненні ў журналістыцы былі адзначаны газеты «Washington Post» і «New York Times» — за серыю матэрыялаў, заснаваных на звестках Эдварда Сноўдэна. У гуманітарным блоку галоўную прэмію — за раман — атрымала Донна Тарт і яе кніга «Шчыгол».

У ЗША гэты раман займаў першыя радкі ў рэйтынгу продажаў «Amazon». Стывен Кінг станоўча адгукнуўся пра гэты раман Д. Тарт, назваўшы яго «лоўкім творам, у якім злучыліся розум і сэрца». Да яго далучыліся галасы многіх літаратурных крытыкаў Амерыкі, якія нават параўналі «Шчыгла» з дзікенсаўскімі «Вялікімі надзеямі».

Дзеянне «Шчыгла» разгортваецца на двух кантынентах — у Амерыцы і Еўропе — вакол рэальнай карціны «Шчыгол» Карэла Фабрыцыуса.

У іншых намінацыях пулітцэраўскае журы адзначыла як заслужаных, так і маладых аўтараў. Лепшым у нон-фікшн прызналі даследаванне Дана Фагіна «Томс Рывер. Гісторыя навукі і рабства», якое, як адзначаецца ў паведамленні аргкамітэта прэміі, «спалучае следчы падыход з даследаваннем гісторыі ракавых захворванняў у дзяцей у прыморскім кластары Нью-Джэрсі».

З паэтаў «Пулітцэрам» сёлета ўзнагародзілі Віджая Сешадры — амерыканца індыйскага паходжання, прызнанага англамоўнага паэта, які раней працаваў у штаце часопіса «New Yorker».

Пулітцэраўская прэмія прысуджаецца ў ЗША з 1903 года. У розныя гады ёй ганараваліся такія пісьменнікі, як Эрнэст Хэмінгуэй, Сол Белоў, Маргарэт Мітчэл, Джон Стэйнбек, Уільям Фолкнер і іншыя. Перавагу журы Пулітцэраўскай прэміі аддае творам, прысвечаным праблемам амерыканскага жыцця.

Ордэн Ганаровага Легіёна

У Кіеве ўкраінскаму пісьменніку Андрэю Куркову была ўручана вышэйшая ўзнагарода Францыі — Ордэн Ганаровага Легіёна. Узнагароду ўручыў амбасадар Францыі ва Украіне.

Дырэктар Французскага інстытута ва Украіне Рыкто Саці, выступаючы на адкрыцці фестывалю «Кніжны Арсенал», адзначыў, што А. Куркоў з'яўляецца самым вядомым украінскім пісьменнікам у свеце. Хоць свае кнігі ён піша па-руску, не выклікае сумневаў, што пісьменнік — украінскі патрыёт, які выступае за абнаўленне краіны і захаванне яе цэласнасці.

У наш час А. Куркоў піша кнігу пра падзеі Еўрамайдана, у якой плануе сумленна, без купюр і адстойвання таго ці іншага пункта гледжання, распавесці ўкраінскім, расійскім і еўрапейскім чытачам пра падзеі найноўшай гісторыі Украіны.

Прэмія «Паэт»

Лаўрэатам расійскай нацыянальнай прэміі «Паэт» стаў Генадзь Русакоў.

Члены журы прэміі на працягу года па публікацыях адсочваюць творчае жыццё паэтаў і затым называюць імя лепшага. Пераможцу ўручаецца грашовы прыз у памеры 50 000 $.

Раней Г. Русакоў станавіўся лаўрэатам прэміі часопіса «Знамя» (1996), Малой прэміі Апалона Грыгор'ева (1999), прэміі «Венец» Саюза пісьменнікаў Масквы (2011).

Антыпрэмія «Абзац»

На выставе «Кнігі Расіі» ўручылі літаратурную антыпрэмію «Абзац». Ёй «узнагароджваюць» за самыя сумнiўныя дасягненні ў расійскім кнігавыдавецкім бізнэсе.

Антыпрэмію ў асноўнай намінацыі «Поўны абзац» атрымала «Аўтабіяграфія» Маргарэт Тэтчэр. Кнігу аб'ёмам каля 800 старонак, перакладзеную з ангельскай «канцылярскай» мовай, назвалі самай сур'ёзнай «ахвярай і карэктараў, і перакладчыкаў, і рэдактараў».

У намінацыі «Горшы пераклад» узнагароду ўручылі кнізе фэнтэзі для падлеткаў «Дом сакрэтаў» Крыса Каламбуса і Неда Візіні, перакладзенай Лідзіяй Садовай.

Адмысловая антыпрэмія «Ганаровая Не-грамата» дасталася Барысу Акуніну за кнігу «Гісторыя расійскай дзяржавы. Ад вытокаў да мангольскага нашэсця». Журы адзначыла, што ўзнагарода ўручана за «асабліва цынічныя злачынствы супраць расійскай славеснасці», а «канцэнтрацыя ляпаў, недакладнасцяў і здагадак у кнізе Б. Акуніна не ўкладваецца ў галаву».

Конкурс імя Сяргея Міхалкова

У Маскве прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў IV Міжнароднага конкурса імя Сяргея Міхалкова на лепшы мастацкі твор для падлеткаў.



Усяго на конкурс было даслана каля чатырохсот рукапісаў. Дасланыя творы не павінны былі раней нідзе выдавацца і не перадавацца ў выдавецтвы для публікацыі. У шорт-ліст конкурса ўвайшло 13 рукапісаў.

Пераможцам стала масквічка Ірына Дзегцярова. Яе кніга «Стэпавы вецер» распавядае пра перажыванні хлопчыка-падлетка і жыццё данскога казацтва. Лаўрэат другой прэміі — жыхарка Севастопаля Таццяна Карніенка з кнігай «Херсанесіты». Трэцяя прэмія ўручана Міхаілу Логінаву з Санкт-Пецярбурга за прыгодніцкую аповесць «Ключ ад горада Антонаўска».

«Дзеясловіца»

У Татарстане стартавала Рэспубліканская незалежная дзіцячая літаратурная прэмія «Дзеясловіца».

Яе заснавальнікам выступіў дабрачынны фонд «Шчаслівыя гісторыі». Дзіцячая літаратурная прэмія «Дзеясловіца» праводзіцца ў Татарстане ўпершыню, але, па словах аўтараў праекта, стане штогадовай. У літаратурным конкурсе могуць прыняць удзел аўтары ад 10 да 17 гадоў.

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў colta.ru, Washington Post, РИА Новости, vsiknygy.net, prostokniga.com.ua, lenta.ru, УНН.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by